КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 26 (1256) 25 чэрвеня 2016 г.

ГАЛОЎНАЕ ДЛЯ НАШАЙ ДЗЯРЖАВЫ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка выступае падчас V Усебеларускага народнага сходу. / Фота Максіма ГУЧАКА, БелТА

22 — 23 чэрвеня ў Мінску адбыўся V Усебеларускі народны сход. На парадку дня — ўсебаковае абмеркаванне праекта Асноўных палажэнняў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016 — 2020 гады, якое ахоплівала розныя сферы жыцця беларускага народа, у тым ліку датычныя культуры. (Цікава, што работнікі сацыяльна-культурнай сферы і СМІ склалі 21,6% дэлегатаў сходу.) Асобныя вытрымкі з праекту публікаваліся і на старонках "К". Цяпер жа прапануем матэрыялы сходу. Найперш — з выступлення Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі.

Беларускі Лідар назваў сход сур'ёзным этапам у жыцці нашага грамадства. Галоўная мэта форуму, паводле слоў беларускага Лідара, у абмеркаванні актуальных пытанняў і выхадзе на кансалідаванае меркаванне адносна вырашэння стратэгічных задач і планаў развіцця эканомікі на новы пяцігадовы перыяд. "Права чалавека і грамадзяніна на ўдзел у кіраванні справамі дзяржавы з'яўляецца неад'емным патрабаваннем нашага часу. Лічу, што наш дэвіз "Разам — за моцную і квітнеючую Беларусь" сімвалізуе пераемнасць і з'яднанасць грамадства на карысць нашай Радзімы. Мы цэнім грамадскую думку, пажаданні і прадуктыўныя ідэі, якія накіраваны на паступовае развіццё рэспублікі ў эканамічным, сацыяльным і культурным планах", — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

У першых палажэннях выступлення Прэзідэнт падкрэсліў: "Галоўнае для нашай дзяржавы — міралюбівая шматвектарная знешняя палітыка".— Сёння сусветная супольнасць разглядае Беларусь як донара рэгіянальнай бяспекі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка і дадаў: — Гісторыя нас навучыла, што любая міралюбная палітыка павінна быць падмацавана рэальнай здольнасцю дзяржавы абараніць свой народ.

Сярод асаблівасцяў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на пяцігодку Прэзідэнт вылучыў тры: "гэта праграма развіцця, а не застою; праграма будучыні, а не мінуўшчыны; праграма дзеянняў, а не чаканняў"; "гэта рэальная праграма, без лішніх абяцанняў і нязбытных планаў"; "гэта праграма эвалюцыі, а не рэвалюцыі".

— Мы не можам адмовіцца ад развіцця. Не можам пагадзіцца з тым, што нас чакае застой ці горш — адкат назад. Мы можам і павінны знайсці рэзервы росту! Мы можам і павінны мабілізавацца! — адзначыў Кіраўнік дзяржавы, заўважыўшы, што для аб'ектыўнага аналізу сітуацыі, якая склалася, нельга абмяжоўвацца толькі апошнім годам пяцігодкі: тым больш сёлета — 25-годдзе суверэннай Беларусі. Акрэсліваючы дасягненні краіны за адзначаны перыяд, Прэзідэнт сказаў: "Я хачу выказаць вялікую падзяку ўсяму беларускаму народу… Беларусы — людзі мудрыя, яны выдатна бачаць, што адбываецца ў свеце, разумеюць сапраўдныя цяжкасці і іх прычыны. І разумеюць, што ў цяперашніх умовах самыя галоўныя, самыя дарагія нашы каштоўнасці — мір у краіне, незалежнасць, бяспека кожнага".

Кажучы пра праблемы пяцігодкі 2011 — 2015 гадоў, Прэзідэнт адзначыў няпростыя рашэнні, якія давялося прыняць для далейшага развіцця краіны. На новым этапе Беларусі неабходна перайсці да "апераджальнай" стратэгіі. Прычым Аляксандр Лукашэнка дадаў: "Трэба ўдасканальваць тое, што ёсць". А гаворачы пра карэнныя рэформы, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: "Трэба адчуваць момант, трэба ведаць і разумець, калі можна рабіць тыя ці іншыя радыкальныя крокі". Пазіцыя Прэзідэнта па гэтым пытанні адназначная: ніякага радыкалізму.

— Наша задача на бліжэйшыя 5 гадоў — пераадолець адставанне і трывала заняць сваю нішу ў сусветнай эканоміцы. За гэты час мы павінны выйсці на якасна новы ўзровень тэхналогій у большасці галін і забяспечыць на гэтай аснове рост дабрабыту нашых грамадзян.

Працяг матэрыяла чытайце **на старонках 2 — 3.**

Соцыум

Не "танчаць" лялькі...

Пра поспехі айчынных тэатраў лялек не згадвае толькі лянівы. "Залатыя маскі", Нацыянальныя тэатральныя прэміі, бясконцыя апладысменты на беларускіх спектаклях у час замежных фестываляў і распісаныя на дзясяткі месяцаў наперад запрашэнні вядучых рэжысёраў на пастаноўкі. За плынню ўхвалы звычайна застаецца моцны кадравы голад, які не першы год адчуваюць у тэатрах лялек.

Настасся ПАНКРАТАВА

Універсальны артыст?

Як ні запытаюся пра маладых акцёраў, занятых у спектаклях айчынных тэатраў лялек, у лепшым выпадку ў адказ чую пра дыпламаванага артыста драмы і кіно, часцей — пра выпускніка каледжа мастацтваў, музычнага каледжа, а то і гадаванца аматарскага тэатра. Не перастаю здзіўляцца, але чаго іншага можна чакаць, калі артыстаў для сямі дзяржаўных тэатраў лялек і раней рыхтавала адна Акадэмія мастацтваў. Ды ўжо не першы год і тут не выпускаюць спецыялістаў з пазнакай у дыпломе "артыст тэатра лялек"…

А чым адрозніваецца "лялечнік" ад драматычнага акцёра? Зразумела, уменнем віртуозна абыходзіцца з рознымі сістэмамі лялек. У ідэале за час навучання будучы спецыяліст павінен вывучыць гапіт — нарыхтоўку будучай лялькі, здолець самастойна падвязаць ніткі на вагу — крыжападобную прыладу для кіравання марыянеткай, даследаваць магчымасці планшэтнай лялькі, зразумець фізічныя законы тэатра ценяў, прайсці праз выпрабаванне шырмай (ці доўга зможа непадрыхтаваны чалавек трымаць рукі, узнятыя ўгару, а таму, хто знаходзіцца па той бок выгарадкі, неабходна яшчэ і трысцявой лялькай кіраваць). Пазнаёміцца з тантамарэскай, пасябраваць з пальчаткавай лялькай... Урэшце, тут свае законы жанру: гэта сцэна часцяком патрабуе забыцца на запаветы Станіслаўскага і апасродкавана, праз ляльку перадаваць пачуцці. Адасобіўшыся ж ад яе, стаць на роўных удзельнікам дзеі — вось вышэйшы пілатаж!

Канешне, як і любой іншай справе, пры наяўнасці таленту можна да ўсяго дайсці самастойна. Я заспела ў час працы ў Беларускім дзяржаўным тэатры лялек старэйшага айчыннага артыста гэтага кірунку Уладзіслава Уласава. Ён сыграў больш за сто роляў, многія з якіх увайшлі ў скарбніцу, прынамсі, беларускага тэатральнага мастацтва. Некалі нават нямецкія складальнікі календара лепшых еўрапейскіх лялечных спектакляў змясцілі на вокладку партрэт нашага Уладзіміра Пятровіча. І мала хто мог здагадацца, што заслужаны артыст Беларусі не меў спецыяльнай адукацыі, а ў тэатр лялек патрапіў выпадкова. Але талент зрабіў яго класікам сцэны! Народжаны ў 1929 годзе, Уласаў пачынаў прафесійны шлях у той час, калі спецыяльную адукацыйную ўстанову трэба было яшчэ пашукаць. Чаму рэжысёру ў XXI стагоддзі, калі ёсць выпрацаваныя часам педагагічныя выкладкі, як засвоіць тэхналогію абранай прафесіі, даводзіцца вынаходзіць кола, каб падрыхтаваць для сябе апантаных, але бездыпломных лялькаводаў? Навошта ім замест заглыблення ў сутнасць вобразу марнаваць час на навучанне азам?

Кадравая латарэя

Найбольш красамоўна сітуацыя з кадрамі выглядае ў абласных калектывах. Прынамсі, галоўны рэжысёр Магілёўскага абласнога тэатра лялек Ігар Казакоў распавёў, што сёлета дасылаў у Акадэмію мастацтваў шэсць заявак на выпускнікоў Уладзіміра Мішчанчука (курс артыстаў драмы і кіно, але — хаця б дыпламаваныя акцёры). У Магілёў ніхто не прыехаў. "Зараз у штаце нашага тэатра адзінкі артыстаў з адпаведным дыпломам. Астатнія прыйшлі з каледжа мастацтваў, з музычнага каледжа, ёсць харэографы, шмат людзей, якія першапачаткова не мелі непасрэдных адносін да нашай прафесіі", — дадае спадар Ігар.

Заканчэнне — **на старонцы 4.**

Праекты развіцця

Перспектыва: музейная экспансія

Асноўны ўпор у сённяшняй публікацыі мы зробім на бераставіцкі Музей вавёркі. Ён толькі пачынае заваёўваць ды пашыраць прастору распаўсюджвання сваіх культурных паслуг, якая не будзе абмежавана музейнымі сценамі. Пакрысе набірае брэндавай вагі і вавёрка з герба Бераставіцы. І гэты аспект нам падаецца выключна важным у пошуку непаўторнага аблічча для мясцовай культуры. Прынамсі, далёка не кожны раён пахваліцца такімі творчымі высілкамі. Бераставіцкі — ужо можа. Але наперадзе — яшчэ безліч спраў.

Яўген РАГІН,
Кастусь АНТАНОВІЧ, Мінск — Ваўкавыскі — Бераставіцкі і Свіслацкі раёны Гродзеншчыны — Мінск / Фота аўтараў

Як пажываеш, вавёрка?

Вельмі папулярная мясцовая показка: "У свеце — тры сталіцы: Масква, Парыж, Бераставіца". Апошняя стараецца адпавядаць. Атрымліваецца не заўжды. Мяжа ды Белавежская пушча — пад бокам, самая рэальная перспектыва развіцця — турыстычная, а гасцініцы як не было цягам некалькіх гадоў, так і няма. А вось стварэнне Музея вавёркі — ход, па нашым меркаванні, вельмі трапны. Прынамсі, намеснік старшыні райвыканкама Сяргей Чыкун рушыў шляхам няходжаным і вырашыў: паколькі на гербе пасёлка прысутнічае вавёрка, дык і ў будучым музеі яна павінна стаць галоўнай гаспадыняй. Зазначым, што прычына з'яўлення гэтай жывёлы на гербе простая: вельмі ўжо шмат вавёрак вадзілася тут на момант надання мястэчку Магдэбургскага права. Словам, работы былі завершаны ў 2013 годзе — на пераўтварэнне пажарнага дэпо ў музей пайшло каля мільярда рублёў. Дырэктарам установы стаў Аляксандр Галавач, навуковымі супрацоўнікамі — Мікалай Пацэнка і Яўген Волкаў. Мужчынскі трыумвірат ведаў што рабіць. Праз год Музей вавёркі прыняў першых наведвальнікаў…

З дырэктарам установы сустрэліся у музейным дворыку, дзе таксама прысутнічае вавёрка — у скульптурнай выяве. Неўзабаве тут могуць размясціцца вальеры з жывымі звяркамі ды актывізавацца разнастайная інтэрактыўная дзейнасць. Словам, у кагосьці маецца музейная аптэка, а ў Бераставіцы — свой невялікі заапарк.

Спынімся на хвілінку і паразважаем. Стварэнне раённага нестандартнага музея — падзея. Пры гэтым трэба дакладна ўяўляць яе мэты і перспектыву. Мясцовыя музейшчыкі разважалі так: брэнд зробіць мястэчка турыстычным. Вось і доўгатэрміновы прагноз, пацверджаны некалькімі праектамі, якія знаходзяцца пакуль на стадыі ідэі.

Выява вавёркі прысутнічае ва ўсёй музейнай прасторы, пачынаючы з багатай сувенірнай прадукцыі, ледзяшоў на палачцы і заканчваючы маляванымі вавёркамі ў мужчынскім і жаночым строях на дзвярах прыбіральні. Гэта да таго, што ў прафесійнай музейнай дзейнасці дробязяў не бывае. Мы пазнаёміліся і з жывой вавёркай. Яна сустрэла нас гасцінна, нават паспрабавала падарыць нейкую кветачку. Пабачыўшы жывёлінку, мы троху збянтэжыліся ад яе выгляду.

Заканчэнне чытайце **на старонках 10 — 11.**

Галоўнае для нашай дзяржавы

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Асновай руху наперад на сучасным этапе павінны стаць новыя падыходы да мадэрнізацыі эканомікі і эфектыўнае дзяржаўнае кіраванне, — так акрэсліў перспектыву Прэзідэнт. "Рэзервы па павышэнні эфектыўнасці дзяржсектара велізарныя, — лічыць Лукашэнка, але сёння ключ да поспеху — уменне канцэнтраваць намаганні і сродкі, асабліва ў тым, што тычыцца навукова-тэхнічнага патэнцыялу краіны на прарыўных навуковых даследаваннях і распрацоўках, забяспечыўшы іх практычнае ўкараненне ў вытворчасць, а таксама ў дынамічным развіцці тых напрамкаў, дзе ў Беларусі добры навукова-тэхнічны зачын. У сваім выступленні Кіраўнік дзяржавы казаў: трэба выходзіць на новыя рынкі, прапаноўваць патэнцыйным замежным партнёрам нашы паслугі. "Прыток інвестыцыйных рэсурсаў высокіх тэхналогій дасць магчымасць узняць на новы ўзровень усе галіны нашай эканомікі. Другі ключавы прыярытэт — занятасць насельніцтва". Галоўнае — новыя працоўныя месцы, якіх за пяцігоддзе трэба стварыць больш за 250 тысяч. Для гэтага неабходна і разняволенне дзелавой ініцыятывы, што мае стаць рухаючай сілай для аднаўлення эканамічнага росту і стварэння новых працоўных месцаў.

Сярод прыярытэтаў краіны на пяцігоддзе Прэзідэнт таксама вылучыў экспарт, інфарматызацыю і працу з моладдзю: "Матываваная, адукаваная, актыўная моладзь — гэта, па сутнасці, стратэгічны рэсурс развіцця краіны, любой краіны". Рэалізацыя гэтага прыярытэту, зазначыў Лукашэнка, прадугледжвае адукацыю і прафесійнае станаўленне моладзі, фарміраванне канструктыўнай грамадзянскай пазіцыі, выхаванне патрыятызму, уцягванне ў канкрэтныя справы па ўмацаванні дзяржавы, абароне яе межаў, забеспячэнні спакою і парадку ў грамадстве. Амаладжэнне кадравага складу кіраўнікоў, стварэнне ўмоў для праяўлення здольнасцяў маладога пакалення з'яўляюцца найважнейшымі напрамкамі арганізацыйнай і ідэалагічнай работы Адміністрацыі Прэзідэнта і ўсёй вертыкалі ўлады. Неабходна працягваць работу па ўдасканаленні сістэмы падтрымкі адоранай, таленавітай і з лідарскімі якасцямі моладзі, раскрыцця яе творчага патэнцыялу. Больш увагі мяркуецца надаць фарміраванню павагі да сямейных каштоўнасцяў і падтрымкі маладых сем'яў: "Калі моладзь мае добрыя бытавыя ўмовы, яна імкнецца стварыць сваю сям'ю, мець дзяцей, значыць, узрастае гарантыя замацавання на месцах". На думку Аляксандра Лукашэнкі, найважнейшая мэта пятага пяцігоддзя — сфармаваць ініцыятыўнае, працавітае, пісьменнае і культурнае пакаленне, адказнае за свой лёс і лёс сваёй Радзімы.

Гаворачы аб развіцці рэгіёнаў Беларусі, Прэзідэнт заўважыў: "Сяло, малыя і сярэднія гарады — аснова краіны. Мы заўсёды прытрымліваліся прынцыпу: у любым месцы Беларусі кожнаму чалавеку павінна быць аднолькава камфортна". Галоўны кірунак — прыцягненне інвестыцый у рэгіёны.

— Трэба навучыць наш народ рухацца туды, дзе ёсць працоўнае месца, — сказаў Аляксандр Лукашэнка, а таксама ў рамках гэтай тэмы зазначыў: — Не толькі сталіца, але ўсе рэгіёны павінны пастаянна падтрымліваць добры імідж Беларусі — краіны чыстай, прыгожай, зручнай для жыцця людзей і прывабнай для нашых гасцей.

Беларусь і надалей будзе прытрымлівацца сацыяльнай арыентацыі дзяржавы. Пра гэта сведчаць як выдаткі гадавых бюджэтаў краіны, так і перавага ў дзяржаўных праграмах артыкулаў сацыяльнай скіраванасці. У 2016 — 2020 гадах плануецца рэалізоўваць больш за 20 дзяржаўных праграм, пры гэтым каля дзвюх трэціх бюджэтных сродкаў, вылучаных на іх фінансаванне, будуць інвеставаны ў сацыяльную сферу. У першую чаргу ў медыцыну, адукацыю, культуру, падтрымку сем'яў, сацыяльную абарону насельніцтва.

— Культура і мастацтва. Год культуры. У нас намечаны шэраг мерапрыемстваў у гэтым кірунку, мы іх рэалізоўваем. Для культуры зроблена нямала: і па рэканструкцыі, па рэфармаванні. Але для таго каб наш народ быў культурным, ёсць усё, каб ён лічыўся культурным. Трэба культурным работнікам трошкі варушыцца, быць больш ініцыятыўнымі, раскаванымі і не глядзець увесь час у рот дзяржаве. Акцэнт трэба зрабіць як на маштабы і якасны бок нашай культурнай сферы, так і на павышэнне яе турыстычнай прывабнасці. Творы літаратуры, музычнага, выяўленчага, тэатральнага і кінамастацтва закліканы садзейнічаць фарміраванню каштоўнасцяў беларускага грамадства, адлюстроўваць духоўны вопыт нацыі. Наша мэта — не самаізаляцыя, не процістаянне іншых культур, а ўзаемадзеянне і ўзаемазапазычанні. Падкрэсліваю: адметнымі рысамі культуры беларускага народа з'яўляюцца ўзаемная павага, непрыманне любых формаў міжнацыянальнай варожасці. Гэтыя прынцыпы мы падтрымлівалі і будзем падтрымліваць надалей! Беларусь сёння — цытадэль традыцыйнай культуры і маралі. Так будзе заўсёды, — падкрэсліў Прэзідэнт.

Напрыканцы выступлення Лукашэнка сказаў: "Ва ўнутранай палітыцы найважнейшай умовай для ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі з'яўляецца палітычная стабільнасць, спакой у грамадстве, забеспячэнне непарушнасці межаў і бяспекі людзей". Для гэтага, паводле яго слоў, у першую чаргу патрэбныя адзінства і згода ў грамадстве, мір і парадак у краіне. Галоўнае цяпер — выкарыстоўваць любы шанц і магчымасць пераадолець усе цяжкасці на шляху прагрэсу і стварэння, не паддавацца дэпрэсіі ды застою, захоўваючы ўсё лепшае з мінулага, упэўнена рухацца да мэты. Толькі той, хто ідзе, адолее дарогу!"

Фота Максіма ГУЧАКА. БелТА

З трыбуны — пра культуру

Прэзідэнт звярнуўся да ўдзельнікаў сходу з прапановай актыўнага абмеркавання нашых планаў: "Аналізуйце іх, прапануйце, як больш эфектыўна разам нам працаваць, каб жыць лепш і лепш". Публікуем агляд выступленняў, што тычыліся сферы культуры.

Дырэктар Палаца культуры горада Маладзечна Святлана Сарока з трыбуны V Усебеларускага народнага сходу адзначыла: у краіне — багаты кадравы патэнцыял у сферы культуры. Неабходна стварыць годныя ўмовы для працы маладых кадраў, каб яны не імкнуліся шукаць лепшай долі, з'язджаючы працаваць за мяжу, лічыць яна. Для павышэння прафесіяналізму беларускім спецыялістам важныя замежныя стажыроўкі, удзел у міжнародных конкурсах, але працаваць, прымяняць свае веды і ўменні важна ў сябе на радзіме. Святлана Сарока падкрэсліла таксама важнасць захавання культурна-гістарычнай спадчыны краіны.

Дырэктар, галоўны рэдактар выдавецкага дома "Звязда" Аляксандр Карлюкевіч адзначыў падтрымку дзяржавай беларускамоўнага друку, застаецца толькі расці ў творчым плане. Пераклады твораў беларускіх аўтараў, якія публікуюцца за межамі краіны, знаходзяць свайго чытача, а значыць, аб нацыянальнай літаратуры даведваюцца на вялікай прасторы. Акрамя таго, Аляксандр Карлюкевіч лічыць важным прасоўваць стараннямі літаратараў, інтэлігенцыі беларускую мову: "Можна ведаць англійскую і іншыя мовы, але пры гэтым нельга забыць родную — беларускую".

У пытаннях гуманітарнага развіцця важнае выхаванне самадастатковага, дасведчанага патрыятычнага пакалення, а літаратурныя творы павінны служыць дабру і міру, адзначыў выступоўца. Гаворачы аб падтрымцы нацыянальнага кнігавыдання, друку, Аляксандр Карлюкевіч зазначыў, што яна павінна чаць", — упэўнены Барыс Святлоў. Міністр звярнуў увагу на тое, што ў бліжэйшыя гады сфера культуры пастараецца павялічыць долю самастойна зароблених грашовых сродкаў.

Каментарый з нагоды

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс Святлоў пракаменціраваў карэспандэнту БелТА асноўныя пасылы праекта праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016 — 2020 гады. "Культура — гэта тое, як мы жывём і дыхаем, пра яе не трэба шмат гаварыць. Неабходна проста правільна расстаўляць акцэнты ў кожным часавым адрэзку, што і робіцца на Усебеларускім сходзе. Прэзідэнт адзначыў, што ў нас у краіне створана добрая матэрыяльная база ў сферы культуры, і гэта сапраўды так. Паглядзіце, колькі было ўкладзена грошай за мінулую пяцігодку ў ходзе рэалізацыі праграмы "Культура Беларусі", — адзначыў Святлоў. Што тычыцца музеяў, тэатраў, рэстаўрацыі і рэканструкцыі гістарычных помнікаў, створана добрая матэрыяльна-тэхнічная база, падкрэсліў ён. "Цяпер для нас галоўнае — перанесці акцэнт з матэрыяльна-тэхнічнай базы на канкрэтнага чалавека, на раскрыццё творчых сіл кожнага з членаў нашага грамадства. Гэта якраз той вялікі рэсурс, патэнцыял, які да канца не рэалізаваны. Яго трэба правільна задзейні-

На здымку: Барыс Святлоў з дэлегатамі з Віцебшчыны Аленай Падаляк і Ларысай Аленскай. Фота Аляксандра ХІТРОВА, БелТА

Канцэрт дэлегатам

Фотакарэспандэнт "К" зняў моманты адной з фінальных рэпетыцый гала-канцэрта для дэлегатаў V Усебеларускага народнага схода.

На сцэне Аляксандр Саладуха і Валерый Дайнэка.

Фотасюжэт нумара

Алена Ланская з самымі юнымі артыстамі.

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ. **Адказны сакратар:** Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Аліна САЎЧАНКА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Алена ЛЯШКЕВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ; **карэспандэнт** — Вольга РОПАТ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД.

Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41. Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА". 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2016. Наклад 4 277. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 24.06.2016 у 20.30. Замова 2401. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

насіць адрасны характар. Галоўны ж адрасат — моладзь: калі не падтрымліваць дзіцячы і маладзёжны друк, патэнцыйную аўдыторыю прыцягнуць забаўляльныя выданні.

А намеснік старшыні галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы Базыль Сегень адзначыў, што неабходна праводзіць работу па развіцці зацікаўленасці і стварэнні ўмоў для вывучэння беларускай мовы беларусамі замежжа. Ён падкрэсліў, што беларусы Польшчы маюць цесныя кантакты з установамі культуры Беларусі, якія прымаюць прапановы аб удзеле ў мерапрыемствах. Яны атрымліваюць касцюмы, музычныя інструменты, інфармацыйную і метадычную падтрымку.

Вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, народны артыст Беларусі Віктар Манаеў адзначыў на сходзе: на працягу апошніх гадоў назіраецца зніжэнне колькасці наведвальнікаў у дзяржаўных тэатрах, якія вымушаныя канкураваць з замежнымі антрэпрызамі невысокага мастацкага ўзроўню. "Нават, як я ведаю, нашы вядомыя музычныя і харэаграфічныя калектывы, прызнаныя культурнымі сімваламі Беларусі, сутыкаюцца з цяжкасцямі ў арганізацыі канцэртаў у рэгіёнах, дзе мясцовыя кіраўнікі сцэнічных пляцовак аддаюць перавагу расійскім зоркам", — сказаў народны артыст краіны.

Паводле яго слоў, беларускія выканаўцы часам адчуваюць сябе ўшчэмленымі на фестывалях, якія арганізуюцца пры дзяржаўнай або спонсарскай падтрымцы беларускіх прадпрыемстваў. "Лічу, што прапаганда і папулярызацыя свайго нацыянальнага мастацтва павінны стаць прыярытэтам у дзейнасці дзяржаўных арганізацый культуры. Нашай грамадскасці трэба выхоўваць у дзяцей і моладзі мастацкі густ, прывіваць любоў да роднай мовы, культуры, каб з іх атрымаліся сапраўдныя грамадзяне незалежнай Беларусі", — перакананы Манаеў.

Ён таксама звярнуў увагу на тое, што ў тым ліку дзякуючы спектаклям Купалаўскага тэатра жыхары многіх еўрапейскіх краін адкрылі для сябе новую краіну — незалежную Беларусь. "Але ў выкананні гэтай важнай місіі тэатру, як і ўсяму прафесійнаму мастацтву, неабходна стварыць умовы, каб нашы артысты мелі магчымасць зарабляць сваёй творчасцю", — сказаў артыст.

Прадмет абмеркавання

У заключным слове на V Усебеларускім народным сходзе Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка адзначыў: праблематыка і дух Усебеларускага народнага сходу павінны стаць прадметам абмеркавання ва ўсіх рэгіёнах і калектывах, каб уся краіна мабілізавала матэрыяльныя і інтэлектуальныя сілы на рашэнне пастаўленых задач. Паводле слоў беларускага Лідара, праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016 — 2020 гады стане асновай для прыняцця рашэнняў у далейшым.

"Паколькі жыццё вельмі разнастайнае, узнікне яшчэ маса іншых пытанняў. Нам давядзецца прымаць мноства рашэнняў па-за межамі гэтай праграмы, вядома, грунтуючыся на яе палажэннях", — падкрэсліў Прэзідэнт і запатрабаваў мець гэта на ўвазе і шырэй глядзець на пастаўленыя задачы. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што Усебеларускі сход адбыўся ў адказны перыяд — напярэдадні парламенцкіх выбараў.

Прэзідэнт адзначыў, што форум з усёй відавочнасцю паказаў, што народаўладдзе з'яўляецца найважнейшым інструментам прыняцця лёсавызначальных рашэнняў у Беларусі. Аляксандр Лукашэнка падзякаваў усім адказным за арганізацыю і правядзенне Усебеларускага сходу, а таксама дэлегатам — за падтрымку, разуменне, актыўны ўдзел у распрацоўцы і прыняцці праграмных дакументаў.

З "Вітаўтам" і "Песняром"

Дні культуры Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі прайшлі з 19 па 22 чэрвеня. На гістарычнай сцэне Вялікага тэатра Расіі паказалі спектакль Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета "Вітаўт", які атрымаў прэмію Прэзідэнта Беларусі "За духоўнае адраджэнне". Харэаграфічная легенда на гістарычную тэматыку была цёпла сустрэта і атрымала станоўчы розгалас у маскоўскіх СМІ.

Намеснік міністра культуры Беларусі Васіль Чэрнік і намеснік міністра культуры Расіі Аляксандр Жураўскі падчас адкрыцця Дзён культуры нашай краіны.

У рамках Дзён культуры адбыўся прэс-брыфінг расійскіх мас-медыя з прадстаўнікамі беларускай дэлегацыі. На ім першы намеснік генеральнага дырэктара нашага тэатра Уладзімір Рылатка падкрэсліў, што для айчынных артыстаў выступленне на гэтай легендарнай сцэне — адказны экзамен. Афіцыйныя ж мерапрыемствы распачаліся адкрыццём фотавыставы БелТА "Саюзная дзяржава — адзінства народаў, культур, краін". У фае Вялікага тэатра публіка пабачыла 30 работ, па якіх можна было ўявіць карціну развіцця стасункаў паміж дзвюма краінамі. Калі публіка перайшла ў глядзельную залу, на сцэну ўзняўся намеснік Міністра культуры Беларусі Васіль Чэрнік. У прывітальным слове ён падкрэсліў, што дадзеная падзея адбываецца ў рамках абвешчанага ў Беларусі Года культуры. Кіраўнік афіцыйнай дэлегацыі нашай рэспублікі нагадаў пра шчыльнае супрацоўніцтва ў сферы культуры паміж краінамі-суседкамі і зазначыў, што ў Сінявокай праводзіцца безліч прафесійных сустрэч і майстар-класаў, конкурсаў і фестываляў, у якіх прымаюць удзел расійскія творцы.

На ніве беларуска-расійскага супрацоўніцтва ўзнікла нямала паспяховых праектаў, прынамсі, са сталымі аншлагамі праходзяць міжнародныя фестывалі Юрыя Башмета і "Уладзімір Співакоў запрашае". Зараз Міністэрствы культуры абедзвюх краін вядуць работу над праектам праграмы Саюзнай дзяржавы "Аб увекавечванні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяраў войнаў". Згодна з гэтым дакументам будуць выдаткаваны грошы на капітальны рамонт аб'ектаў Брэсцкай крэпасці "Пяты Форт" і "Паўднёвыя казармы" (сёння ўжо адрамантаваны паўднёва-ўсходняя казарма і адкрыта новая экспазіцыя "Музей вайны — тэрыторыя міру"), а таксама запланавана завяршэнне работы ў мемарыяльным комплексе, прысвечаным Першай Сусветнай вайне, які месціцца ў Смаргоні Гродзенскай вобласці.

Да Дзён культуры была прымеркавана яшчэ адна падзея: 15 чэрвеня у рамках "Беларускіх сезонаў у Маскве" ў Дзелавым і культурным комплексе Пасольства Беларусі ў Расіі Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Максіма Горкага паказаў спектакль "Пясняр". Пастаноўка, прысвечаная народнаму артысту СССР Уладзіміру Мулявіну, прайшла пры аншлагу.

Як паведаміла начальнік аддзела міжнародных сувязяў Міністэрства культуры Беларусі Вікторыя Ратабыльская, зараз ідуць перамовы пра правядзенне ў адказ Дзён культуры Расіі ў Беларусі ў 2017 годзе.

Калектыў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні начальніку аддзела кантролю і справаводства Скарыну Алегу Аляксандравічу ў сувязі з горам, што яго напаткала, — смерцю бацькі.

Галасы, гай і зноў пра гадзіннікі

З 17 па 19 чэрвеня ў горадзе Дуброўна Віцебскай вобласці прайшоў XXIII Міжнародны фестываль песні і музыкі "Дняпроўскія галасы ў Дуброўне".

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ, Мінск — Дуброўна — Мінск / Фота аўтара

Падчас адкрыцця фестывалю ў Дуброўне.

Сёлетні прадстаўнічы форум сабраў 26 творчых калектываў з Беларусі, Расіі, Украіны, Латвіі, Літвы, Румыніі, Малдовы і Польшчы. І, як адзначыў падчас сустрэчы кіраўнікоў мастацкіх ансамбляў і гасцей "Дняпроўскіх галасоў…" з аргкамітэтам фестывалю намеснік міністра культуры Васіль Чэрнік, свята песні і музыкі ў Дуброўне на сёння сталася папраўдзе адным з самых значных у фестывальнай "палітры" вобласці.

— На Віцебшчыне шмат цікавых і маштабных фестываляў, скажам, "Браслаўскія зарніцы", "Звіняць цымбалы і гармонік" у Паставах, "Дняпроўскія галасы ў Дуброўне", — сказаў Васіль Чэрнік. — Міністэрства культуры Беларусі бачыць, наколькі яны папулярныя, наколькі яны запатрабаваныя, і ўсяляк спрыяе іхняму развіццю. Напрыклад, сёлета мы ўпершыню падтрымалі "Дняпроўскія галасы ў Дуброўне" як арганізацыйна, так і фінансава. Мяркую, будзем працягваць гэта рабіць і надалей.

Паглядзець на фэсце было на што. І не толькі паглядзець, а і паўдзельнічаць у шматлікіх імпрэзах, конкурсных праграмах і танцавальных дзеях. Напрыклад, 17 чэрвеня госці сталі ўдзельнікамі адроджанага старадаўняга абраду "Ваджэнне куста", а 18 чэрвеня кожны з іх мог пабачыць "салаўіны гай" у фае раённага Дома культуры, прайсціся па падворках раёнаў Віцебшчыны і Гомельшчыны, паглядзець на вырабы народных майстроў ды пазнаёміцца з творчасцю тэатраў мод і іх калекцыямі касцюмаў у стылі фолк.

Таксама творчыя дэлегацыі з розных краін свету цягам суботы ўпершыню паўдзельнічалі ў стварэнні двухметровага "Пояса сяброўства" ды завіталі ў своеасаблівы рэстаран пад адкрытым небам "Дуброўеншчына гасцінная". Тут, на тэматычных падворках, членаў дэлегацый, а таксама ўсіх ахвотных здзіўлялі і частавалі фірменнымі стравамі і напоямі прадстаўнікі многіх раёнаў Віцебшчыны.

Асноўныя фестывальныя дзеі ў суботу адбываліся на цэнтральнай плошчы горада, дзе таксама разгарнуліся падворкі дамоў рамёстваў, праводзіліся майстар-класы па кераміцы, саломка- і лозапляценні ды многія іншыя. А апоўдні тут, каля фантана, стартаваў абласны конкурс майстроў свістулькі "Салавейка—2016". Пасля яго заканчэння гліняныя "птушыныя" цацкі пасяліліся ў парцалянавым дрэве на 25 шпакоўняў. А гран-пры сёлетняга абласнога конкурсу заваяваў сябра Беларускага саюза майстроў народнай творчасці Вячаслаў Якавенка з Крычава Магілёўскай вобласці.

Міністр культуры Барыс Святлоў падчас адкрыцця сельскага дома культуры ў пасёлку Асінторф.

Таксама субота была напоўнена канцэртамі-прэзентацыямі гасцей і мясцовых самадзейных калектываў, выступленнямі ўдзельнікаў абласнога конкурсу эстраднай музыкі "BIA-ton 2016", а яшчэ ў гэты дзень адбылося факельнае шэсце, акцыя "Свечка памяці" ды флэшмоб "За мірнае неба". Акрамя таго, з удзелам міністра культуры Беларусі Барыса Святлова, прадстаўнікоў раённых ды абласных улад, у мемарыяльным комплексе "Рыленкі" непадалёк ад Дуброўна прайшлі мітынг-рэквіем, а таксама — урачыстае адкрыццё новага сельскага Дома культуры ў пасёлку Асінторф.

На наступны дзень удзельнікі фестывалю прайшлі з песнямі па цэнтральнай вуліцы горада, выступілі з гала-канцэртам на гарадскім стадыёне ды паўдзельнічалі ў народным абрадзе "Пасахі — на Лёгкія шляхі". Прычым нават гэтае свята не паставіла кропку ў развітанні з фестывалем: на галоўную сцэну яшчэ выйшлі артысты беларускай эстрады, а маляўнічы феерверк на беразе Дняпра даў сігнал для старту начной дыскатэкі ў раённым Доме культуры.

— Мяркую, наступны фестываль "Дняпроўскія галасы ў Дуброўне", стане яшчэ больш маштабным, больш маляўнічым і разнастайным, — адзначыў "К" старшыня раённага выканаўчага камітэта Анатоль Лукашоў. — Справа ў тым, што ў 2017-м наш горад будзе прымаць абласное свята працаўнікоў сяла "Дажынкі". Натуральна, пад гэтае знакавае мерапрыемства мы заплануем рамонты ва ўстановах культуры горада, правядзём добраўпарадкаванне тэрыторыі, палепшым сваю інфраструктуру. Цалкам магчыма, што гэта свята зможа яшчэ раз прыцягнуць увагу абласных улад да гаротнага стану колішняга кляштара бернардынцаў, што знаходзіцца на ўездзе ў Дуброўна, і мы атрымаем фінансы пад пачатак рэстаўрацыйных работ на гэтым аб'екце гісторыка-культурнай спадчыны. Прынамсі, я на гэта вельмі спадзяюся.

І апошняе. Пабываўшы ўпершыню ў Дуброўне яшчэ ў 2012 годзе, я пісаў пра тое, што гэтаму гораду катастрафічна не стае музея. І нават прапаноўваў падумаць пра стварэнне краязнаўчай музейнай установы, дзе былі б прадстаўлены самыя розныя гадзіннікі. Мой матэрыял так і называўся "Ці займее Дуброўна гадзіннікавы брэнд?" ("К" № 47 за 2012-ы год). Справа ў тым, што ў Дуброўне яшчэ напрыканцы XVIII стагоддзя была створана гадзіннікавая фабрыка — адна з лепшых у Еўропе, прычым прадукцыя тагачаснага прадпрыемства прызначалася для царскага двара, і толькі невялікая партыя гадзіннікаў трапляла ў продаж… Дык вось, хоць на Дуброўеншчыне ўжо колькі гадоў ідуць размовы пра стварэнне свайго музея, воз і сёння там: ні адзін з прадстаўнікоў раённых ды абласных улад, з якімі мне давялося гутарыць на гэту тэму, так і не сказаў, калі ж у горадзе з'явіцца доўгачаканая ўстанова культуры… Так што гадзіннікавага брэнду ў Дуброўне ўсё яшчэ чакаюць. Але ж ці дачакаюцца, ці займеюць нарэшце?

К

"Лічбавы" падыход

Як "манетызаваць" дэнамінацыю?

Лічаныя дні засталіся да таго моманту, як у нашых кішэнях "завядуцца" новыя грошы і нават манеты — 1 ліпеня ў краіне адбудзецца дэнамінацыя. Самае цікавае, што будучыя змены на фінансавым рынку Беларусі дазваляюць многім установам культуры — у першую чаргу, вядома, музейным — прыцягнуць увагу да сябе і сваіх праектаў. І, натуральна, зарабіць на гэтым сюю-тую "капейчыну". Прычым, не ўяўную, а цалкам рэальную.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Першым на шлях абыгрывання "ў сваіх мэтах" дэнамінацыі ступілі ў Полацку, распачаўшы 21 мая, у рамках міжнароднай акцыі "Ноч музеяў", мерапрыемства "Ноч рубля напярэдадні дэнамінацыі". У афішы музейнай ночы былі прадстаўлены квэсты, выставы, канцэрты, кінапаказы, гульні, экскурсіі, якія аб'ядноўвала грашовая тэматыка. Так, у Дзіцячым музеі тады адбыліся ўрокі займальнай арыфметыкі для дзяцей і дарослых, у Экалагічным музеі дэманстраваліся мультфільмы пра гісторыю грошай, у краязнаўчым прайшоў квэст "Money-манія". А ў дворыку Доміка Пятра І усе ахвотныя змаглі паўдзельнічаць у манетным атракцыёне "Грошы на бочку". Акрамя таго, у гэты дзень у полацкіх музеях можна было таксама ўбачыць памятныя манеты Нацбанка Беларусі, экспазіцыі "Беларусь на грашовых купюрах" ды "Флора і фаўна на банкнотах і манетах краін свету".

А ўжо ў гэтую нядзелю, 26 чэрвеня, у сценах Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі стартуе акцыя "Тысяча, бывай!", прысвечаная сімвалічнаму расстанню з купюрай старога ўзору наміналам у адну тысячу рублёў. Калі хто не памятае, дык менавіта на гэтай банкноце 17 гадоў таму быў адлюстраваны музейны фасад і фрагмент адной з карцін Івана Хруцкага, якая знаходзіцца ў экспазіцыі ўстановы. Цягам усяго дня кошт уваходнага білета ў музей складзе тую самую тысячу рублёў, а кульмінацыяй стане ўрачыстае падпісанне тысячнай купюры, што трапіць у музейны фонд, генеральным дырэктарам установы Уладзімірам Пракапцовым. Акрамя таго, кожны ахвотны зможа ў гэты дзень прыняць удзел у шэрагу цікавых музейных акцый.

У сваю чаргу, 29 чэрвеня ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь пачне працаваць выставачны праект "Ад рымскага дынарыя да беларускага рубля". Назва выставы абрана не выпадкова: экспазіцыя павінна пазнаёміць наведвальнікаў музея з гісторыяй грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі ад першага масавага з'яўлення рымскіх манет і да сучаснасці. Асаблівая ўвага будзе нададзена грашовым рэформам, якія адбываліся на беларускіх землях у розныя часы. Асобны раздзел выставачнага праекта распавядае пра манетныя скарбы, знойдзеныя на тэрыторыі нашай краіны. А дзве мастацкія інсталяцыі ўвасобяць розныя сітуацыі, звязаныя з грашыма. Так, інсталяцыя "Знаходка скарбу" распавядае пра момант раскрыцця каштоўнага захавання, а "Кабінет нумізмата" рэканструюе працоўнае месца калекцыянера XIX стагоддзя. Інтэрактыўны элемент дадзенага праекта — дэтэктар банкнот, на якім кожны ахвотны можа праверыць наяўныя папяровыя грашовыя знакі.

Што і казаць, усе названыя праекты — досыць цікавыя, асабліва полацкі, які і запачаткаваў, так бы мовіць, "дэнамінацыйную" тэндэнцыю. Прычым палачане тады, у "Ноч музеяў", папраўдзе кажучы, сапраўды "выбіваліся" са сваім праектам на фоне іншых як рэгіянальных, так і сталічных устаноў. У інтэрнэце і СМІ пра крэатыў полацкіх музейшчыкаў пісалі шмат, дэманструючы вялікую колькасць фота з імпрэз і акцый.

Я гэта да таго, што музеям зусім не абавязкова чакаць нейкай агульнарэспубліканскай ці нават міжнароднай акцыі, каб заявіць пра сябе. Напрыклад, той жа "Ночы музеяў". Зарабляць грошы і піярыць сябе можна з любой нагоды. І такія з'явы як дэнамінацыя можна, як бачна, выкарыстоўваць з карысцю для сябе.

Між тым, у паездках па рэгіёнах Беларусі мне неаднаразова даводзілася чуць такое: "Эх, каб вы прыехалі да нас летась, калі мы ладзілі Ноч музеяў (Ноч бібліятэк)! Во дзе было цікава!" І ў якасці доказу мне звычайна дэманстравалі фотаздымкі, буклеты з мінулай акцыі, згадваючы падрабязнасці. Калі ж я пытаў, ці была сёлета падобная "Ноч…", дык у адказ часцяком мае суразмоўцы толькі паціскалі плячыма: маўляў, кожны год яе ладзіць цяжка, трэба ж і сцэнарый прадумаць, і новыя конкурсы распрацаваць, ды і грошай на прызы ў нас не так багата…

Але справа тут, канешне, не ў прызах ці акцыях. Справа ў піяры, у тым, каб прыцягнуць увагу да ўстановы культуры, прывабіць сваёй крэатыўнасцю ўсё новых і новых наведвальнікаў… Ночы музеяў ці бібліятэк — добрая для гэтага нагода, але хто сказаў, што абавязкова трэба чакаць наступных міжнародных акцый? Іх можна стварыць і самастойна, прычым літаральна "на пустым месцы". Было б толькі жаданне, зладжаная каманда і крэатыўны лідар… А вось гэтых складнікаў многім айчынным установам культуры — не толькі музейным, а і ўсім іншым — на жаль, хранічна не стае…

Не "танчаць" самі па сабе



Чаму вагу перадаць няма каму?

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Рэжысёр разумее, што многія з прыхільнікаў мастацтва хочуць бачыць у галоўных ролях магілёўскіх пастановак кагосьці ўзроўню Алега Яфрэмава ці Яўгена Яўсцігнеева, але трэба зыходзіць з рэалій часу. Так, Казакоў нагадвае, што ў суседняй Расіі да мэтраў (напрыклад, у тэатральную школу Канстанціна Райкіна) часам спрабуецца некалькі соцень чалавек, а гэта вельмі моцнае сіта, калі можна выбраць самых-самых здольных і нават фізічна падрыхтаваных да прафесіі. У Беларусі пра тое можна толькі марыць…

Нельга скідваць з рахунку нежаданне ўчарашніх студэнтаў, што паспыталі сталічныя магчымасці, ехаць па размеркаванні ў правінцыю. Суразмоўца ўпэўнены, што вобраз Мінска як месца для хуткага стварэння вялікай кар'еры празмерна міфалагізаваны. "У сталіцы маладым артыстам у першыя гады шлях да вялікіх роляў заказаны — сваіх "зорак" хапае. Шмат цікавых рэчаў сёння адбываецца якраз у рэгіёне, дзе выпускнікам атрымаць добрыя ролі нашмат лягчэй. Акцёр — гэта тэатральная практыка. Той, хто акумулюе школу, не выходзячы на сцэну, загіне. Патрэбна разумець, як шыкоўна, калі пачатковец у прафесіі можа спрычыніцца да такога матэрыялу, як Шэкспір, Горкі. Між іншым, у маім спектаклі "На дне" працуе амаль выключна моладзь", — зазначае Казакоў.

Пытаюся ў Ігара, ці можа стаць выйсцем падрыхтоўка спецыялістаў пад патрэбы тэатра непасрэдна ў рэгіёне. Але і тут не менш складанасцяў. Галоўны рэжысёр магілёўскай трупы пэўны час таму прапаноўваў абласному каледжу мастацтваў набраць курс лялечнікаў, але Казакову адмовілі праз адсутнасць у апошняга педагагічнай адукацыі. "І тое, што я — рэжысёр-практык, што дастатковую колькасць гадоў даказваю сваю здольнасць займацца прафесіяй, не мае значэння. Бюракратычная "птушачка" стаіць шлагбаумам на тэатральным руху… У гэты час у суседніх краінах толькі насустрач пойдуць таму рэжысёру, хто захоча набраць курс", — параўноўвае візаві.

Усе тэатры няшчасныя аднолькава

У азначаных вышэй праблемах мы не адзінокія. У суседзяў таксама шмат выпадкаў, калі ў тэатр лялек прыходзяць людзі з "драматычнай" адукацыяй. Нават у такой "тэатральнай" краіне, як Літва, таксама жудасны дэфіцыт прафесійных артыстаў-лялечнікаў. Дырэктар Каўнаскага дзяржаўнага тэатра лялек Сігітас Клібавічус падчас нядаўняга IX Міжнароднага фестывалю тэатраў лялек распавядаў, што ў яго краіне сапраўдны голад на творцаў гэтага жанру. Па яго словах, востра не стае рэжысёраў, сцэнографаў, таму тэатры лялек ідуць на эксперымент і запрашаюць калег з драмы. Але не ва ўсіх атрымліваецца адчуць спецыфіку жанру. "Да ўдалага супрацоўніцтва з Арвідасам Лебялюнасам у нас спрабавалі свае сілы іншыя драматычныя рэжысёры, але тыя адразу ўбачылі, што гэта зусім не іх справа", — распавядае спадар Сігітас.

Ва Украіне каля 30 прафесійных дзяржаўных тэатраў лялек, шмат муніцыпальных, а таксама прыватных калектываў. На ўсю гэту супольнасць раней працавала дзве школы лялечнікаў: Днепрапятроўскі дзяржаўны тэатральна-мастацкі каледж і Харкаўскі нацыянальны ўніверсітэт мастацтваў імя Івана Катлярэўскага. А літаральна колькі гадоў таму Кіеўскі нацыянальны ўніверсітэт тэатра, кіно і тэлебачання імя Івана Карпенкі-Карага таксама адкрыў кафедру акцёрскага майстэрства і рэжысуры тэатра лялек. Абедзве ВНУ дадаткова прапануюць завочную форму навучання для акцёраў-практыкаў, якія не маюць адпаведнага дыплома. Але нават пры такой раскошы ўкраінскія рэгіянальныя тэатры таксама зведваюць кадравы дэфіцыт. Галоўны рэжысёр Палтаўскага акадэмічнага абласнога тэатра лялек Сяргей Цыба гаворыць: "Праблема ў тым, што прыезджых тэатр не можа забяспечыць кватэрай, як тое было за савецкім часам. Заробкі ў нас — як паўсюль на постсавецкай прасторы ў сферы культуры. Акцёру, які атрымлівае 150 долараў, за кватэру штомесячна давядзецца аддаваць прыкладна сто з іх. Нават у фанатаў справы энтузіязм хутка заканчваецца. Таму патрэбныя рэгіёнам выпускнікі застаюцца ў сталіцы (малы працэнт едзе скага. "З-за гэтых аб'ектыўных прычын сапраўды адбыўся перапынак у наборы акцёраў-лялечнікаў (але галоўны рэжысёр Мінскага абласнога тэатра лялек "Батлейка" Мікалай Андрэеў выпускаў завочнікаў па спецыяльнасці "Рэжысура тэатра лялек" і сёлета ён набірае чарговы курс). Зараз мы абжываемся пасля капітальнага рамонту. Яшчэ не да канца падрыхтаваныя танцавальны клас і спартыўная зала, не гатовы пакуль вучэбны тэатр. Калі ўсё стане на свае месцы і мы ўладкуемся ў адрамантаваным корпусе, будзем больш канкрэтна думаць пра набор на дадзеную спецыялізацыю", — запэўнівае дэкан тэатральнага факультэта БДАМ Уладзімір Мішчанчук. Пра заяўкі з Магілёва Уладзімір Андрэевіч, канешне, ведае, аднак просіць зразумець і саміх студэнтаў, якія чатыры гады навучаліся мастацтву драматычнага тэатра і, як вынікае з гэтага, зусім не валодаюць лялечнай тэхналогіяй…

Значыць, ёсць надзея на адраджэнне набору на асобны курс лялечнікаў. І тут паўстае дзіўнае на першы погляд (у святле ўсяго вышэй напісанага) пытанне: а ці будзе на яго запыт дадому) ці назаўсёды зыходзяць з прафесіі…"

Ці з'явіцца надзея пасля рамонту?

Але вернемся ў родныя абшары. Апошнія пяць гадоў галоўны корпус Акадэміі мастацтваў быў зачынены на капітальны рамонт. Тэатральны факультэт перабіваўся здымнымі памяшканнямі на Партызанскім праспекце, на вуліцах Будзёнага і Каліноў-у абітурыентаў? Патлумачу думку прыкладам сёлетняга выпуску завочнікаў па спецыяльнасці "Акцёрскае майстэрства". Калі я падышла да Вольгі Марчук, якая надзвычай запамінальна паказала сябе на дыпломным спектаклі, высветлілася, што выпускніца — актрыса… Брэсцкага тэатра лялек! На лагічнае пытанне, чаму яна вучыцца на "драматычнай" спецыяльнасці, спадарыня Вольга адказала: "У год майго паступлення на іспыты па спецыялізацыі артыста тэатра лялек было пададзена толькі тры заявы, таму Акадэмія вырашыла перанакіраваць нас да калег з драмы". У такім выпадку зразумелыя словы дэкана факультэта, што ў БДАМ няма вялікага попыту на артыстаў тэатраў лялек… Можа, каб былі больш актыўнымі абітурыенты завочнага аддзялення, тады і капітальны рамонт не замінаў бы набору па спецыяльнасці…

Матэрыяльная база для навучання лялечнікаў у БДАМ засталася. Праўда, яна фарміравалася ў асноўным з таго, што аддаваў сталічны тэатр лялек. Адмысловай майстэрні, дзе спецыялісты працавалі і рэалізавалі б мастацкія заявы да студэнцкіх пастановак, у творчай ВНУ ніколі не было. І вельмі шкада! Прынамсі, у Расійскім дзяржаўным інстытуце сцэнічных мастацтваў на факультэце тэатра лялек (які закончылі ў тым ліку нашы рэжысёры-лялечнікі Алег Жугжда і Мікалай Андрэеў), ёсць асобная спецыяльнасць "мастак-тэхнолаг тэатра лялек". Вось яшчэ адна балючая тэма айчыннага тэатра: старыя майстры, якія ўмелі стварыць ляльку згодна з законамі жанру і патрабаваннямі рэжысёра, сыходзяць, а моладзь у нашай краіне не навучаюць…

Напрыканцы агучу апошнюю (хоць, верагодна, першую па значнасці) праблему: вярнуцца да набору лялечнікаў — гэта яшчэ паўбяды, але хто маладых ды зялёных навучаць будзе? Спадар Мішчанчук мае на гэты конт такую задуму: "Калі ў нас больш-менш вырашацца бытавыя пытанні, мы звернемся да нашага шаноўнага, тытулаванага Аляксея Ляляўскага. Вельмі хочацца, каб гэты вялікі майстар знайшоў час і магчымасць набраць сабе акцёрска-рэжысёрскі курс і зладзіць для нашых тэатраў такі выпуск, як гэта ён і рабіў калісьці ў БДАМ. Паважаны Аляксей Анатольевіч можа зрабіць гэта выдатна, бо мае агромністы вопыт, ведае гісторыю айчыннага і сусветнага тэатра, удзельнічае са сваім тэатрам у конкурсах і міжнародных фестывалях па ўсім свеце".

■■■

Застаецца спадзявацца, што ўсе зацікаўленыя ў агульнай справе бакі знойдуць кропкі паразумення, тады і памкненні спраўдзяцца. У выніку выйграе мастацтва: айчынны тэатр лялек зможа і надалей трымаць сваю высокую прафесійную планку, удала эксперыментаваць з формамі і скараць новыя вяршыні майстэрства.

Прагноз ад 0+ да 18+

Плюсы і мінусы ўзроставага цэнзу

З 1 ліпеня 2017 года пачне дзейнічаць Закон Рэспублікі Беларусь № 362-З "Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь". Згодна з ім прадугледжаны комплекс па абароне дзяцей ад інфармацыі, што прычыняе шкоду іх здароўю і развіццю. Самае гучнае наваўвядзенне — узроставая маркіроўка інфармацыйнай прадукцыі. Дык хто падпадае пад дзеянне новых правілаў?

Настасся ПАНКРАТАВА

Хто "плюсы" раздае?

Дапамагчы з вызначэннем узроставага абмежавання павінен грамадска-кансультатыўны савет па абароне дзяцей ад інфармацыі, якая прычыняе шкоду іх здароўю і развіццю. Адпаведна заканадаўству, новая каардынацыйная камісія ствараецца пры Урадзе Рэспублікі Беларусь. Рашэнні савета будуць мець рэкамендацыйны характар.

Заканатворцы хвалююцца, што інфармацыя пэўнага кшталту можа аказаць адмоўны ўплыў на фізічнае, духоўнае і маральнае развіццё падрастаючага пакалення, таму ўводзяць абавязковую маркіроўку (знаёмую нам, напрыклад, па іншаземных фільмах). Прадукцыя, пазначаная знакамі "6+", "12+", "16+", "18+", дазваляецца асобам, што дасягнулі адпаведнага ўзросту. Калі ўзроставыя абмежаванні адсутнічаюць, то павінна быць маркіроўка "0+". Такім чынам дзяцей патэнцыйна абароняць ад тэкстаў і вобразаў, што выклікаюць, у тым ліку, жаданне паліць, ужываць алкаголь ды псіхатропныя рэчывы, падахвочваюць да здзяйснення злачынства ці валацужніцтва і жабравання, падтрымліваюць жорсткасць у дачыненні да людзей і жывёл.

Цяпер галоўнае, каб добрыя памкненні не ператварыліся ў прыватных выпадках у інструмент абмежавання пэўных відаў мастацтва… Адразу ўзгадваецца час, калі такога кшталту закон прымалі ў суседняй дзяржаве. У непрыемную сітуацыю патрапіў улюбёны многімі пакаленнямі мультсерыял "Ну, пачакай!". "Анафему" абвясцілі Ваўку, які кожную серыю не выпускае з лап цыгарэту. Першапачаткова мультфільм хацелі забараніць да паказу раней за 23 гадзіну ці, у якасці "альтэрнатывы", патрабавалі ад аніматараў выразаць усе "дымныя" кадры. Пасля інфармацыйнай хвалі прэтэнзіі да мультфільма знялі, але пытанняў па іншых класічных стужках менш не стала…

Афішны апгрэйд

У пераліку абавязковай для маркіроўкі прадукцыі ў шэрагу з перыядычнымі выданнямі, камп'ютарнымі праграмамі і гульнямі, аўдыявізуальнымі творамі, фанаграмамі, друкаванай прадукцыяй ёсць інфармацыя, якая "распаўсюджваецца праз культурныя мерапрыемствы". Адпаведна, пад закон трапляюць пастаноўкі і праграмы тэатральна-відовішчных устаноў.

Возьмем айчынныя філармоніі: у іх здавён практыкуюцца не толькі разгорнутыя праграмы на ўдумлівага аматара класікі, але і так званы "дзіцячы сезон", не кажучы ўжо пра ранішнікі да Новага года. Налета філарманічным афішам патрэбна будзе абзавесціся лічбавымі пазнакамі. Як распавяла супрацоўніца рэкламнага аддзела Віцебскай абласной філармоніі Ірына Шагалеева, звычайна на рэкламе пазначаюць узрост гледача прыватнікі, якія арандуюць залу для камерцыйных дзіцячых прадстаўленняў. Яны пішуць, напрыклад, "для дзяцей 3-5 гадоў" — і публіка разумее, на што набывае білет.

Адлегласць паміж лічбамі

У Тэатры юнага гледача ўзнятае "К" пытанне не вынесена ў лік першачарговых. ТЮГ можна зразумець: і без прыняцця такога закону на афішах заўсёды пазначана, для дзяцей якога ўзросту прапануецца тая ці іншая пастаноўка. На касе вельмі часта бацькі просяць параіць, з чаго лепш пачынаць знаёмства з тэатрам, а што будзе цікава васьмі- ці дзесяцігадоваму дзіцяці. Для зручнасці публікі тут даўно ўведзена ўзроставая градацыя рэпертуару. І хутчэй не з мэтай абараніць ад шкоднай інфармацыі, а з улікам дзіцячай псіхалогіі, бо тэмы, зразумелыя падлетку, не зможа адэкватна ўспрыняць дашкольнік. Як пракаментаваў дырэктар установы Ігар Варонін, крыху скарэктаваць лічбы — не праблема. І бліжэй да даты, з якой пачне дзейнічаць наваўвядзенне, афішы атрымаюць тую маркіроўку, якую патрабуе заканадаўства.

Падаецца, што абавязковая маркіроўка выклікае больш хваляванняў у тэатраў лялек, бо занадта вялікая адлегласць паміж заяўленымі ўзроставымі лічбамі. У тэатрах яшчэ не браліся ўсур'ёз за азначанае пытанне, але давайце паразважаем. У дзіцячым рэпертуары лялечнікаў могуць значыцца пастаноўкі як для двухгадовых, так і для першакласнікаў. Калі паставіць на афішы "0+", бацькі могуць не сарыентавацца і прывесці малечу на спектаклі, разлічаныя на больш сталых дзяцей. У выніку — сапсаванае ўражанне ў гледачоў ды складаныя ўмовы для працы ў акцёраў (бо дзіця, якое не разумее, што адбываецца на сцэне, пачынае шумець). "Пазнака "6+" адсячэ частку публікі, прычым даволі значную, — разважае аб нюансах, якія, верагодна, могуць паўстаць перад калектывам, намеснік дырэктара па арганізацыі гледача Магілёўскага абласнога тэатра лялек Віталія Арловіч. — Трэба разумець спецыфіку тэатра лялек, магчыма, зрабіць у дакументах нейкія ўдакладненні для нас".

Лягчэй за ўсё будзе карыстацца маркіроўкай "18+". У тэатрах лялек па рэспубліцы часта ставяць вячэрнія спектаклі, у якіх з'яўляюцца мізансцэны нават пікантнага характару. У афішы абавязкова пазначаюць, што гэтыя пастаноўкі разлічаны на дарослых. Але акцёры скардзяцца, што ўвечары не-не ды і пабачаць на першым радзе ружовашчокую прыгажуньку ў бантах. Магчыма, звыклыя па кінатэатрах лічбы, што з'явяцца і на тэатральных афішах, перакананаюць некаторых бацькоў не весці малодшых школьнікаў на вячэрнія пастаноўкі…

Кінапрактыка

Прасцей за астатніх прызвычаіцца да новых патрабаванняў будзе айчынным кінавытворцам, бо ўзроставая маркіроўка звыклая ім па вопыце калег з суседніх дзяржаў. Зазначу адно ўдакладненне: калі ў апісаных вышэй выпадках маркіроўку вызначаюць арганізатары культурных мерапрыемстваў (чытай, самі культурныя ўстановы), то для фільмаў, якія прызначаныя для дэманстрацыі на тэрыторыі нашай краіны, знак узроставай катэгорыі прысвойваецца адпаведнай структурай, вызначанай заканадаўствам Беларусі аб культуры.

Мастацкі кіраўнік студыі анімацыйных фільмаў Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" Аляксандр Ленкін лічыць, што лічбавы цэнз больш датычыцца не непасрэдна рэжысёраў, а бацькоў і педагогаў. Часам, менавіта лічба на афішы дапамагае ім арыентавацца ў кінарэпертуары. "Для рэжысёра наваўвядзенні — фармальная рэч. Ці не сутыкаліся вы з тым, як дашкаляты з задавальненнем глядзяць стужкі для падлеткаў? Бо тая карціна можа быць дынамічнай, музычнай, яскравай і таму больш прывабнай. Пры гэтым некаторыя "дарослыя" моманты яны не заўважаць — проста таму, што ім гэтыя рэчы незразумелыя, чытай, не заслугоўваюць увагі. А старэйшае пакаленне з задавальненнем глядзіць мультфільмы катэгорыі "6+", — растлумачыў сваё меркаванне суразмоўца.

Заканадаўства імкнецца абараніць дзяцей ад кадраў, што дэманструюць курэнне, ужыванне алкаголю ці наркотыкаў. "Але колькі ў сусветнай анімацыйнай класіцы існуе адмоўных персанажаў, неад'емнай часткай якіх з'яўляецца цыгарэта. У Расіі праз спробы і памылкі прыйшлі да высновы, што выразаць тыя кадры не мае сэнсу", — працягвае спадар Аляксандр. З яго пункта гледжання, дзіцяці хопіць тлумачэння бацькоў, чаму паліць дрэнна. Дастаткова напачатку стужкі даць бягучым радком, што курэнне шкодзіць здароўю. У творчую задуму карціны ўмешвацца не трэба. "Іншымі словамі, для мяне няма нічога незвычайнага ці нечаканага ў тым, што ў кінавытворчасці ўводзяць узроставыя маркеры. Пра тое даўно казалі ў кінаасяроддзі. У Еўропе, Амерыцы, суседніх дзяржавах ёсць такія азначэнні стужак, добра, што мы ўрэшце дайшлі да сусветнай практыкі", — дадаў мастацкі кіраўнік анімацыйнай студыі.

К

Дзяжурны па нумары

Захаваць або знішчыць?

Пра стварэнне разнастайных брэндаў у сферы культуры гаворана-перагаворана, у тым ліку ў нашай газеце. Відавочна адно: цікавы брэнд, насычаны разнастайным інтэрактывам і падмацаваны годнай інфраструктурай, можа прыносіць вялікі прыбытак не толькі ў сферу культуры, але і ў раённую ды дзяржаўную скарбонку.

Кастусь АНТАНОВІЧ

Таму ці не ўсе раёны навыперадкі шукаюць ці ствараюць штучна цікавосткі. А знайшоўшы, карпатліва аберагаюць і па магчымасці развіваюць. Так было і ў Шаркаўшчынскім раёне. Яблычны брэнд, створаны не на пустым месцы, а на базе ўнікальнага саду і сядзібы беларускага садавода-селекцыянера Івана Сікоры, прыцягвае ўвагу далёка за межамі раёна. Музей і фестываль у вёсцы Алашкі наведваюць турысты з усёй Беларусі, а з улікам блізкага суседства з Літвой і Латвіяй — і з Еўрасаюза.

У час аўтатура ўвосень 2014-га пабывалі там з Яўгенам Рагіным. Пазнаёміліся з нястомнай ініцыятаркай стварэння "яблычнага" музея Адай Райчонак, якая ў свой час набыла, а некалькі гадоў таму перадала дзяржаве дом Івана Сікоры з гаспадарчымі пабудовамі. А таксама з дырэктарам установы Наталляй Перхуновіч, разам з якой нават прагаварылі цалкам рэалістычную стратэгію развіцця комплексу, выхаду на самаакупнасць. Убачанае пераканала: Алашкі поруч з Германавічамі могуць стаць адным з улюбёных турыстамі месцаў. Словам, нічога не прадказвала нейкіх негатыўных наступстваў.

І тут нечакана ў сацыяльных сетках з'явілася інфармацыя: "Музей Сікоры пад пагрозай закрыцця". Каб разабрацца ў сітуацыі, звярнуўся да Ады Эльеўны, якая і забіла ў набат. Як высветлілася, вэрхал усчаўся з-за таго, што нехта даслаў ананімны ліст у Міністэрства культуры і іншыя інстанцыі з прапановай пазбавіцца ад фестывалю і музея, бо, маўляў, ад іх шмат шуму і клопатаў мясцовым жыхарам.

Фармулёўка больш чым дзіўная. У той час, калі ў беларускіх гарадах ствараюцца пешаходныя зоны з вулічнымі музычнымі калектывамі, а вёскі сутыкаюцца з праблемай адсутнасці не тое што турыстаў, але працоўнай сілы, казаць пра шум ад урачыстага свята, якое праходзіць раз на год, як мінімум дзіўна. Праз такія фестывалі менавіта мясцовае насельніцтва атрымлівае бонусы: ад прыўнясення свята ў іх будні да магчымасці прадаць лішкі сваёй сельскагаспадарчай прадукцыі турыстам альбо прадаставіць за невялікі, але тым не менш не лішні для сямейнага бюджэту, кошт пакой у сваёй сядзібе. Што і казаць! У Алашках створана інфраструктура, у тым ліку амфітэатр, затрачаны немалыя дзяржаўныя грошы. І пры гэтым ідзе гаворка пра перамяшчэнне фестывалю ў райцэнтр….

Абмеркаваў сітуацыю з Навумам Гальпяровічам, галоўным дырэктарам галоўнай дырэкцыі міжнароднага вяшчання Белтэлерадыёкампаніі (радыё "Беларусь"), які прымаў непасрэдны ўдзел у стварэнні музея Сікоры, быў асабіста знаёмы з сынам знакамітага селекцыянера. На думку Навума Якаўлевіча, было б вялікай памылкай праз ананімныя паклёпы губляць унікальны культурны аб'ект і фестываль.

Прызнаюся, асабіста гэтую ананімку я не бачыў. Але, па шчырасці, гора-ініцыятывы, якія аўтар пабаяўся падпісаць уласным імем, не хочацца нават у рукі браць. Ды і па айчынным заканадаўстве ананімкі не мусяць разглядацца. Таму, спадзяюся, здаровы сэнс пераможа, і фестываль, як і музей у Алашках, будуць па-ранейшаму прыцягваць турыстаў. А шум вакол толькі павялічыць колькасць гасцей Шаркаўшчынскага раёна. Часам нават дробнае шкодніцтва, інакш пра ананімку і не скажаш, можа быць піярам. Шкада, што чорным.

К

Боль у клубе?

Здароваму ладу жыцця вучыліся ў віцебскай бібліятэцы імя Максіма Горкага. Усё натуральна: без гэтага сучасны чалавек не можа лічыць сябе культурным ды самадастатковым. І лектараў запрасілі надзвычай дасведчаных і самабытных. Прычым размаўлялі яны з аўдыторыяй па-беларуску.

Загадчык кафедры медыцынскай рэабілітацыі дацэнт Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта Таццяна Аленская сцвярджае, што родная мова з'яўляецца адным з дзейсных сродкаў той жа рэабілітацыі, яна забяспечвае нейронныя сувязі галаўнога мозга. І калі чалавек карыстаецца сваёй мовай, гэта генетычна падтрымлівае яго мозг у добрым рабочым стане, прафілактуе дэменцыю (слабасць разумовай дзейнасці) у сталым узросце, дапамагае лепш прыстасавацца да жыцця.

Таццяна Леанідаўна прывяла шмат прыкладаў прафілактыкі: фізічная актыўнасць і такая яе папулярная разнавіднасць, як скандынаўская хадзьба, эргатэрапія ці трэніроўка дробнай маторыкі пальцаў, клопат пра расліны, іглярэфлекса-, танцавальная і музыкатэрапія, выкарыстанне ўздзеяння пахаў, твораў мастацтва і нават звычайнага сонечнага святла…

Пра тое, як пераадольваць узроставыя абмежаванні і не страчваць якасць жыцця, распавёў першы намеснік старшыні Беларускага геранталагічнага грамадскага аб'яднання прафесар Кірыл Прашчаеў. Выхаванец Віцебскага медінстытута, ён вельмі добра валодае беларускай мовай і ўпэўнены, што гэта павінна быць неад'емнай якасцю беларускага ўрача. Хаця б для таго, каб без перакладчыка зразумець пацыентку ва ўзросце, якая жаліцца на боль ў клубе. Не ва ўстанове культуры, вядома. Гэта, канечне, адзін з мноства дасціпных жартаў, якімі была шчодра перасыпана лекцыя-трэнінг Кірыла Іванавіча..

Сёння геранталагічная навука перагледзела крытэрыі здаровага старэння. Ужо не лічыцца, што гэты працэс не павінен суправаджацца хранічнымі хваробамі. Яны часцей за ўсё ёсць, таму пастаўлена задача ствараць для пажылых людзей такі тэрапеўтычны безбар'ерны асяродак, які дазволіць ім мець нядрэнную якасць жыцця, адчуваць сябе паўнавартасным чалавекам. Першы вынік такой работы ўжо дасягнуты ў Луначарскім доме-інтэрнаце Верхнядзвінскага раёна.

Так што вучымся старэць! Геранталагічнае грамадскае аб'яднанне Беларусі праводзіць з 2020 года дэкаду здаровага старэння, якая працягнецца цэлае дзесяцігоддзе. З 1 чэрвеня, як паведаміў Кірыл Прашчаеў, Віцебская вобласць стала эксперыментальнай пляцоўкай па прафілактыцы дэменцыі.

Вера МУРАШКІНА
Віцебск

Маладыя рэжысёры на... чамаданах

У Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў завяршыліся іспыты ў выпускнікоў-рэжысёраў. Прыемна, што значную колькасць спектакляў без пяці хвілін дыпламаваных спецыялістаў ведаюць і крытыкі, і глядач. Аглядальнік "К" папрысутнічала на абароне дыпломных праектаў.

Настасся ПАНКРАТАВА

Сцэна са спектакля "Шабаны".

Чамаданная лесвіца

Распачыналі дзяржэкзамены па спецыяльнасці "Рэжысура" завочнікі. Сёлета абараняўся курс прафесара, заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь Валерыя Анісенкі. Даводзіць 14 выпускнікоў да дыплома дапамагала старшы выкладчык кафедры рэжысуры БДАМ Тацяна Траяновіч. Адзначу, моладзь пад яе кіраўніцтвам добра разумела, што ад яе патрабуецца на дзяржэкзамене, у большасці вытрымлівала рэгламент прэзентацыі работы, фармат і хронаметраж трэйлера да дыпломнага спектакля (чаго раз-пораз бракавала выпускнікам дзённага аддзялення).

Ужо пасля першых выступленняў стала зразумела, што для многіх выпускнікоў дыпломны спектакль стаў не першым, а чарговым праектам. Напрыклад, Ірына Слюсар другі год як асталявалася ў Санкт-Пецярбургу, дзе кіруе створаным ёю тэатральным праектам "Прывітанне!": ладзіць лялечныя спектаклі, арганізоўвае гарадскія святы для ўсёй сям'і, дабрачынныя мерапрыемствы. А студэнтка з падмаскоўнага Серпухава Алена Парошына ўразіла камісію выбарам месца пастаноўкі дыплому: яна дабралася да Паўднёва-Сахалінска! Рэпертуар тамтэйшага дзяржаўнага тэатра лялек выпускніца ўзбагаціла "Снежнай каралевай". Па ўсім відаць, Алена — паўнавартасны прафесіянал, і дыплом у гэтым выпадку ўсяго толькі афіцыйнае пацверджанне заслужанага права на рэжысёрскае крэсла.

Сцэна са спектакля "Каханне як мілітарызм". / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ



Сцэна са спектакля "Цень думкі нашай...". / Фота Андрэя ЖЫГУРА

Акрамя названых вышэй пастановак, дзяржкамісія разгледзела яшчэ нямала дзіцячых спектакляў: Уладзімір Бабак у Глускай дзіцячай школе мастацтваў паставіў "Мымронка", Наталля Міхайлік прапанавала канцэпцыю бэбі-тэатра, Дзяніс Ксяневіч з ТЮГу прэзентаваў колішнюю прэм'еру "Таямніца вялікага Гудвіна", Яўген Рэкеш з Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы распавёў пра "Чамаданны настрой".

Зрэшты, чамадан як вобраз шляху стаў адным з найчасцейшых візуальных увасабленняў у сцэнаграфіі праектаў. Умоўнае другое месца я аддала б лесвіцы і яе варыяцыям (прыступкі, драбіны). Кажуць, ідэі лунаюць у паветры… Як там ні было б, але адзін з такіх "чамаданаў" атрымаў на конкурсе сцэнографаў — Прэміі імя Івана Ушакова — дыплом 2-й ступені (афармленне Юліяй Карымавай спектакля "Каралева прыгажосці з Лінэна" Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа ў пастаноўцы Ірыны Цішкевіч).

Коласаўскі тэатр быў прадстаўлены дзвюма завочніцамі: мастацкі кіраўнік тэатра Валерый Анісенка аддаў моладзі Камерную сцэну. Прозвішча Ірыны Цішкевіч у якасці рэжысёра-пастаноўшчыка з'явілася ў рэпертуары ўжо трэці раз. Яе калега і аднагрупніца Ніна Обухава паставіла на роднай сцэне два спектаклі, прычым дыпломны "Цень думкі нашай…" па творах Францішка Аляхновіча нават вылучалі да адбору на Нацыянальную тэатральную прэмію, што гаворыць пра сапраўдны давер да маладога рэжысёра.

Падчас абароны казалі не толькі пра ўласна прафесійныя дасягненні, але і пра агульныя праблемы сучаснага тэатральнага мастацтва. Дыпломнікі з жалем зазначалі, што глядач прагне забавы, таму спектаклю, які патрабуе ўдумлівага занурвання, не заўсёды па сілах сабраць залу. Так, на згаданай прэм'еры Обухавай многія месцы ззялі пустэчай. Ганна Дземідовіч рабіла свой дып-

Форум

Вакол

У аўторак дакументалісты студыі "Летапіс" Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" запрасілі на сустрэчу крытыкаў і прадстаўнікоў СМІ, каб другі раз за гэты год заявіць пра свае праблемы (гл. "К" № 5). На пачатку 2016-га адносна студыі казалі пра пагрозу ліквідацыі як асобнага структурнага падраздзялення. Але візіт міністра культуры Барыса Святлова на кінастудыю "Беларусьфільм" супакоіў кінематаграфістаў. Ды сёння, кажуць яны, "Летапіс" знаходзіцца, фактычна, у прастоі.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Градус эмоцый на сустрэчы з крытыкамі і прэсай быў высокі. Там кінематаграфісты, сярод іншага, прызналіся, што накіравалі ліст з 26 подпісамі ў 5 інстанцый, у якім агучылі асноўныя праблемы дакументальнага кіно і прапановы па іх вырашэнні, . Тым не менш, кінематаграфісты і агучылі праблемы.

13:00 і 12:59

"Кожны кадр, які мы здымаем сёння, потым становіцца гісторыяй, — падкрэслівае вядучы рэдактар студыі, старажыл "Летапісу" Уладзімір Мароз, фільм па сцэнарыі якога адзначаны Дзяржаўнай прэміяй нашай рэспублікі. — За паўгода мы не знялі ніводнага кадра. Няўжо сёння гісторыя краіны не патрэбная?" Дырэктар студыі, рэжысёр Аксана Эйхарт зазначае: "Згодна з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб рэспубліканскім бюджэце на 2016 год", на кінематаграфію прадугледжваюцца выдаткі ў больш чым 68 мільярдаў рублёў. Згодна са Стратэгіяй развіцця кінематаграфіі Рэспублікі Беларусь на 2015 — 2020 гады, запланавана зняць 35 дакументальных фільмаў. Фінансаванне іх ажыццяўляецца па выніках Рэспубліканскага конкурсу кінапраектаў". Але, дадае прамоўца, на дадзены момант гэта творчае спаборніцтва, якое абяцае пэўную занятасць дакументалістам, пакуль не адбылося. Яго найбліжэйшы тэрмін правядзення — верасень. "Гэта значыць, калі мы атрымаем магчымасць здымаць, скончым, хутчэй за ўсё, у новым годзе", — канстатуюць на "Летапісе".

Па-другое, прафесійная супольнасць "гудзіць" ад праблемы хронаметражу дакументальных стужак. Сёння для дакументалістаў, каб атрымаць працу, існуе пэўнае выйсце ў запуску невялікай карціны, і каб фільм не падпадаў пад конкурсныя характарыстыкі, скарыстоўваецца працягласць стужак у 12 хвілін 59 секунд. Мала таго, што гэты хронаметраж не дазваляе аўтарам "разгарнуцца", тая самая секунда істотна адбіваецца на аплаце іх працы — рэжысёры атрымліваюць "пастановачныя" ўдвая меншыя, бо скарыстоўваецца "вілка" папярэдняй катэгорыі фільмаў паводле іх працягласці.

"Кіношная костачка"

Згодна з рашэннем снежаньскай калегіі Міністэрства культуры па пытаннях развіцця кінематаграфіі некаторая частка супрацоўнікаў "Беларусьфільма" была пераведзена на дамоўную форму адносінаў: запускаецца карціна — спецыялісты наймаюцца. Няма стужкі — адпаведна, няма і працы, і шэраг кінематаграфістаў сапраўды ўжо выведзены за штат "Летапісу". "Пры гэтым стаж не ідзе, бо працоўная кніжка не ляжыць на студыі, няма ні адпачынку, ні пенсійных адлічэнняў — мы не маем сацыяльных гарантый, — кажа аператар Іван Ганчарук. — Але шукаць іншую працу складана — усё ж такі разлічваеш, што работа на роднай студыі для цябе з'явіцца".

— Людзі, што тут працуюць, — сапраўдная "кіношная костачка", — падкрэслівае рэжысёр, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Міхаіл Жданоўскі. — Людзі на сваім месцы. Але сёння пачуццё студыйнасці знікае, "вымываецца" прафесія.

А што, уласна, здымаем?

Турбуе прафесіяналаў пытанне самавыяўлення — тэматычны фокус.

— Сёння дакументальнае кіно многія атаясамліваюць з "казённымі" фільмамі, — кажа сябра Еўрапейскай кінаакадэміі, рэжысёр Віктар Аслюк. — А ў цэнтры дакументальнай стужкі мае быць чалавек. Больш дакладна — "узрушаны чалавек", як у Святланы Алексіевіч. Без драмы, без канфлікту не існуе добрага дакументальнага кіно. А калі паглядзець фільмы апошніх гадоў — яны тэлевізійныя, прыкладныя. Не дзіва, што людзям нецікава іх глядзець.

Каб пазбегнуць залежнасці ад абмежаванага кола тэмаў рэжысёр прапануе вярнуць права голасу мастацкаму савету "Летапісу", які здолеў бы далей самастойна вызначаць тэматычныя напрамкі. Гэта крок назад альбо наперад — складана сказаць. Але тэматычны заказ — форма, якая часам выглядае несучасна. Чаму не дазволіць рэжысёрам і самім выбіраць тэму і здымаць пра тое, што ім "баліць"?

І для каго?

З прамоўленага кінематаграфістамі з нагоды сітуацыі, якая склалася, вынікае: становішча складанае. Акрамя тэматычных і фінансавых пытанняў, праблематычным выглядае поле далейшага распаўсюджвання прадукцыі — дзе паказваць тыя большасць стужак у 12 хвілін 59 секунд, калі на тым жа тэлебачанні найбольш распаўсюджаны фармат — 26 хвілін ці нават 52 (для грунтоўных тэледаследаванняў дакументалістаў)? А той жа фестываль IDFA, найбуйнейшы фестываль кінадакументалістыкі, што праводзіцца ў Нідэрландах, наогул не прымае да ўдзелу стужкі хронаметражом менш за 40 хвілін… Урэшце, як доўга можна выкручвацца з сюжэтамі даўжынёй, лічы, у тэлевізійны ролік?

Набалелую праблему адсутнасці экрана дакументальнага кіно ўзняла рэжысёр, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва Галіна Адамовіч. Зрушыць беларускія каналы ў бок айчыннай дакументалістыкі цяжка. Увогуле, ужо неаднойчы гучала прапанова аб стварэнні адпаведнага цэнтра-кінатэатра беларускай дакументалістыкі. Але ідэя так і засталася ў стане пражэкта.

— Давайце будзем шчырымі, — доўжыць Віктар Аслюк. — Рэальнай альтэрнатывы ў абліччы іграваго кіно дакументальнаму пакуль няма. Ці з'явіўся за гэты час той серыял, якім мы можам ганарыцца? Поўнаметражная гравая карціна? Не. Тады чаму не зрабіць стаўку на дакументальнае кіно, як гэта зрабілі такія краіны як Данія, Фінляндыя, Галандыя? Нідэрланды сёння вядомыя ва ўсім свеце не толькі фільмамі Ёса Стэлінга, а яшчэ і моцнай дакументалістыкай.

Магчыма, зрабіць стаўку на дакументальнае кіно выглядае для кагосьці ўтапічна, але ў складаных эканамічных умовах акурат падобны ход здольны намацаць новыя шляхі існавання айчыннай кінематаграфіі. Гэты праект не патрабуе вялікіх укладанняў (у параўнанні з высокабюджэтнымі блокбастарамі), а між тым здольны стварыць адметнае аблічча Беларусі як кінематаграфічнай краіны са сваёй лініяй.

Для масавай публікі, будзем аб'ектыўнымі, пакуль беларуская дакументалістыка шырока не адкрытая, але эфектыўная стратэгія прасоўвання і папулярызацыі гэтага кіно здольная паступова змяніць сітуацыю. Па сутнасці, Беларусь мае брэнд, які з розных прычын да гэтай пары не раскручваецца і не пазіцыянуецца як такі ў поўным сэнсе. (Адзначым, што тое тычыцца і беларускай анімацыі.) Урэшце, а навошта "спрачацца" з галівудскай прадукцыяй, калі ёсць свой аўтарскі

лом "Свята адзіноты" ў родным ёй рэчыцкім народным тэатры-студыі "Ілюзіён". Але паэтычная драма пра мастака Ніко Пірасмані не знайшла годнага водгуку ў гараджан: на 600 месцаў мясцовага палаца культуры было прададзена толькі 14 білетаў… Іншая дыпломніца Маргарыта Бяганская ўзяла да абароны твор Інгмара Бергмана, але баючыся, што непадрыхтаваная аўдыторыя можа не прыняць складаную п'есу, паказы "Прымы" ў ДК МТЗ ладзіла для запрошанай публікі…

Не ўсіх пачаткоўцаў у прафесіі цягнула да дзяржаўнага тэатра: некаторым хацелася шукаць новыя формы для рэалізацыі нестандартных ідэй (што далёка не ўсе гасразліковыя структуры гатовы падтрымаць). Гэту задачу шыкоўна адолеў Цэнтр эксперыментальнай рэжысуры, якім кіруе Тацяна Траяновіч. Тут новыя прыёмы ў пастановачнай працы рэжысёра спрабавалі знайсці Станіслаў Савосцін ("Двое бедных румынаў, якія гавораць папольску"), Наталля Ляванава ("Па імені Гаспадар"), Настасся Ермаковіч ("Сляпыя"). Дарэчы, апошні — пластычны спектакль у жанры глітч паводле Марыса Метэрлінка — ужо ўзяты ў пракат Нацыянальным цэнтрам сучасных мастацтваў. Відавочна, што з'яўленне адкрытай да творчых спробаў пляцоўкі плённа паспрыяла развіццю айчыннай рэжысуры: з'явілася цэлая плеяда маладых эксперыментатараў, якія знаёмяць сучаснікаў з палітрай інавацыйных тэатральных тэхналогій.

Сцэна са спектакля "Свята адзіноты".

Сцэна са спектакля "Браты і Ліза".

Партрэт эстрады

Першымі з дзённага аддзялення да дзяржаўных іспытаў прыступілі пяцікурснікі па спецыяльнасці "Рэжысура тэатра (эстрада)". Да фінальнай рысы дайшлі трое студэнтаў. Мастацкі кіраўнік курса дацэнт Вітаўтас Грыгалюнас нахвальваў сваіх падапечных: "Моладзь таленавітая! Ёсць толькі адна праблема: рэжысёру эстрады вельмі складана знайсці месца абароны дыплому. Многія гавораць: "Навошта яны нам? Мы самі сабе рэжысёры!" Вось такая сёння ў нас эстрада… Тым не менш, выпускнікі атрымалі добрую падрыхтоўку, што дазволіла ім рэалізаваць цікавыя праекты".

Алена Барсукова ладзіла тэматычны канцэрт з элементамі тэатралізацыі, Ганна Сабалеўская займалася тэатралізаваным паказам мод, а Яўген Заруцкі выправіўся ў Гродзенскі абласны тэатр лялек, дзе выпусціў спектакль "Партрэт" па аповесці Мікалая Гогаля. "Заруцкі "хварэў" на тэатр лялек з першага курса, і было зразумела, што ён пойдзе ў гэтым напрамку", — патлумачыў выбар дыпломніка Вітаўтас Альгердавіч. Незразумела, ці вернецца малады спецыяліст у далейшым да абранага жанру, бо па размеркаванні ён накіраваны ў Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці. Але сам Яўген з запалам гаворыць пра будучае месца працы і ўпэўнены, што дасягненні залежаць ад рэжысёра, а не ад месца яго знаходжання.

Пасля экзамену Вітаўтас Грыгалюнас выказаў "К" сваю мару: набраць цыркавых рэжысёраў, бо ў якасці мастацкага кіраўніка Беларускага дзяржаўнага цырка ён неаднойчы сутыкаўся з праблемай недахопу спецыялістаў, якія змаглі б прафесійна паставіць нумар, улічваючы асаблівасці і спецыфіку абранага артыстам жанру.

Сцэна са спектакля "Партрэт".

Дарогу мюзіклу!

Наступны дзяржэкзамен пачаўся са слоў мастацкага кіраўніка курса — дацэнта, заслужанага дзеяча мастацтваў Расіі Міхаіла Кавальчыка: "Хачу выказаць падзяку Акадэміі мастацтваў за тое, што яна знайшла мужнасць і сілы ўпершыню набраць цэлы курс рэжысёраў музычнага тэатра. Сёлета мы правядзём новы набор і працягнем складаную і няпростую справу, так патрэбную для Беларусі. Сёння, нягледзячы на тое, што ў краіне адзін дзяржаўны музычны тэатр, шмат калектываў ставяць мюзіклы, вадэвілі, музычныя спектаклі і праграмы — відавочна, наша прафесія вельмі патрэбная!"

На спецыяльнасць набіралі асоб, большасць з якіх мела за сваімі плячыма адукацыю музычнага каледжа ці, прынамсі, музычнай школы. Такую аснову падмацавалі профільнымі тэатральнымі дысцыплінамі, што дало шыкоўны вынік. Прынамсі, Валерыя Чыгілейчык бліснула маштабным мюзіклам "Прыгоды Кая і Герды (Снежная каралева)", як і ўвайшоў у рэпертуар Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра.

Пабачыўшы, як годна вучаніца спраўляецца з працай у прафесійным калектыве, Міхаіл Станіслававіч — галоўны рэжысёр Музычнага — прапанаваў Валерыі застацца ў тэатры на пасадзе рэжысёра-пастаноўшчыка. Сюды ж размеркавалася яе аднакурсніца Вольга Здзярская: актрысай, але з перспектывай на пастаноўку. Спадзяюся, што Вольга выкарыстае тую магчымасць, бо яе камерны мюзікл "Хлопчык у Хрыста на ёлцы", ажыццёўлены на Камернай сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага, дае падставу казаць пра добрую перспектыву выпускніцы.

Кіраўнік курса запэўнівае: уся пяцёрка — своеасаблівая, вельмі таленавітая. Кожны з яе знайшоў сабе месца: Дар'я Мядзель выпусціла на пляцоўцы Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў мюзікл "Мама" і працягне рэжысёрскую дзейнасць у адміністрацыі аднаго са сталічных раёнаў, Яўген Даражынскі размеркаваўся ў Смалявіцкі ДК, дзе плануе стварыць свой тэатр, Валянціна Ваўчок вяртаецца ў alma mater у якасці педагога. Дадам, што дыпломны праект Валянціны — мюзікл "Чыкага" на Камернай сцэне Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі — не пакінуў абыякавым публіку. Міхаіл Кавальчык нават задумаў стварыць у Музычным Малую сцэну і перанесці туды гэтую вартую ўвагі пастаноўку.

Пяцёрка смелых

Самыя знакамітыя выпускнікі сабраліся на курсе рэжысёраў драмы прафесара Мікалая Пінігіна. Мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Янкі Купалы многае ўклаў у сваіх выхаванцаў. Адкрыццё Камернай сцэны ў Купалаўскім таксама сыграла ў "плюс" студэнтам: тры з пяці амаль што дыпламаваных спецыялістаў паставілі свае выпускныя спектаклі менавіта на гэтай пляцоўцы. Скажам, Алена Ганум паказала нашумелыя летась "Шабаны", адкрыўшы беларускаму тэатру вядомага празаіка Альгерда Бахарэвіча.

Заканчэнне
чытайце на старонцы 9.

брэнда

прадукт, які каціруецца на міжнародных фестывалях? Так, крок насустрач дакументальнаму кіно не абяцае хуткіх прыбыткаў, але ў доўгатэрміновай перспектыве можа прынесці значныя дывідэнды. Дакументальнае кіно сёння — і сапраўды даўно не хроніка з'ездаў, а кранальныя, захапляльныя чалавечыя гісторыі. А патрэба ў іх — як ніколі.

■ ■ ■

І яшчэ. Падчас прэс-канферэнцыі кінематаграфістаў, яны, расчараваныя ў конкурсе кінапраектаў, прапанавалі адмовіцца да апошняга. Перабор? Несумненна. Але сама па сабе гэта сітуацыя не можа не непакоіць. Урэшце, і час не стаіць не месцы. Значыць, і конкурс у перспектыве можа паступова відазмяняцца і ўдасканальвацца. Як, відаць, не абысціся з часам без ільгот для кінаінвестараў, без афармлення канкурэнтнага асяродку кінавытворчасці і многіх іншых крокаў. У свой час для гэтага не былі зроблены захады, у прыватнасці, адносна стварэння паўнавартаснай індустрыі... Можа, самы час падумаць і пра такі кірунак, як цяпер прынята казаць, дыверсіфікацыі, прынамсі, намаганняў у кінасферы?

К

Апошнія два гады для "Летапісу" ў прынцыпе аказаліся няпростымі: студыя рэзка скараціла маштабы дзейнасці. Калі раней прагляды прадукцыі за год займалі па тры дні, то мінулыя два разы ўвесь беларускі кіналетапіс змяшчаўся ў адзін сеанс.

Антон СІДАРЭНКА, кінакрытык

Пры гэтым за два гады студыя выпусціла ўсяго некалькі фільмаў, якія могуць лічыцца поўнаметражнымі. І штатныя, і пазаштатныя аўтары вымушаны былі задавальняцца кароткім метрам да 13 хвілін. Апошнія могуць запускацца на сродкі студыі. На больш працяглыя карціны грошы павінны вылучацца паводле вынікаў адкрытага рэспубліканскага конкурсу кінапраектаў, але апошні раз адносна дакументалістыкі ён праводзіўся год таму. У адрозненне ад конкурсу ігравых праектаў, на якія грошы знаходзяцца, хоць маштабы бюджэтаў ігравога і дакументальнага кіно ў нашай краіне, у адрозненне ад некаторых іншых, несупастаўныя.

Што такое быць у шматмесячных прастоях для прафесійных рэжысёраў і аператараў у самым росквіце жыццёвых і творчых сіл, асабліва тлумачыць не трэба. Як і тое, што бесперабойная праца — неабходная ўмова існавання студыі як творчага арганізму. Нават у такой сітуацыі некаторыя з новых «летапісных» фільмаў па цяперашніх часах могуць лічыцца ўзорамі неігравога кінамастацтва. Напрыклад, "Педагагічная паэма" Віктара Аслюка і Вольгі Дашук або кароткаметражны "Дудар" Юрыя Цімафеева. Як і вельмі цікавыя працы пра беларускія замкі і культавыя збудаванні, на якіх былі занятыя, у тым ліку, і аўтары-дэбютанты. Менавіта карціны "Летапісу" з усёй прадукцыі "Беларусьфільма" апошніх гадоў маюць поўнае права прэтэндаваць на высокі статус нацыянальных, іх аўтарам удаецца падтрымліваць узровень мастацтва, якое заўсёды адрозніваецца ад стандартызаванай тэлевізійнай прадукцыі. Нягледзячы на перапынкі ў працы, архаічную арганізацыю і ўмовы здымак.

Але сітуацыя, урэшце, не сталася раптоўнай. І яе цалкам можна было прадухіліць. Іншая справа, што студыя, як і ўвесь "Беларусьфільм", арганізацыйна затрымаліся ў даўно прамінулых часах планавай гаспадаркі і адсутнасці канкурэнцыі за гледача. У ігравым беларускім кіно гэта выяўляецца ў нівеляванні мастацкага і ідэйнага складнікаў. Наша дакументалістыка пакуль ратуецца за кошт некалькіх знакавых фігур, якія знаходзяць магчымасць працаваць не толькі тут. Па сутнасці, нацыянальнае кінамастацтва — не столькі студыя, колькі людзі. А кінапрацэс і сапраўды даўно не замкнёны ў адной арганізацыі. Больш за тое, з'явіліся ўдалыя прыклады дакументалістаў, якія не разлічваюць на дзяржаўнае фінансаванне, самастойна прадзюсуюць свае стужкі або знаходзяць прадзюсараў збоку, у тым ліку, за мяжой. У прынцыпе, нічога незвычайнага: сучасны кінапрацэс даўно дзейнічае па праектным прынцыпе і не замыкаецца ў сценах студый-гігантаў.

Кіраўніцтва "Беларусьфільма" сітуацыю з "Летапісам" пакуль не каментуе, ды і на сустрэчы яно адсутнічала. (Мабыць, далёкі ад праблемы і Беларускі саюз кінематаграфістаў, які, здавалася б, павінен быць зацікаўлены ў падтрымцы сваіх членаў.) Але дзякуючы слушнаму менеджменту і дакладна распрацаванай стратэгіі можна вывесці нашу дакументалістыку на той узровень, якога яна заслугоўвае. Удзел творцаў у прэстыжных міжнародных кінафестывалях і зацікаўленасць праектамі на пітчынгах у розных краінах сведчыць пра канкурэнтаздольнасць і ў жорсткіх умовах канкурэнцыі за гледача ў лічбавую эпоху.

Верагодна, варта зноў задумацца аб самастойным цэнтры нацыянальнай дакументалістыкі, які ў меншай ступені будзе залежаць ад умоў працы велізарнай студыі. Несумненна, больш кампактная структура з мінімальнымі ўнутраннымі выдаткамі (такая як "Беларускі відэацэнтр" у свой час) станецца больш канкурэнтаздольнай ва ўмовах конкурсаў праектаў і прасоўванні прадукцыі да гледача. У тым, што такі цэнтр нашаму кінамастацтву неабходны, сумневаў няма — ён мае стаць асновай для жыццяздольнага асяроддзя, у якім і магчымы творчы працэс.

Насамрэч, кіно за апошнія дзесяцігоддзі вельмі моцна змянілася. І тыя меркі, накшталт жорсткага хронаметражу і тэмплану, з якімі да яго падыходзілі яшчэ 10 — 15 гадоў таму, ужо не актуальныя. Змяніўся і глядач, які стаў больш патрабавальным, за яго ўвагу трэба няспынна змагацца. А значыць, мусяць змяніцца падыходы і саміх кінематаграфістаў, формы іх творчасці павінны быць разлічаны на самую разнастайную аўдыторыю. Цікавасць у свеце да неігравога кіно расце з кожным годам, у буйных гарадах Еўропы і ЗША да кінатэатраў з дакументальным кіно выстройваюцца чэргі, і тое трэба выкарыстоўваць.

На фоне камп'ютарных фільмаў-коміксаў кіно пра жывых людзей з натуральнымі канфліктамі становіцца незвычайна запатрабаваным. І тут дакументалістыцы няма роўных. Трэба толькі не баяцца выйсці са звыклай зоны камфорту, каб убачыць новыя гарызонты, — прычым не толькі самім кінематаграфістам.

К

Ад рэдакцыі. Падаецца, працэс выхаду з зоны камфорту і пошуку новых далягляданў, стварэння паўнавартаснай індустрыі і ёсць праява згаданай у выступленні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі на V Усебеларускім народным сходзе патрэбы сістэмнай мадэрнізацыі розных галін і поўнай аддачы ад яе на карысць краіны. Тут карысць — брэндавая. Чаму б не знайсці новы спосаб для рэпрэзентацыі месца для сапраўды вартых твораў і творцаў айчыннай культурнай прасторы? Зноў жа словы Прэзідэнта на Усебеларускім народным сходзе: "Творы літаратуры, музычнага, выяўленчага, тэатральнага і кінамастацтва пакліканы садзейнічаць фарміраванню каштоўнасцей беларускага грамадства, выяўляць духоўны вопыт нацыі". Маем узор такога выяўлення ў лепшых узорах поўных і часам кароткіх "метраў" між стужак "Летапісу". І ў якасці завяршэння: "Наша мэта — не самаізаляцыя, не супрацьстаянне іншым культурам, а ўзаемадзеянне і ўзаемаўзбагачэнне", — сказаў у час ўсебеларускага форуму Кіраўнік дзяржавы. Пра гэта і тэксты аўтараў "К".

Мастыхін

Таямніца таго, як і чаму ўзнікаюць дынастыі мастакоў, дасюль застаецца неразгаданай. Мабыць, само паветра сямейнага жыцця спрыяе такой пераемнасці. Суквецце талентаў прысутнічае амаль у кожнай знакамітай фаміліі. Вось і акварэлістка Святлана Курашова, якая пасля заканчэння мастацка-графічнага факультэта Віцебскага педінстытута шмат гадоў выкладае ў Гомельскім мастацкім вучылішчы, гэтым разам у Светлагорскай карціннай галерэі “Традыцыя” імя Германа Пранішнікава паказвае творчыя здабыткі не толькі свае, але таксама і мужа Генадзя ды сына Алега.

Генадзь Курашоў. “У зімовым лесе”.


Святлана Курашова. “Дзень шыпшыны”.

“Выдыхнуць” фрэскавасць у “Нітцы перлін”

Мастакоўскае трыа Курашовых выставілася ў Светлагорску

Алег Курашоў. “Успаміны пра мора”.

Здавалася б, сама яна, пасля таго як неаднойчы прыемна здзіўляла сваёй таленавітасцю аматараў выяўленчага мастацтва Беларусі, Расіі, Польшчы, Германіі, Эстоніі, Літвы, Фінляндыі, ужо нічога новага, нечаканага паказаць не можа. Але сапраўдны талент заўжды непрадказальны. Думаю, калі б канцэртмайстар Кіеўскай музычнай акадэміі Ірына Жукава, якая ў свой час пакінула ў нашай кнізе водгукаў такі запіс: “Геніяльныя акварэлі! Гэта цуд, шэдэўр, прыгажосць! Не жадаю Вам поспеху, бо ён Вам і так наканаваны. Вялікі дзякуй!”, пабачыла цяперашнюю экспазіцыю, то яшчэ з большым імпэтам пагадзілася паўтарыць свае словы.

І сапраўды, захоўваючы асноўныя якасці акварэлі — чысціню фарбаў, колераў, эфектныя размывы, жывую трапятлівасць каларыту, Курашова дасягае чагосьці большага, уласцівага толькі ёй. А гэта — уменне выклікаць звышрэальнасць або чаканую нечаканасць. Колькі даводзілася бачыць карцін розных мастакоў, якія не здолелі дасягнуць гэтай звышрэальнасці. І тады каларыстычнае святло, у лепшым выпадку, так і заставалася на карцінах. А ў Святланы Львоўны яно не толькі ў самім творы, але і зыходзіць з яго каляровым паветрам у нашы позіркі. Так адбываецца, калі бачыш яе “Флоксы” — белае і пунсова-сіняе дыханне гэтых кветак, або “Півоні” — на светлым, таксама паветраным фоне. І сапраўдным цудам праяўляюць сябе “Мокрыя астры”. Пяшчотна белыя і цнатліва ружовыя, яны, здаецца, толькі-толькі пабывалі пад асвяжальным дажджом і ўсё яшчэ застаюцца празрыста-вільготнымі. Наогул, якіх толькі кветак няма ў гэтай сапраўды аранжарэйнай экспазіцыі Курашовай! Тут і “Блакітныя гартэнзіі”, і “Бэз”, і “Лілеі”, “Лясныя званочкі”, “Вячэрняя шыпшына”, букет “Ранішняга цыкорыя”…

Самыя розныя думкі і пачуцці ўмее перадаць мастачка самотнай і радаснай, засяроджанай і шчырай, някідкай і затоенай прыгажосцю кветак. Кампазіцыйная разняволенасць (і гэта ў нацюрмортах!), пранікнёная шматкаляровасць і нейкая казачная натуральнасць робяць іх непаўторна прывабнымі. Зрэшты, Святлана Львоўна даўно і таленавіта эксперыментуе ў акварэлі. Шэраг твораў — жанравыя. У іх крыху менш традыцыйнай акварэльнай празрыстасці і чысціні, але затое з’явілася нейкая таямнічая фрэскавасць, стылізаваная абагульненасць жаночых вобразаў, якія, здаецца, прыйшлі да нас з аддаленага часу. Пад словамі “змяшаная тэхніка” мастачка ўтойвае нешта большае, чым яны звычайна азначаюць. Відавочна, што яна знайшла нейкія новыя выяўленчыя магчымасці ў, здавалася б, традыцыйным, стагоддзямі асвоеным “самым хуткім” жанры выяўленчага мастацтва. Аб гэтым разважаеш, калі бачыш такія творы, як “На балконе”, “Веснавы анёл”, “Вандроўнік”, “У тумане”, “Залінейная вуліца”, “Вечар на ўскраіне”, “Чырвоная веранда”, “Дажджлівы дзень”…

Жыць і працаваць побач з выдатным майстрам і не паддацца пераймальнаму ўплыву, мабыць, проста немагчыма. І тым не менш, Генадзь і Алег Курашовы, мяркуючы па іх экспазіцыях у рамках сямейнай выставы, пазбеглі такой, здавалася б, немінучай спакусы. Я доўга не мог адвесці позірк ад Генадзевай карціны “Сябрам, якія адышлі”. Уся яна ў нейкім вільготным руху. Цягучыя, калярова-цьмяныя струменьчыкі, што сцякаюць з нябеснай вышыні, невытлумачальным чынам узнімаюць сабой кветкі памяці, аддаючы іх тым, чые душы ўжо на нябёсах. Неяк не хочацца думаць пра тое, як зроблены або “выдыхнуты” гэты твор. Зноў жа, за словамі “змяшаная тэхніка” — таямніца, разгадваць якую не хочацца. Хай застаецца. Акварэльная неакварэльнасць? Прыкметы манатыпіі або акватыпіі? Якая розніца! Галоўнае тое, што ў карціне жыве развітальны боль з тымі, каго адначасова забіраюць зямля і неба.

Пачуццёвасць твораў Генадзя Курашова адразу ж адчувальная і ў “Халоднай зіме”, і ў “Гарачыні”, і нават у “Начных кветках”. А мастак, што імкнецца пісаць адчуванні, заўжды набліжаецца да звышрэальнасці. Гэта ж, дарэчы, пабуджае да творчасці і іх сына Алега, які ўжо шмат гадоў працуе захавальнікам фондаў гомельскай Карціннай галерэі Гаўрыіла Вашчанкі. А для назіральнага таленту такая праца можа замяніць гады вучобы нават у мастацкай акадэміі. І па назвах яго напісаных алейнымі фарбамі карцін можна меркаваць аб вышыні мэт, якія ён ставіць перад сабой. Вось толькі некаторыя: “Хутка верасень”, “Нацюрморт у цёплым святле”, “Нітка перлін”, “Нацюрморт са старым блюдам”, “Успаміны пра мора”, “Пах кавы і руж”… Адчуваеце? Імкненне заўважыць незаўважнае, увасобіць неўвасабляльнае — зноў жа, звышзадача кожнага сапраўднага мастака. У лепшых творах Алег Курашоў дасягае мэты. Фарбы на гэтых карцінах дыхаюць, рухаюцца і, здаецца, не толькі выпраменьваюць святло, але і самі прывабліваюць яго шматкаляровасць.

Так, мастакоўскае трыа Курашовых — розных па стылёвых прыхільнасцях — аб’ядноўвае нешта такое, чаго нельга знайсці ў фарбах, пэндзлях, нават у самых патаемных сакрэтах майстэрства. Гэта мастакоўскае стаўленне да жыцця. А ў іх яно — роднаснае. Таму і зладжана ззяюць фарбы сямейнай экспазіцыі.

Ізяслаў КАТЛЯРОЎ, мастацтвазнаўца
Светлагорск

Раскадроўка

У маі рэжысёр Вольга Дземка прэзентавала на Беларусі свой фільм “Песні старой Еўропы — старажытныя беларускія народныя песні”. Вольга калісьці спявала ў гурце “Гуда”, потым з’ехала ў ЗША. Пяць гадоў таму яна адзняла на Палессі матэрыял, мантаж якога сёлета завяршыла. Гэта, бадай, першы англамоўны дакументальны фільм, які апавядае пра беларускія спевы.

Алена ЛЯШКЕВІЧ

Нашы песні старой Еўропы

Гераіні фільма Ева Прыходзька і Ганна Сакалоўская з вёскі Іванава слабада Лельчыцкага раёна.

З фільма англамоўны глядач, які не ведае нічога ні пра Беларусь, ні пра тутэйшыя спевы (на такога Вольга арыентуецца ў першую чаргу), дазнаецца пра найбольш істотныя даты беларускай гісторыі, пра тое, як песні збераглiся скрозь стагоддзі, як адрозніваюцца ад рэгіёна да рэгіёна, пра што ў іх пяецца. У апошняй частцы фільма, “Песні сёння”, можна пабачыць фрагменты выступаў гуртоў-пераймальнікаў аўтэнтычнай манеры выканання і тых, хто перапрацоўвае фальклор, сумяшчае яго з іншымі стылямі музыкі.

У Беларусі адбыліся два вялікія публічныя паказы “Песень старой Еўропы…” — у мінскай галерэі “Tut.by” і ў Полацкім дзяржаўным універсітэце. Галоўнымі ж Вольга лічыць паказы для герояў фільма з вёсак Тонеж, Іванава Слабада і Стадолічы Лельчыцкага раёна і Дзятлавічы Лунінецкага (на жаль, некаторых герояў стужкі ўжо няма сярод нас). А, напрыклад, у Старым Сяле пад Жабінкай адбыўся індывідуальны паказ для адной з бабуль.

Першы ж паказ фільма прайшоў таксама ў Штатах. Наведалі на яго збольшага імігранты з Еўропы, “карэнных амерыканцаў” было няшмат. Таму пытання “А дзе ж гэта Беларусь?” ні ў каго з наведвальнікаў не ўзнікла. Праўда, у Сіэтле, што знаходзіцца на Заходнім узбярэжжы ЗША, дзейснай беларускай суполкі няма. (Найбольш актыўная беларуская дыяспара ў амерыканскім Нью-Ёрку, а таксама ў Канадзе. Дарэчы, выступ гурта з Таронта “Яваровы людзі” таксама можна пабачыць у фільме.)

Экспедыцыю ў Лельчыцкі раён у 2011-м Вользе дапамаглі арганізаваць журналістка Рэгіна Гамзовіч і фалькларыстка Любоў Сівурава. “Мы паехалі разам з даследчыцай Ірынай Мазюк, я паглядзела, як яна размаўляе і паводзіць сябе з бабулямі. Палешукі адразу прымалі мяне за сваю: раней я кожнае лета бавіла ў бабулі ў Столінскім раёне. Праз 20 хвілін першага запісу мы ўжо працавалі ў розных пакоях, а нешта здымалі разам”, — кажа рэжысёр.

Вольга апавядае, што матэрыял некалькі гадоў чакаў мантажу. У выніку ў “Песнях старой Еўропы…” — фрагменты абрадавых спеваў, каментарыі шматлікіх экспертаў: этнамузыколагаў Тамары Варфаламеевай і Дарынкі Шапавалавай, згаданай Любові Сівуравай, а таксама даследчыцы Ганны Сілівончык, Вікторыі Міхно з гурта “Гуда”, Алега Хаменкі з “Палаца”, Івана Кірчука з “Тройцы”. Фільм вельмі яркі (ёсць нават анімацыйныя застаўкі), захоплівае гледача і не адпускае да самага канца (а ідзе роўна гадзіну). Вольга кажа, што драматургія прадумвалася на ўзор фільмаў канала “BBC”, каб утрымаць гледача ля экрана да канца, не даць націснуць на паўзу. Некаторыя часткі кшталту паэтычных заставак і пейзажных замалёвак здымаліся ў ЗША, дзе адшукаўся балоцісты куток, па ландшафце падобны да Беларусі.

Вольга спадзяецца, што яе твор трапіць на экран і паспрыяе вядомасці Беларусі ў свеце. Таксама Дземка хацела б, каб фільм паказалі па беларускім тэлебачанні, каб бабулі пабачылі сябе “ў тэлевізары”. Але для гэтага патрэбны менеджар у нашай краіне, бо сама рэжысёр займацца мясцовым пракатам пакуль не плануе.

Вольга Дземка са сваім гуртом “Volya” выступае на фестывалях этнічнай музыкі. Разам з Вольгай спяваюць беларускія песні магістр этнаграфіі і фалькларыстыкі Дарынка Шапавалава з Балгарыі, што скончыла Універсітэт культуры і мастацтваў у Санкт-Пецярбургу, магістр музыказнаўства Вольга Сухавер, выпускніца Акадэміі музыкі імя Гнесіных у Маскве, на скрыпцы грае армянка Рая Асрыянц, што навучалася ў Інстытуце імя Шнітке ў Маскве, а зараз працуе над ступенню магістра ва Універсітэце штата Вашынгтон у ЗША. Фрагменты выступаў дзяўчат можна пабачыць у “Песнях старой Еўропы…”

Вольга вельмі ўдзячная ўсім носьбітам традыцый, экспертам і гуртам, што здымаліся ў фільме і дапамагалі ў арганізацыі экспедыцый. Спадзяецца, што калі-небудзь здыме фільм ужо не пра спевы, а пра абрады, якія захоўваюцца ў жывым бытаванні ў Беларусі.

К

Другі год запар выстава інсталяцый пад адкрытым небам “Арт-астравы” знаходзіць прытулак на адной з выспаў Камсамольскага возера ў Мінску. Папярэдняя мела добры розгалас, таму ў сёлетняй удзельнікаў больш. Сцвярджаецца, што леташнія “Арт-астравы” наведала недзе з паўмільёна чалавек. Падумалася, чым жа гэта пасярод спякотнага лета, якое для мастацтва лічыцца “мёртвым сезонам”, мастакі здолелі прывабіць столькі публікі?

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Фрагменты экспазіцыі.

Калі чалавек не ідзе ў музей, дык музей…

Каб забяспечыць досыць спецыфічную выставу такой колькасцю гледачоў, патрэбны геніяльны менеджар. Такі досвед трэба ў акадэміях вывучаць! Аказалася, што ўсё досыць проста: выставу разгарнулі літаральна … на пляжы. Так, у спякотны дзень уся зялёная прастора вакол возера віруе чалавечым мурашнікам. Прыходзяць людзі на прыроду адпачнуць ад гарадскога тлуму — у ваду акунуцца, пазагараць, халоднага напою выпіць, ну і на творы мастацтва між іншым вока кінуць.

Я не іранізую. Гэта правільны ход. Два чыннікі працэсу наблізіліся адзін да аднаго, а як гэта адбылося — справа другасная. Калі народ не ідзе да мастацтва, дык мастацтва мусіць ісці ў народ. Сёлетнія “Арт-астравы” прыйшліся мне даспадобы. Тое ж самае, але выстаўленае ў залах Нацыянальнага мастацкага музея ці якойсці галерэі, падалося б недарэчным. А тут, на тле зменлівай прыроды, у выкананні з танных матэрыялаў (пластык, тканіна, бляха…) не разлічаныя на вечнасць інсталяцыі глядзяцца як родныя. У прыродзе няма нічога вечнага. І калі спецыяльна не займацца кансервацыяй і рэстаўрацыяй згаданых штучных аб’ектаў, не дбаць пра адмысловыя ўмовы іх захавання, жыцця ім — на адзін сезон.

Выкажу меркаванне, што на гэтай выставе цікавасць і каштоўнасць маюць не столькі самі арт-аб’екты, але эстэтычныя канцэпцыі, у іх закладзеныя. Мінск — горад, у архітэктуры і пластычнай аздобе якога чуецца мелодыя барока, водгулле класіцызму, эфектныя ноткі хайтэку. Гэта ў канцэптуальным сэнсе не наша вынаходніцтва, а высакаякасны імпарт, адаптаваны да нашай рэчаіснасці і менталітэту. Натуральна, усвядоміўшы сваю геапалітычную значнасць і культурную ўнікальнасць, Мінск прагне новай эстэтыкі, якая выразна вылучала б яго з шэрагу іншых сталіц і мегаполісаў. Каб знайсці новы вобраз, трэба эксперыментаваць.

Але аддаваць пад мастацкія эксперыменты каштоўную прастору цэнтра, якая ў асноўных рысах ужо склалася эстэтычна і функцыянальна, ніхто не збіраецца. Для гэтага ёсць іншыя пляцоўкі — тыя ж “Арт-астравы”. Цалкам магчыма, што тут нараджаецца эстэтыка, якая недзе праз дзясятак гадоў можа стаць вызначальнай у фарміраванні вобраза горада.

Некаторыя з прадстаўленых на “Арт-астравах” аб’ектаў вартыя таго, каб іх ужо сёння перавялі ў больш трывалы матэрыял і пашукалі ім месца ў гарадскім асяроддзі. Ужо не адзін год сярод архітэктараў і мастакоў ідзе гаворка пра неабходнасць стварэння ў Мінску Парка скульптуры па аналогіі з тымі, што ёсць у іншых сталіцах і мегаполісах. Меркавалася, што такі своеасаблівы музей пад адкрытым небам мог бы размясціцца на тэрыторыі, што прылягае да Нацыянальнай бібліятэкі альбо побач з Музеем-майстэрняй Заіра Азгура. Мне ж падаецца, што калі гэта ідэя і будзе рэалізаваная, дык дзе-небудзь у паркавай зоне сталіцы. Магчыма, менавіта на выспах Камсамольскага возера, дзе паціху прыжываецца не вельмі звыклае для нашай грамады мастацтва, з часам з’явяцца не толькі зменныя, але і сталая экспазіцыя сучаснай пластыкі. Мне думаецца, гэта было б лагічна, бо зялёная прастора паміж комплексам Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Палацам Незалежнасці набывае для горада ўсё большую значнасць і каштоўнасць. Варта падумаць пра тое, каб яе не толькі добраўпарадкаваць, але і зрабіць культурна насычанай. Хай яно так і будзе: прыехаў чалавек пасля работы на возера адпачыць, а аказалася, што яшчэ і ў музеі пабываў, на які звычайна часу няма.

К

У “Алісе ў Краіне Цудаў” Льюіса Кэрала ёсць такі дыялог. “Куды вядзе гэта дарога?” — пытаецца Аліса ў аднаго з насельнікаў чароўнай краіны. “А куды табе трэба патрапіць?” — замест адказу пытаецца той. “Не ведаю”, — кажа Аліса. І чуе: “Тады якая табе розніца?” Гэта не такая ўжо рэдкая жыццёвая сітуацыя, калі чалавек нешта робіць спантанна, рэфлектыўна, без плана і мэты, не думаючы пра наступствы. Калі рэфлексуе мастак, гэта называецца творчым эксперыментам.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Вандроўка па стужцы Мёбіўса

“Агасфер” Уладзіміра Ламейкі і іншыя экспанаты выставы.

Не скажу, што выстава “Год скульптуры”, што нядаўна праходзіла ў сталічнай Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага, — суцэльная рэфлексія, што на ёй адсутнічалі творы, канцэптуальна акрэсленыя. Было на выставе тое, што чапляе вока і вярэдзіць думку. Праўда, усё гэта вельмі суб’ектыўна. Адна справа, калі ты не адзін год назіраеш за эвалюцыяй творчасці таго ці іншага аўтара, і, адпаведна, эстэтычны код яго ных работ для цябе больш-менш зразумелы. У дадзеным выпадку тое датычыцца пластыкі Віктара Копача (“Троіца”, “Стан”), Уладзіміра Рудкоўскага (“Казка ў месяцовую ноч”, “Гукі”, “Джокер”), Андрэя Вераб’ёва (“Еднасць”), Уладзіміра Слабодчыкава (“Успамін 1”, “Успамін 2”), Юрыя Анушкі (“Дзень і ноч”), Максіма Петруля (“Контрбаланс”). І зусім іншае, калі аўтар табе малавядомы. Ды ўсё ж, работа сведчыць сама за сябе, і каб адрозніць арыгінальную ідэю ад кампіляцыі, плён роздуму ад рэфлексіі, вялікага досведу не трэба: у мастацтве ўсё празрыста.

Паспаліты глядач і прафесіянал, як мне падаецца, мусілі ўспрымаць выставу па-рознаму. Там, дзе дасведчаны ў мастацтве чалавек убачыць праявы ідэйнага крызісу, пагрозу распылення творчасці як з’явы сутнасна грамадскай на прыватныя дробязі, глядач звычайны, магчыма, ухваліць тэматычную разнастайнасць твораў і стылёвую раскаванасць мастакоў. Будзе свой аматар і свой крытык на біблейскія матывы ў Дзяніса Кандрацьева (“Адам і Ева”), філасафізмы Сяргея Більдзюка (“Апошні воін”), іранічнае ўвасабленне багемнасці Уладзімірам Стальмахавым (“Паэт”), язычніцкі містыцызм Аляксея Сарокіна (“Нараджэнне Дажджбога”). Асабіста я ні ў якім разе не стаўлю пад сумнёў сур’ёзнае стаўленне да працы ўзгаданых аўтараў. Аднак, мне думаецца, што пры канцэптуальнай размытасці экспазіцыі, адсутнасці цэльнасці і зусім някепскія рэчы ўспрымаюцца не лепшым чынам — і не самадастаткова, і не фрагментарна.

Марына Капілава. “Арбалет”.

Некаторыя з прадстаўленых у экспазіцыі работ больш пасавалі б выставе іншага творчага цэха. Гэта кампазіцыі са шкла Настассі Калінскай і Жанны Мурозавай, парцаляна Вольгі Сямашка і Ганны Амбросавай, абстрактная пластыка з дрэва з ухілам у гістарычную тэматыку Уладзіміра Ламейкі. Даўно гавораць, што канкрэтнае паняцце “скульптура” паступова падмяняецца няўцямнай “пластыкай”, і што да гэтага працэсу трэба ставіцца спакойна, але ўсё ж такі я не стаў бы раней часу зносіць “памежныя слупы” відавых крытэрыяў.

Шэраг работ знаёміў гледачоў з замежнай экзотыкай культурнага і этнаграфічнага зместу. Гэта “Маоры” Дзмітрыя Комлева і “Маска шамана” Валерыя Малахава. А ў іншым шэрагу даволі выразна прасочваюцца стылістычныя аналагі, на якія арыентуюцца аўтары. Гэта “Радэн” Алега Варвашэні, які прымушае ўзгадаць Бурдэля, “Чырвоны шалом” Ігара Засімовіча, што ўзнаўляе ў памяці работы Генры Мура, “Аляксандр Пушкін” Мікалая Дробыша, які нагадвае і Анатоля Анікейчыка і расійскіх аўтараў, што багата папрацавалі на Пушкініяну.

Чамусьці работы ў традыцыйнай рэалістычнай стылістыцы, такія як “Балота” Аляксандра Батвінёнка і “Казімір Семяновіч” Івана Міско, глядзеліся даволі самотна. Падобна на тое, што проста рэалізм без выразнага ўхілу ў нейкі бок ужо не надта цікавы грамадзе, а значыць, і самі мастакі яго не надта шануюць.

Я распачаў нататкі развагамі пра канцэптуальную неакрэсленасць самой выставы, праз якую ўдзельнікі становяцца падобнымі на тую самую Алісу, што вандруе ў нікуды па ніякай дарозе. На дзіва, на выставе быў твор, які даволі выразна ўвасабляў прыгоду менавіта такога кшталту — “Агасфер” Уладзіміра Ламейкі: маленькі чалавек, што брыдзе па колу бясконцай стужкі Мёбіўса. Гэта стужка мае толькі адну паверхню. Рухаючыся па ёй, нікуды не патрапіш. Зрэшты, таксама эксперымент…

К

Дыпломнікі-2016

Маладыя рэжысёры...

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 7.)

Ці Дзмітрый Цішко — рэжысёр народнага драматычнага студэнцкага тэатра БДУ “На балконе” і рэжысёр фестывалю студэнцкіх тэатраў “Куфар” — які зладзіў прэм’еру па п’есе Пятра Гладзіліна “Каханне як мілітарызм”. Яму дастаўся самы цяжкі варыянт: рэпеціраваць не са студэнтамі ці зацікаўленай тэатральнай моладдзю, а спрэс з народнымі ды заслужанымі артыстамі. Да гонару маладога рэжысёра трэба зазначыць, што з пастаўленай задачай ён справіўся.

Антон Макуха ставіў дыпломны спектакль у Акадэміі, запрасіўшы на ролі прафесійных акцёраў з Купалаўскага і Тэатра Беларускай арміі. “Машыністкі” па п’есе амерыканскага драматурга Мюрэя Шызгала стаў першым спектаклем у партфоліа Макухі. Ім пачатковец у прафесіі ў першую чаргу хацеў адказаць самому сябе, ці здатны ён на ролю пастаноўшчыка. Засведчу: спроба годная і даволі перспектыўная.

Рэпетыцыя “Снежнай каралевы” ў Сахалінскім тэатры лялек.

Найбольш яскравае ўражанне ў дзяржкамісіі выклікаў дыплом Віталя Краўчанкі. Як падкрэсліў тэатральны крытык Вячаслаў Ракіцкі (дарэчы, адзіны за ўсе бачаныя мной экзамены рэцэнзент, які прыйшоў падтрымаць свайго падапечнага), прыйсці на прапанаваную пляцоўку проста, большага каштуе самому прабіцца ў незнаёмы калектыў! Віталь — адзіны з курса, хто паставіў прэм’еру на вялікай сцэне. Спектакль па п’есе Аляксея Казанцава “Браты і Ліза” стаў у рэпертуары Магілёўскага драматычнага тэатра адным з найбольш запатрабаваных. Старшыня дзяржкамісіі кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт, загадчык кафедры тэатральнай творчасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Расціслаў Бузук зазначыў, што з чатырох курсаў толькі ў Краўчанкі ў спісе літаратуры да дыплому значыцца больш за паўсотні літаратурных крыніц. “Многія рэжысёры-пачаткоўцы дарэмна пазбягаюць вялікай колькасці крыніц, думаючы, што іх галоўная задача — спектакль паставіць. Забываюцца, што заглыбіцца ў п’есу, зразумець аўтара можна толькі тады, калі дасканала вывучыш шматлікія літаратурныя і гістарычныя матэрыялы, што яго датычацца”, — падкрэсліў Расціслаў Леанідавіч.

На дзіва, таленавіты хлопец застаўся без сталага месца працы… Маючы вольны дыплом, ён не журыцца, выношвае безліч творчых планаў на бліжэйшы год, галоўны рэжысёр Магілёўскага драматычнага Саўлюс Варнас настойліва кліча яго да сабе. Дэкан тэатральнага факультэта Уладзімір Мішчанчук паабяцаў прыкласці ўсе намаганні, каб Віталь знайшоў сабе годнае прымяненне: “Нас асабліва ўразіла грунтоўнасць ва ўсім, абдуманасць, яго чалавечая і творчая пазіцыя! Тут бачныя культура і разуменне, уменне весці дыялог на навуковым узроўні. Гэта дазволіла дзяржкамісіі ў парадку выключэння выдаць дыплом з адзнакай з адпаведнай выпіскай у пратаколе”. Я таксама спадзяюся, што Віталь не згубіцца ў айчынных абшарах і знойдзе пляцоўку для плённай працы. А чытачоў папрашу запомніць імёны ўсіх сёлетніх выпускнікоў: штосьці мне падказвае, што мы яшчэ неаднойчы сустрэнем іх у тэатральных афішах краіны.

Фота з сайтаў тэатраў

К

Журналісцкі аўтатур газеты "Культура"

Перспектыва: музейная экспансія

Ідэя, якую можна памацаць

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Аказалася, гэта чылійская вавёрка — людзі ў Мінску аддалі, што называецца, у "добрыя рукі". Чаму заморская? Беларуская вавёрка ў няволі жыць не захацела і пачала маркоціцца.

Няхай не слухаюць нас "зялёныя", але астатнія хвастатыя звяркі прысутнічаюць у дзвюх экспазіцыйных залах у выглядзе чучал. Пэўныя экспанаты можна мацаць рукамі. Падрабязна расказана, якімі вавёркі бываюць у свеце, а якімі — у Беларусі. Што ядуць, якое жытло робяць, з кім сябруюць? На ўсе гэтыя пытанні бераставіцкія «вавёрказнаўцы» даюць дакладныя адказы. Прэзентуецца геральдыка свету з выявамі сімпатычнага звярка. Усё астатняе месца займаюць сувеніры ў выглядзе вавёрак. Калекцыя, якая ці не штодня папаўняецца, прыцягвае асаблівую ўвагу.

Чылійская вавёрка.

Гатовы музей і да міжнароднага супрацоўніцтва. Выйшлі музейшчыкі на сваіх калег у Зеленаградзе пад Масквой, дзе ў доме культуры створана невялікая экспазіцыя, прысвечаная вавёрцы. Звязаліся і з Германіяй, дзе на гербе камуны Ноенкірхен таксама прысутнічае вавёрка. Ды не адна, а цэлых тры. Вось толькі пакуль не атрымалася высветліць, ці ёсць там тэматычны музей. Нараджаюцца ў музеі і свае жарты. Так, дзеці, якія прыязджаюць у Бераставіцу з Гродна, часцяком пытаюцца ў сваіх настаўнікаў: а калі ў Гродне з'явіцца музей аленя?

Аднак музейшчыкі займаюцца не толькі сустрэчай турыстаў, але і самымі разнастайнымі праектамі. Мікалай Пацэнка пахваліўся сваім: у сёлетні Год Культуры рыхтуецца да выдання кніга "Культурныя традыцыі Бераставіччыны XIX — XX стагоддзяў". Пра іншыя задумы работнікаў культуры Бераставіцы крыху пазней.

(Не)лірычнае адступленне Яўгена Рагіна

Я даўно не атрымліваў такога задавальнення. Нібыта ў дзяцінства вярнуўся. У нас у гомельскім парку ля Палаца Паскевічаў і Румянцавых вавёркі да сёння ручныя. Калі не дасі якога пачастунку, будуць доўга лаяцца з галін і кідацца разлаванa шалупіннем. Згадаўся і Музей мышы на расійскай Яраслаўшчыне. Ён быў створаны пры народным музеі, а цяпер мае сем структурных падраздзяленняў: скансэн, музей рэтратэхнікі з адпаведным традыцыйным фэстам, муніцыпальны турыстычна-адукацыйны комплекс… Нават газета "Мышгорад" выпускаецца! Неаспрэчна адно: музейшчыкам Бераставіцы трэба рэгулярна здзіўляць грамадства цікавымі праектамі, скіраванымі на ўмацаванне брэнда. І справа не толькі ў аднаўленні папуляцыі вавёрак.

Касцёл у Бераставіцы.

Аляксандр Галавач.

Старадаўні герб Бераставіцы.

Падчас мерапрыемства ў РЦК.

Нераскручаны касцёл

Астатнія дзве залы прысвечаны гісторыі пасёлка і раёна. Мы пачалі наракаць, што пра вавёрку тут ні слова, ні выявы. Абяцалі сітуацыю выправіць. Вавёркі калісьці адчувалі сябе ў Бераставіцы паўнапраўнымі жыхарамі. Кажуць, нават па гандлёвай плошчы падчас кірмашу маглі прабегчыся ў пошуках ласунку. Значыць, выява яе неўзабаве ўзнікне на рэканструкцыі кірмашовага эпізоду. Вавёрка і ў час Вялікай Айчыннай вайны, ёсць сведчанні, дапамагала нашым снайперам адшукваць "зязюль" — фашысцкіх стралкоў, што займалі пазіцыю на дрэвах! І пра гэты эпізод трэба абавязкова распавесці ў музейным фармаце.

Гэта хрэстаматыйны гісторыка-краязнаўчы музей адносна лёгка стварыць, а брэндавы — тут моцна думаць варта. Але мэты апраўдваюць сродкі. Ужо цяпер з выкананнем плана па аказанні культурных паслуг у Музея вавёркі праблем няма. А турысты едуць з многіх краін свету. Час ужо і за гасцініцу брацца!

Тым больш, у музейшчыкаў шмат задум. Парк вавёркі ля музея з каваным флюгерам ужо зроблены. Неўзабаве тут высадзяць алешыну. А вось экскурсія (пешая ці веласіпедная) па горадзе — пакуль у планах. Сапраўды, трэба ж і старасвецкі парк паказаць, дзе калісьці вавёркі жылі без праблем, і вадаёмы, і помнік з выявай звярка, і касцёл Адведзін Найсвяцейшай Панны Марыі XVII стагоддзя, створаны ў стылі ранняга барока па фундацыі Гераніма Хадкевіча. Так, гэта той касцёл, які мясцовым энтузіястам не ўдаецца закансерваваць, і дзе, апавядаюць, Кастусь Каліноўскі ўпотай друкаваў "Мужыцкую праўду".

Мы пагаджаемся, гістарычны цэнтр мястэчка, дзе касцёл, возера,

---

Бярозаўшчына /

Музыка тыдня

Стала традыцыяй у дзіцячай школе мастацтваў Бярозы наладжваць святочны Тыдзень музыкі. Для горада гэта значная культурная падзея. Сёлета на ёй былі прадстаўлены ўсе жанры: вакальна-харавы, аркестравы, харэаграфічны, ансамблевы.

"Гэтая імпрэза, — паведамляе дырэктар школы Ірына Шуляк, — патрабуе адметнага падыходу. Кожны вечар мы спрабуем рабіць непадобным да папярэдняга. Складнікамі дзеі сталі справаздачныя канцэрты ўзорных калектываў, харэаграфічнае свята і, так бы мовіць, "універсітэт культуры", на якім спрабуем пашырыць музычны кругагляд публікі. А ёсць яшчэ імпрэзы для выхаванцаў Цэнтра карэкцыйнага развіццёвага навучання і рэабілітацыі. Выступаем і ў дзіцячых садках філіялаў ДШМ Сяльца і Здзітава". Адкрыў Тыдзень музыкі супольны канцэрт узорнага ансамбля гарманістаў "Картузіяне" і ансамбля народнай песні "Забавушка". Дзякуючы высілкам кіраўнікоў гэтых калектываў Ігара Сірычніка і Марыны Жырковай атрымалася арыгінальная тэатралізацыя. Вольна і артыстычна трымалася на сцэне самая юная салістка Ефрасіння Жыркова.

Сёлета мы запрасілі да сябе лаўрэата міжнародных конкурсаў баяніста Трафіма Анціпава. Ён, дарэчы, з'яўляецца членам журы 17 міжнародных конкурсаў, тры з якіх праходзяць пад яго непасрэдным патранатам. З новай праграмай выступіў хор "Ветразь надзеі", якім больш за 30 гадоў разам з канцэртмайстрам Ірынай Курачкінай кіруе Любоў Рабава. Складанасць працы з дзіцячым калектывам у тым, што склад хору мяняецца і трэба з кожным навічком пачынаць працу з азоў.

А "ўніверсітэт культуры" быў прысвечаны гэтым разам жыццю і творчасці Міхала Клеафаса Агінскага. Канцэрт узорнага ансамбля "Бярозка" быў незвычайны тым, што ў яго склад ўвайшлі 35 прадстаўнікоў розных аддзяленняў, якіх аб'яднала дырыжор Наталля Кайровіч.

Завяршыў Тыдзень музыкі канцэрт народнага аркестра народных інструментаў "Мелодыя вясны", якім кіруе Марына Рудзь.

Валянціна ОСІПАВА

Віцебск / "Наіўныя" мастакі прэзентуюць

У Віцебску адкрылася V Нацыянальная выстава наіўнага мастацтва "Insita-2016", прысвечаная 120-годдзю з дня нараджэння Алены Кіш, адзінай беларускай мастачкі, імя якой увайшло ў "Сусветную энцыклапедыю наіўнага мастацтва" (утрымлівае звесткі пра 800 найбольш вядомых мастакоў-прымітывістаў свету).

У экспазіцыі выстаў, што размясціліся ў Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці, абласным краязнаўчым музеі і Доме кіно, змешчана мноства работ разнастайных стыляў і напрамкаў. Усяго ж у выставе наіўнага мастацтва прынялі ўдзел больш за 60 аўтараў з Віцебскай, Магілёўскай, Брэсцкай, Гродзенскай абласцей, а таксама — з Расіі, Літвы... Скажам, калекцыю работ прадставіла і маскоўская галерэя "АртНаіў" (адзіная ў Расіі, што прэзентуе наіўнае і аўтсайдарскае мастацтва), якая сёння мае каля тысячы твораў як расійскіх, так і замежных аўтараў. Работы з яе фондаў, прадстаўленыя на выставе ў абласным краязнаўчым музеі, нядаўна былі паказаны ў Парыжы.

З беларускага боку на выставе прадстаўлены работы Антаніны Маісеевай з Віцебска, магіляўчаніна англійскага паходжання Пітэра Хіксана, Лідзіі Шпектар з Гродна, Андрэя Кандрацюка з Брэста і іншых. Як адзначыла кандыдат мастацтвазнаўства, галоўны мастак Віцебскага АМЦНТ Людміла Вакар, на выставе шырока паказаны і традыцыя маляванкі, якую працягваюць Ірына Церашкова, Жанна Ільюшкіна, Святлана Скавырка.

Наведаць V Нацыянальную выставу наіўнага мастацтва "Insita — 2016" можна будзе і падчас мерапрыемстваў XXV Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску".

Андрэй СТРУНЧАНКА, вядучы метадыст Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці

На людным месцы: аглядавая пляцоўка

Музыка тыдня гучала ў Бярозе.

Падчас адкрыцця выставы "Insita-2016".

На сцэне — узорны ансамбль танца "Чабарок".

Падчас прэзентацыі праекта "75 гадоў з пачатку Вялікай Айчыннай вайны" ў Лідзе.

Мікалай Пацэнка: "Вось дзе жыве вавёрка".

Алена Місюля.

парк, зачыненая пакуль гасцініца, павінен стаць музейным філіялам. Ад такой экспансіі — толькі выгоды, і культурныя, і эканамічныя. Прынамсі, з аналагічным амбіцыйным музейным праектам мы падчас аўтатураў яшчэ не сустракаліся. Дай бог яго аўтарам вытрымаць усе выпрабаванні ды застацца першымі, паспяховымі і перспектыўнымі. Хто ведае, можа праз час Бераставіцкі музей займее філіял і ў Белавежскай пушчы…

У РЦК ёсць лазартаг

Мы патрапілі ў Цэнтр культуры, калі скончыўся навучальны год. Школькнікі ўтварылі радаснае шэсце па райцэнтры, а потым сабраліся ў РЦК на тэатралізаванае відовішча. А мы тым часам сустрэліся з кіраўніком установы Аленай Місюля. Пра новую структуру юрыдычных асоб мы пісалі ў папярэдняй публікацыі. Дадамо, што пры цэнтральнай клубнай установе дзейнічае і арганізацыйна-метадычны аддзел: два метадысты працуюць, адна вакансія. Знаная фалькларыстка Марыя Юшкевіч пайшла на пенсію. На замену прыедзе дзяўчына пасля Гродзенскага каледжа мастацтваў.

Больш сур'ёзная праблема ў тым, што не ва ўсіх клубах раёна ёсць камп'ютарная тэхніка. З дадатнага пачулі пра тое, што існуе пры РЦК аматарскае аб'яднанне "Вінт", што ладзіць фестываль "Бераставіца запрашае сяброў". Калі разабраліся, у чым сутнасць "Вінта", доўга не маглі зразумець, чаму крэатыўная штогадовая фестывальная справа мае досыць традыцыйную назву. А сутнасць "Вінта" ў тым, што ён аб'ядноўвае аматараў мадэляў катараў ды самалётаў з дыстанцыйным кіраваннем.

А яшчэ з паслуг раённых клубнікаў ёсць лазартаг, ці — лазарны пейнтбол. Абсталяванне дапамаглі набыць СВК раёна. Адзін гульнявы камплект на дзве гадзіны каштуе ў выхадныя і святочныя дні сто тысяч рублёў, у будні — на дзесяць тысяч танней. Паслуга карыстаецца попытам. Мы пра такую ва ўстановах культуры раней не чулі.

(Не)лірычнае адступленне Кастуся Антановіча

У пошуках матэрыялаў зазірнуў на сайт Бераставіцкага РЦК. Найперш зацікавіла інфармацыя з прайсам на паслугі. Налічыў 43 пазіцыі, падзеленыя ў адпаведнасці са структурнымі падраздзяленнямі ўстановы. Апрача тыповых, кшталту "Набор тэксту на камп'ютары", зацікавіла прапанова зладзіць эстрадны канцэрт за пяць мільёнаў рублёў — самая дарагая. Але чаму б ёй не скарыстацца, скажам, падчас вяселля, адмовіўшыся ад пракату дарагіх лімузінаў. Не хапае грошаў — за паўтара мільёна работнікі ўстановы зладзяць музычнае суправаджэнне свята. Няма жадання жаніцца — тады за дваццаць тысяч у месяц цябе могуць навучыць працаваць з глінай. Словам, прапаноў багата — былі б грошы і жаданне.

Рамесніцкія будні

У будынку РЦК месціцца і Раённы цэнтр рамёстваў. Даруйце, не Цэнтр, а ў адпаведнасці з новым структурным дзяленнем — раённы аддзел рамёстваў і традыцыйнай культуры, які ўзначальвае Тамара Касьян. Але ад змены назваў праблемы не знікаюць. Памяшканні малыя. Высветлілася, што не ад добрага жыцця майстры пераехалі летась у будынак Цэнтра культуры і народнай творчасці. Цяпер у іх карыстаніі адзін пакой, дзе месца хапае і для працы з дзецьмі, і на сваю дзейнасць, і нават на невялікую выставу.

Цікавы момант: на майстар-класы прыязджаюць да майстроў бібліятэкары і сельскія работнікі культуры, каб самім навучыцца і арганізоўваць у сябе курсы і гурткі, бо запатрабаванасць на такія паслугі ў народу маецца.

Агледзеліся. Сувеніраў з выявамі вавёркі, мясцовага касцёла — шмат, а вось з Кастусём Каліноўскім — ніводнага. Дырэктар Музея вавёркі кажа, маўляў, гэта сапраўды ідэя, і штосьці запісвае ў нататнік. Мы, відаць, прысутнічаем пры зараджэнні новага сувенірна-музейнага праекта.

Гістарычна склалася, што традыцыйныя рамёствы Бераставічыны — вышыўка, ткацтва, карункапляценне. Вось толькі зараз у аддзеле рамёстваў прадстаўлены збольшага кераміка і саломкапляценне. Не ўбачылі ў пакоі ні гарчарнага кола, ні ткацкага станка — няма ні ўмоў, ні спецыялістаў. Замовілі выпускніка, але той не даехаў — забралі ў армію. Тым не менш, працы ў майстроў хапае: на заняткі да іх запісана 37 дзяцей. Апроч таго, на лета запланавана шмат выздаў на разнастайныя святы па ўсёй вобласці.

Агульнае (не)лірычнае завяршэнне

Абяцаем наведаць Музей вавёркі праз некалькі гадоў. Цікава, ці займее ён вагу сярод іншых раённых устаноў! Ці з'явяцца за гэты час музеі квасу, мёду, журавін, музеі лесавіка, лазніка і, скажам, млынара ў іншых кутках рэспублікі? Закінутых млыноў па краіне — процьма, а ў рабочым стане даводзілася бачыць толькі адзіны — у аграгарадку Жодзішкі Смаргонскага раёна. К

Абрад ваджэння куста ў вёсцы Мяркулавічы.

ф о т а ф а к т

19 чэрвеня, на першы дзень Троіцы, найбольш вядомай як свята зеляніны ("зялёныя святкі"), калі галінкамі дрэў бадай па ўсёй Беларусі ўпрыгожваюць двары і хаты, у Мяркулавічах Чачэрскага раёна вадзілі Куста. На дзяўчыну, якая сёлета скончыла школу, навязалі зеляніны столькі, што ісці яна магла толькі з дапамогай сяброўкі. Зрабілі вялікі вянок, які неслі за кустом асобна. Ведучы куста, зайшлі паспяваць на падворак, дзе гаспадары вынеслі на вуліцу стол і падрыхтавалі пачастунак. Вялікі вянок пусцілі на ваду. Потым куміліся: прасілі адно ў аднаго прабачэння, цалаваліся тры разы праз вянок, зняты з галавы, праходзілі за рукі пад звязанымі бярозкамі. У Мяркулавічах амаль не засталося старажылаў, якія добра памяталі б, як вадзілі Куст даўней. Звесткі захаваліся дзякуючы работнікам культуры, што паспелі апытаць носьбітаў традыцый.

20 чэрвеня, на другі дзень Троіцы, у Навінках Калінкавіцкага раёна пераносілі свячу. Для вёскі гэта вялікая падзея. Асноўная частка прысутных — жыхары Навінак ды іх сваякі. Ёсць і паломнікі: людзі, што не маюць каранёў у Навінках, прыязджаюць адмыслова, каб узяць удзел у абрадзе, з суседніх вёсак і Гомелю. Як распавяла "К" дырэктар Раённага цэнтра культуры Алена Цурко, раён рыхтуе дакументы для надання абраду пераносу свячы ў Навінках статусу нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці Беларусі.

Фота Алены ЛЯШКЕВІЧ

Абрад пераносу свячы ў Навінках.

Бабруйск / Натхнёнасці крыніца

Справаздачныя канцэрты — свята для многіх жыхароў Бабруйска, якія з'яўляюцца прыхільнікамі майстэрства Заслужанага аматарскага калектыва Рэспублікі Беларусь тэатра песні "Шына-най" (кіраўнік Ала Яфіменка), узорных харэаграфічнага калектыву "Крынічка" (Маргарыта Асіпенка), ансамбля танца "Чабарок" (Лізавета Калпакова) і харэаграфічнай студыі "Бабраня" (Сяргей Лукашэвіч), студый сучаснай харэаграфіі "Грацыя" (Кацярына Іванова), усходняга — "Аміра" і арабскага танца "Шахрызад" (Анжаліка Прахарэнка).

Сезон справаздачных канцэртаў у зале Палаца мастацтваў адкрыў тэатр песні "Шына-най". У праграме прагучалі лепшыя кампазіцыі ў ансамблевым ды сольным выкананнях. Спявалі і даўно ўлюбёныя артысты (да прыкладу, Яўген Гушча і Віталь Гардзей).

Справаздачны канцэрт "Крынічкі" і "Грацыі" называўся "Энергія танца". Глядач убачыў зусім новыя харэаграфічныя пастаноўкі. А "Чабарок" зрабіў стаўку і на праверaныя часам нумары. Справаздачны канцэрт студыі "Бабраня" быў прысвечаны непаўторнай прыгажосці харэаграфічнага мастацтва. Менавіта ёю вызначалася феерыя харэаграфічных замалёвак і кампазіцый.

У праграме справаздачнага канцэрта студый усходняга і арабскага танца прынялі ўдзел старэйшая, сярэдняя і малодшая групы. Бліскучыя экзатычныя касцюмы дадавалі відовішчу раскошы.

Наталля ЧОРНАЯ,
загадчык арганізацыйна-метадычнага аддзела Палаца мастацтваў Бабруйска

Горкі / Сонечныя пейзажы

На персанальную выставу жывапісу мастака з Горак, майстра пейзажу Мікалая Рыжова, якая працуе ў выставачнай зале на вуліцы Болдзіна ў Магілёве, я прыйшоў выпадковым наведвальнікам. Хоць многія палотны майстра знаходзяцца ў прыватных калекцыях і музеях Беларусі, Расіі, Польшчы, Латвіі, Германіі, Італіі, Францыі, я пачуў яго імя ўпершыню.

"Хочацца назваць гэту выставу сонечна-залатой, — заўважыла педагог-мастак, дацэнт Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Івана Шамякіна Валянціна Заброцкая, — бо ад карцін Мікалая Рыжова сыходзяць пяшчотныя промні. Мастак недарэмна выбраў лесіровачны метад пісьма. Ён даў магчымасць зрабіць фарбы празрыстымі, стварыць уражанне шматяруснасці колераў".

На палотнах — любыя і дарагія куточкі прыроды Магілёўшчыны, Гомельшчыны, Віцебшчыны. Аўтар для кожнага твора знаходзіць выразную дэталь, падбірае адпаведную гаму колераў. Карціна "Восень на Дзвіне" вабіць яркасцю фарбаў. Здаецца, жоўтым полымем гарыць зарослы дрэвамі пагорак на беразе ракі, а вада пакрыта жоўтай лістотай. Белы катар ля берага, як успышка сонца. На другім палатне гарыць белай квеценню адзінокая яблыня-дзічка, а вакол — светла-зялёная траўка радуецца цёпламу вясноваму дню. На карціне "Лютаўскія промні" — бярозавая алея, на снезе шырокімі палоскамі адбіваюцца промні сонца. Аднак яны яшчэ не такія яркія, як звычайна: прадвесне.

Кожны пейзаж мастака — асенні, зімовы, вясновы або летні — дыхае сонечным святлом, радуе цеплынёй фарбаў, мае жыццесцвярджальны сэнс.

Аляксей СОЛАХАЎ,
кандыдат філалогіі, дацэнт Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Івана Шамякіна

Ліда / 75 гадоў таму

Лідская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы арганізавала Дзень музея "75 гадоў з пачатку Вялікай Айчыннай вайны". Праект рэалізаваны сумесна з Занальным дзяржаўным архівам у Лідзе і мясцовым гісторыка-мастацкім музеем.

Праграма ўключала музычны пралог, мультымедыйную прэзентацыю, выставу літаратуры. Асноўнай стала музейная экспазіцыя "Праз вайну, праз памяць, праз лёсы". Кожны экспанат — рэліквія, бо частка прадметаў узята з прыватных калекцый пастаянных чытачоў райбібліятэкі: асабістыя рэчы салдат, рэшткі зброі і амуніцыі, хатні рыштунак, плакаты, газеты, брашуры.

Старшы навуковы супрацоўнік музея Настасся Каладзяжная распавяла пра пачатак Вялікай Айчыннай вайны ў Лідскім краі. Цягам дня наведвальнікі маглі пазнаёміцца з архіўнымі матэрыяламі, якія прэзентаваліся на выставе "Сляды вайны".

Дар'я МАРЦІНКЕВІЧ,
загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Лідскай раённай бібліятэкі імя Янкі Купалы

Ганцавіччына / Занатуй у дзённік

На Ганцавіччыне прайшоў абласны фестываль-конкурс "Маладзёжны квартал-2016". Цэнтральная раённая бібліятэка імя Васіля Праскурава таксама прыняла ўдзел у свяце. У літаратурнай гасцінай была арганізавана сустрэча з пісьменнікамі Валерыем Гапеевым і Святланай Локтыш. Мерапрыемства адбылося ў рамках рэспубліканскага праекта "Кніга.by".

Праект быў створаны па ініцыятыве Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі і Саюза пісьменнікаў Беларусі для прапаганды чытання і кнігі, актыўнага далучэння моладзі да культурна-асветніцкай дзейнасці бібліятэк. Удзельнікі сустрэчы — маладыя людзі, якія любяць і паважаюць роднае слова, кнігу.

Творчасць Валерыя Гапеева добра знаёма чытачам Ганцавіччыны. Яго аповесці "Ведзьміна тоня", "Пастка для рыцара", "Урокі першага кахання" і іншыя добра чытаюцца не толькі падлеткамі, але і дарослымі, актыўна абмяркоўваюцца ў розных аўдыторыях. І гэта не дзіўна. Аўтар у сваіх творах апавядае пра жыццё і праблемы сучасных падлеткаў, апісвае злабадзённыя пытанні, з якімі яны сутыкаюцца штодня. Яго творы кранаюць і захапляюць, інтрыгуюць, прымушаюць задумвацца і хвалявацца. Валерый Мікалаевіч, як высветлілася, не толькі добры пісьменнік, але цудоўны суразмоўца, які ўмее захапіць аўдыторыю.

Святлана Локтыш — аўтар зборніка вершаў "Вышыванка". На сустрэчу яна прынесла свой дзённік, які пісала ў падлеткавым узросце, распавядала пра даўно мінулыя падзеі жыцця. Святлана раіла маладым людзям занатоўваць уражанні ад кожнага дня. Паэтка не толькі чытала вершы, але і спявала. Госці вечарыны адказвалі на пытанні і на памяць аб сустрэчы пакінулі аўтографы на сваіх кнігах з фондаў бібліятэкі.

Таццяна МАЛЯЎКА,
загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Ганцавіцкай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы

Як пераняць… забытае

Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей правёў летнюю школу "Майстэрня падвойнага ткацтва". Удзельнікі з'ехаліся з Гродна, Мінска і Слоніма, выкладалі ж мясцовыя майстрыхі і рамесніцы з абласнога цэнтра. Пра Гудзевіцкі музей і ткацтва "К" пісала ў № 40 за 2015 год, таму гэтым разам асветлім толькі саму падзею і датычныя яе акалічнасці.

Дываны падвойнага ткацтва.

Алена ЛЯШКЕВІЧ,
Мінск — Мастоўскі раён — Мінск

Удзельнікі ў час летняй школы ткалі на чатырох кроснах, адзін станок нават самі заправілі. Канешне, за такі кароткі тэрмін цяжка засвоіць складаную тэхналогію падвойнага ткацтва. Навучэнцам дапамагалі ў гэтым дырэктар музея Кацярына Басінская і майстрыха Вера Белакоз. З Гродна прыехалі выкладаць кіраўніца ткацкай майстэрні мастацкай студыі "Суквецце талентаў" Гродзенскага палаца творчасці дзяцей і моладзі Марына Камінская і гаспадыня галерэі рамёстваў "Ткалля" Яўгенія Станіна. Удзельнічала таксама майстрыха па вырабе габеленаў Алена Шунейка, творчасць якой мае статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці Беларусі. У музеі акурат экспанавалася выстава яе габеленаў, вырабы мастачкі на беларускую тэматыку:

Падчас летняй школы ткацтва ў Гудзевічах.

гістарычныя будынкі Гродна, выявы валадароў Вялікага Княства Літоўскага, сялянкі… У сваёй творчасці Алена Шунейка выкарыстоўвае і тэхналогію падвойнага ткацтва, што таксама мае статус каштоўнасці.

Асноўная частка навучэнцаў — сябры Студэнцкага этнаграфічнага таварыства і ўдзельніцы гуртка па ткацтве пад кіраўніцтвам Наталлі Дзейка ў Мінскім палацы творчасці дзяцей і моладзі. Некаторыя ўдзельнікі летняй школы ўжо мелі пэўны вопыт ткацтва, але можна было павучыцца і "з нуля". Гэта — не першая летняя школа па падвойным ткацтве ў музеі, а ў планах — доўгатэрміновы летнік, каб кожны мог паўдзельнічаць у запраўцы кросен і выткаць невялічкі фрагмент, кшталту сурвэткі.

Дзякуючы ўдзелу ў праекце "Вандроўка ў этнаказку" ў рамках праграмы транспамежнага супрацоўніцтва "Польшча — Беларусь — Украіна" былі адрамантаваны музейныя памяшканні, пакладзена плітка на падворку каля хаты XVIII стагоддзя, перавезенай з вёскі Семірэнкі. "Мы разумеем, што плітка — не самы лепшы варыянт для нашага падворку і зусім не аўтэнтычны, — кажа дырэктар музея Кацярына Басінская, — але ж у дажджлівае надвор'е яна добра ратуе: вада сцякае, наведвальніцы ў шпільках не скардзяцца". У хаце, акрамя звыклых экскурсій, ладзяць гульнёвыя праграмы для груп. Часцей такія праграмы замаўляюць для школьнікаў.

Маленькія і вялікія наведвальнікі могуць пабачыць у гудзевіцкай хаце шмат цікавостак, якія сустрэнеш не ў кожным этнаграфічным музеі: рагач на калёсіках, кацуба (прылада для мяшання страў у печы), драўляная качарга, шкляная мухалоўка, вешалка з каровінага рогу, школьная торбачка, каса з лукам (скарыстоўваўся, каб збожжа клалася роўна). Партрэт жа Францішка Скарыны так і застаўся вісець на покуці замест абраза з часоў ваяўнічага атэізму. Музей захоўвае двухасноўны ходнік з гудзевіцкай царквы, што датуецца 1932 годам. Урэшце, шмат цікавага можна пабачыць у хатах жыхароў Гудзевічаў. Напрыклад, птушынае крыло, якім, мабыць, дасюль вымятаюць печ, ці грамнічную свечку, што стаіць на покуці ў жыце круглы год. А вось падвойны дыван у звычайнай хаце сустрэць тут складана: тэхналогія была забытая мясцовымі жыхарамі пасля Другой сусветнай вайны. Адноўленая ўжо ў 1990-х музейшчыкамі, у тым ліку Верай Белакоз, якая ездзіла па сакрэты да Ядвігі Райскай у Індуру пад Гродна.

Навучэнцы плануюць распаўсюджваць атрыманыя веды ў Мінску: пры згаданым этнаграфічным таварыстве дзейнічае гурток па ткацтве. Дзяўчаты пачыналі ткаць ходнікі, потым перайшлі да тканін з узорамі. Перадача ведаў "з рукі да рукі" ў галіне традыцыйных рамёстваў бадай самая эфектыўная. Можна разабраць тэхналогію, канешне, па кніжцы ці, дзякуючы дасяжнасці тэхнікі, па відэазапісе. Але дробязі, сапраўдныя сакрэты майстэрства, застаюцца незаўважанымі, іх лепш пераймаць ад майстра жыўцом.

К

А наперадзе — "беларускія пагоркі"?

Яшчэ два гады таму Антон Сіманкоў разам з сябрам Дзмітрыем Цішко шукаў добрае месца для рэалізацыі ўласнай задумы музычнага фэсту пад адкрытым небам у цэнтры Мінска. І знайшоў. У маі адбыўся ўжо другі па ліку фестываль вулічнай музыкі "Месца пад сонцам", а ўсё лета мінчан і турыстаў радуе "Пешаходка" — яшчэ адзін творчы праект упэўненага і жыццярадаснага Антона (упершыню "К" пазнаёміла з ім у № 35 за 2015 год). Пра тое, як "сабраць" усе аспекты, каб у выніку "нарадзіўся" фестываль, ён распавёў "К".

Вольга РОПАТ

Дзе знайсці ўдзельнікаў?

З чаго я пачынаў? Спачатку праглядаў колькасць падпісчыкаў на выканаўцаў у сацыяльнай сетцы. Потым зразумеў, што ёсць гурты "крутыя", але вэб-аматраў у іх мала. І калі на першы фестываль вулічнай музыкі "Месца пад сонцам" браў усіх, то для другога фэсту ўжо выбіраў удзельнікаў (было дзесьці 100 заявак).

"Пешаходка" — новы праект, які аб'ядноўвае розныя віды мастацтва (тэатралізаваныя прадстаўленні, танцавальныя праграмы, майстар-класы, зараз займаюцца распрацоўкай паэтычнага кірунку), і другім арганізатарам штотыднёвага мерапрыемства з'яўляецца Уладзіслаў Пінчук. У нашай камандзе строгі падзел абавязкаў. І гэта ўсё — за ідэю. І рады я, што ёсць людзі, якія ўдзельнічаюць на валанцёрскіх пачатках. Але на ўсё патрэбны сродкі. І для таго, каб патраціць іх з карысцю на тую ж рэкламу, афішу, для арэнды абсталявання, кагосьці цікавага запрасіць з музыкантаў…

Пра спонсара

Не хапае спонсарскай падтрымкі, але я не хачу прадаваць ідэю фестывалю. Урэшце, калі знойдзецца сталы фундатар, то трэба будзе з ім гэта нейкім чынам вырашаць. Важна разумець: фестываль — тваё дзіцё. Я яго нікому не аддам. Можа, калі-небудзь і зменяць ягоную назву, напрыклад, "Месца пад сонцам 3.0" — не ведаю… Але мой фестываль пойдзе разам са мною.

Дабрачыннасць

На дабрачыннай інтэрнэт-пляцоўцы "MaeSens" ёсць праект "Галоўнае жаданне", дзе публікуецца спіс з жаданнямі дзяцей. Мы выбіраем, якое з іх зможам здзейсніць на сабраныя ад праведзенага мерапрыемства сродкі. Пакуль што выбіраем простае — самакат, магнітны канструктар, касцюм супер-героя… Але здзейснілі і больш "маштабныя" мары. Дзяўчынка Віка паедзе ў Маскву на сустрэчу са спявачкай Нюшай. А сямігадовай Каці падарылі сінтэзатар.

Для мяне камфортная абстаноўка, калі ўсё — у "агні". Урэшце, каб нам год таму не дапамаглі ва ўпраўленні ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі адміністрацыі Маскоўскага раёна сталіцы, магчыма, сядзеў бы зараз і гуляў у "Контру". І яшчэ. Пакуль не пачнеш штосьці рабіць і верыць у свае сілы — нічога не атрымаецца. І калі мне скажуць: "Антон, можа, не атрымаецца!", я цяпер адказваю — "Паглядзім!".

Падчас фестывалю вулічнай музыкі "Месца пад сонцам" у дворыку сталічнага Археалагічнага музея.

Геаграфія "Пешаходкі"

Мне прапанавалі ў Гродна прывезці фестываль. Але я за межы Мінска амаль не выязджаю, таму для мяне пакуль нерэальна вывезці фестываль у іншы горад. Тым больш, добрае месца абрана — ведаю акустыку Верхняга горада, магчымасці гэтага гістарычнага месца, дзе турыстаў багата. Адзін мужчына кожную суботу хадзіў, мабыць, стаў фанатам "Пешаходкі". А потым ён расказаў, што да яго нядаўна прыязджалі знаёмыя з Галандыі. Ён ім паказаў мерапрыемства — і галандцам вельмі спадабалася. Значыць, і такім чынам пашыраецца геаграфія "Пешаходкі".

"Месца пад сонцам" не аддам

Вельмі хочацца запрасіць замежных музыкантаў. Хто будзе першым? "Mujuice". Альбо "Дэльфін". Можа, яшчэ "Onuka". Канешне, хочацца зрабіць штосьці больш маштабнае. Як прыклад — расійскі фестываль "Пустыя пагоркі", які першапачаткова быў аматарскім. Упершыню фестываль адбыўся ў лесе, прыйшло 300 чалавек. А потым стаў паступова пашырацца. Там добрыя пляцоўкі, платформы адпавядаюць тэматыцы, добрае тэхнічнае забеспячэнне…

К

Сцэнарыст "Кінаматара" Кшыштафа Кеслеўскага, акцёр у "Распарадчыку балю" і "Шанцы" Фалька, "Без наркозу" Вайды, "Годзе спакойнага сонца" Занусі, "Новых амазонках" і "Дэжа вю" Махульскага, "Шраме" і "Спакоі" таго ж Кеслеўскага — далёка не поўны пералік яскравых роляў Ежы ШТУРА, слыннага польскага кінематаграфіста, сябра Еўрапейскай кінаакадэміі, сцэнарыста, акцёра і рэжысёра. Яго дэбют у апошнім кірунку адбыўся яшчэ ў 1994 годзе: "Спіс грэхаводніц". Апошняя карціна майстра — "Грамадзянін", якая выйшла на экраны ў 2014 годзе, да гэтай пары падарожнічае па свеце, атрымліваючы адзнакі на кінафорумах. Нельга забыцца і на тэатральную дзейнасць Штура, якая ўключае працу ў галоўных спектаклях Анджэя Вайды.

Што ёсць для Ежы Штура патрыятызм, акцёрства, як ён ставіцца да правакацыі і камедыі — наша гутарка закранула не толькі бягучыя справы славутага творцы.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ,
Мінск— Кракаў— Мінск

Сустрэча аглядальніка "К" са славутым акцёрам адбылася ў рамках прэстура па польскіх музеях, і гэта была адмысловая падзея, арганізаваная па просьбе беларускіх журналістаў. "Пане прафесоре" сустрэў нас у Кракаўскай дзяржаўнай вышэйшай тэатральнай школе, дзе ён зараз выкладае (і кіраўніком якой, дарэчы, быў двойчы), і распавёў пра стварэнне новага спектакля для польскага тэлебачання. "У мяне з'явілася магчымасць папрацаваць над класікай — гэта п'еса Аляксандра Астроўскага "Лес", — дзеліцца ён, — і

На выставе "Разам" прадстаўлены творы беларускіх і літоўскіх мастакоў. Выстава ладзіцца ў рамках супрацоўніцтва Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў з Пасольствам Літвы ў Беларусі і галерэяй літоўскага саюза мастакоў "Арка".

Вольга РОПАТ

Выстава "Разам" сабрала розных па светаўспрыманні, характары і настроі творчасці сучасных літоўскіх і беларускіх творцаў. Літоўскі бок прадстаўлены жывапісам. Вылучаецца "Ніда" Эйгірдаса Круопіса, які змог паказаць сіне-ружовай колеравай гамай і энергічнымі шырокімі мазкамі стыхію. А

У рытме Штура



“Кіно для мяне — гутарка пра надзённае”

я з радасцю ўзяўся за прапанову”.

Іншая справа — камедыя

— Спадар Ежы, наколькі сённяшні глядач зацікаўлены ў класіцы?

— У нашага тэлебачання ёсць такі абавязак — адукоўваць гледача, а не ўвесь час паказваць тое, што ён хоча. Я не праслаўляю тэлевізійных формаў кшталту серыялаў, а вось місію накшталт тэлетэатра падтрымліваю. Класіку трэба абараняць! Два гады таму я зрабіў “Рэвізора” Гогаля, і сёння, дарэчы, гэты спектакль глядзяць у школах. Моладзь ужо не чытае Гогаля, але паглядзець яшчэ здольная. Што да сучасных тэм, то для мяне гэта ўжо не тэлевізійныя формы, а — кіно і тэатр. Сёння ў тэатры “Палонія” ў Варшаве я граю ў трох п’есах, праўда, сярод іх ёсць той жа “Мядзведзь” Чэхава. Зрабіў і пастаноўку па п’есе Тадэвуша Ружэвіча “На карачках”… Кіно ж для мяне — не касцюміраваныя гістарычныя стужкі, а гутарка пра надзённае.

— Ваш апошні фільм “Грамадзянін” распавядае пра лёс грамадзяніна камуністычнай і посткамуністычнай Польшчы. Чаму для вас было важна зрабіць падобную карціну?

— Тое была спроба аналізу пакалення Польшчы пасля Другой сусветнай вайны. Маё пакаленне мела вельмі цікавае жыццё: пачаць яго пад помнікам Сталіна (у фільме ёсць гэта сцэна), усё вытрымаць, пражыць і дачакацца свабоды. Калі параўнаць з французамі, англічанамі тых часоў, — неверагоднае жыццё. Магчыма, толькі сербы і харваты, на зямлі якіх адбывалася вайна, могуць "пахваліцца" такой пакручастай гісторыяй. Але адна справа распавесці пра гэта сур’ёзна, пафасна — што ў Польшчы дапушчальна, вітаецца, а іншая — зрабіць з таго назірання камедыю. Колькі ў мяне было праблем! Двойчы адмовілі ў фінансаванні, але я трошкі пазмяняў пэўныя моманты, і паволі зрабіў карціну. Крытыка фільма была моцнай: нацыяналістычныя газеты папракалі мяне, што я жартую з такой сур’ёзнай тэмы, але на шчасце, на яго пайшоў глядач! І сёння “Грамадзянін” паглядзела паўмільёна чалавек: для некамерцыйнай карціны — прыстойная лічба. Фільм меў і добры фестывальны лёс. Нядаўна вось быў у Румыніі…

— Крытыка тычылася менавіта выбару камедыйнага жанру?

— Так. Сёння ў нас актуальная дыскусія, што такое патрыятызм. Ці значыць гэта быць прыхільнікам нашай гісторыі? Але крытык — таксама можа быць патрыётам, я не бачу ў гэтым супярэчнасці. Я — з гэтай краіны, чаму я мушу глядзець на пэўныя рэчы з захапленнем? Для нашай цяперашняй улады культура — больш папулісцкі складнік, маўляў, яна павінна быць зразумелай усім. Але культура можа быць рознай. У тым ліку высокай — і гэта зусім не пагроза ці праблема.

Грамадзянін Еўропы

— Для беларусаў у дачыненні да гісторыі найбольш трапнай для мяне з’яўляецца фігура “сведкі”. А ваш герой падзей у стужцы— хто ён? Усё ж удзельнік гісторыі?

— Удзельнік — так, але лёс, вецер гісторыі робіць з ім, што хоча. Нават падчас камунізму ў Польшчы мой герой хоча быць лаяльным да ўлады. Ды нават гэта ён не можа рэалізаваць. Нават так: ён хоча быць удзельнікам, але ў яго не атрымліваецца. Улада заўжды аказваецца супраць яго, якая б яна ні была. Дарэчы, многія прыклады ў фільме — аўтабіяграфічныя, з маёй, так бы мовіць, curriculum vitae.

— А сёння вы адчуваеце сябе ўдзельнікам гісторыі?

— Не, сёння я ўжо гляджу на ўсё з аддалення. Апошняй вялікай падзеяй сталася для мяне далучэнне Польшчы да еўрапейскай прасторы. Чакаў гэтага моманту ўсё жыццё. Бо адчуваю сябе больш грамадзянінам Еўропы, чым уласна Польшчы. У мяне было шмат магчымасцей з’ехаць: мая жонка — скрыпачка. Я шмат дзе працаваў, асабліва ў Італіі, дзе быў узнагароджаны за якасць акцёрскай працы. Але не хацеў жыць на Захадзе — мне хацелася быць там і тут. Магчыма, гэта таму, што я — з Кракава. А яго культура — сярэднееўрапейская. Калісьці Кракаў быў пад уладай Аўстрыі, Аўстра-Венгрыі — вось і сумесь традыцый. Менавіта таму я адчуваю сябе больш “мідлеўрапейцам”, чым чыстым палякам.

— А што тады для вас Польшча?

— У першую чаргу, мова. Самы важны для мяне культурны складнік — тое, што я размаўляю на польскай мове. Калі мяне запрашаюць працаваць на захад, напрыклад, выкладаць акцёрскае майстэрства студэнтам, заўжды пытаюся: а магу я паставіць польскую п’есу? Дзе б я ні аказваўся, заўсёды імкнуся прапагандаваць польскую культуру. Калі ёсць магчымасць, прапаноўваю польскага аўтара — Мрожака, Гамбровіча, Віткевіча… Тое — і ёсць Польшча для мяне. Ды яшчэ — падаткі.

Камедыя — больш складаная!

— Адна з вашых знакамітых роляў — кантрабасіст у монаспектаклі па п’есе Патрыка Зюскінда “Кантрабас”. Вы іграеце яе ўжо 31 год. Цікава, як вы сёння разумееце свайго героя?

— Ён змяняецца разам са мной, вядома. Калі я зараз бачу фрагменты ранейшых спектакляў, скажам дваццацігадовай даўніны, мяркую: “О! Як дрэнна!” Герою Зюскінда ў п’есе 37 гадоў. Я пачаў граць яго, калі мне было столькі ж. І вось увасабляю да гэтай пары, хоць і не так часта. Галоўная праблема гэтага характару: чаму ён іграе на гэтым цяжкім інструменце ў апошнім шэрагу? Чаму ён не саліруе? Чаму так адбываецца? Сёння я граю боль героя ўжо як успаміны. Не барацьба! Жыццё бывае такім, што ты ў апошнім шэрагу… Такая трансфармацыя адбылася.

— Напэўна, гэта пытанне вам часта задавалі, але якую ролю больш складана ўвасабляць: драматычную ці камедыйную?

— Камедыйную. Камедыйны жанр мае штосьці такое, чаму ты не можаш навучыцца, — рытм. У тэатры рытм залежыць толькі ад мяне, а ў кіно — у тым ліку і ад мантажора. Я памятаю, як граў у “Новых амазонках”: пасля здымак хадзіў у мантажную, і ўжо персанальна перад мантажоркай іграў сцэны. І яна так уважліва глядзела, а потым: “А! Зразумела!”.

Калі ў нашай школе мой студэнт, да прыкладу, выконвае Гамлета, то я сяджу. І, не падымаючыся з крэсла, даю парады. Але калі робім камедыю… “Добра, давай я табе пакажу”, — і выходжу на сцэну. Гэта такая важная рэч: адзін распавядае жарт — і ніхто не смяецца, а іншы кажа той жа самы тэкст — і ўсе рагочуць. Справа ў рытме! Таму камедыя — больш складаная.

Сёння ўсё так “цёпла”

— Вашы работы — даволі правакатыўныя, выклікаюць дыскусіі, спрэчкі. А ці атрымліваеце вы задавальненне з той правакацыі, што закладваецца ў вашых работах?

— Гэта важнае пытанне. Я заўважыў, што маё пакаленне — гэта пакаленне бунту. Я бяруся за мастацкую справу, калі з чымсьці не згодны. Мой імпульс да стварэння — бунт. Потым ужо ідзе ўсё астатняе — праца над ідэяй, яе ўдасканаленне. І сёння я бачу, што ў маладых гэтага бунту няма. І тое праблема для мяне як для выкладчыка, для рэжысёра. Яны не маюць унутры сябе супраціўлення. Мы былі супраць камуністычнай улады — і бунт для нас быў станам натуральным. Ён быў у генах. З гэтага і нараджалася мая правакацыя. Падражніць… І не толькі я: выбітныя драматургі Гамбровіч, Мрожак… — яны таксама бунтары. А сёння ўсё так “цёпла”.

Хоць, здаецца, магу згадаць апошні бунт моладзі: калі хацелі змяніць закон аб інтэрнэце, каб улада магла кантраляваць сеціва. І моладзь выйшла на вуліцу. Аказваецца, ёсць яшчэ штосьці такое, што выклікае ў іх нязгоду.

— Вы дыктатар на здымачнай пляцоўцы?

— Усё залежыць ад выніку. Я чакаю канкрэтнага эфекту ад акцёра — і калі ён яго дае, шлях, які ён выбірае да мэты, можа быць якім заўгодна. Галоўнае для мяне, падкрэслю, — фінальны эфект. Калі яго няма, тады я пачынаю паказваць, умешвацца. Што да актрыс… Тут усё больш складана. Яны маюць у мяне больш свабоды. Я іх распытваю: “А як ты гэта пакажаш? А кантэкст?” Яны ведаюць сваю арганіку больш, чым я. Таму жаночыя партыі ў маім сцэнарыі маюць адкрытыя канструкцыі.

— Наш беларускі артыст Расціслаў Янкоўскі ў адным інтэрв’ю прызнаўся, што добры акцёр для яго — гэта малпа. Яна ўвесь час чапляецца за партнёра, рэагуючы на яго. Што для вас акцёрства?

— Гэта такая вартасць запамінання псіхічных станаў і потым іх далейшага адкрыцця па патрабаванні. Не тады, калі ты хочаш, а тады, калі хоча глядач. К

Разам і паралельна

маленькая аранжавая пляма надала твору, адначасова, жывасць і раўнавагу. Рамунас Дагіс паказаў восеньскую палітру — вохрысты, карычневы, малочны, бледна-жоўты, шэры, крыху блакітны — у рабоце “Восень на падыходзе”. Які вобраз на карціне? Можна толькі здагадвацца. Ёсць работы з марскімі матывамі — “Прыбярэжныя скарбы” (спалучэнне карычневага, сіняга, фіялетавага і аранжавага надаюць “трываласць”), літаральна дыхаюць “Прыморскі кантраст” і, уласна, “Марскі подых”. Спадабаўся і настрой работы Артураса Савіцкаса “Дзяўчына і цень”. Твор “халодны”, але ён не “адштурхоўвае”. Рысы твару галоўнай гераіні палатна не прапісаныя, але чамусьці добра ўяўляеш яе вобраз.

Беларускі бок больш разнастайны па прадстаўленых відах мастацтва. Сталыя наведвальнікі выстаў ужо звыкліся да шэравата-белых палотнаў Тамары Шэлест, але цяпер на выставе “Разам” можна ўбачыць дзве карціны Тамары ў колеры — “Вячэра” і “У першы клас”. Тое сталася нечакана, і, як па мне, захацелася нават “знізіць” гук некаторых колеравых спалучэнняў, каб яны не “перакрыквалі” арыгінальныя і запамінальныя вобразы. На карцінах Дзяніса Барсукова — горад (вядома, Мінск) — мяккі, душэўны, цёплы. Дзяніс не паказвае сталіцу шумным мегаполісам, з якога хочацца з’ехаць. Гэта горад мастака, створаны ўяўленнем і ўрыўкамі рэальнасці, тут жывуць адчуванні, успаміны, эмоцыі. Нягледзячы на жыццярадасную палітру, горад Барсукова замкнёны, засяроджаны на сабе і сваім унутраным стане. Анатоль Кузняцоў прадставіў фактурныя і не кантрасныя кампазіцыі з цыклу “Белая сюіта”. Уладзімір Парфянок у фатаграфіях паказаў надзённае — від з акенца на завод (“Гэта не ад мяне (нас) залежыць”), уключаны тэлевізар з кветкамі на стале, ад якіх падае смутак, цень (“Больш нічога не трэба, дзякуй”)… Цытаты да фатаграфій дапаўняюць і раскрываюць серыю “Лісты без даты”.

Ад тэматычнай (і не толькі) разнастайнасці твораў выстава не ўспрымаецца цэласным праектам. Тое можна прыняць з улікам яе міжнароднага характару. Ды слова “разам” усё ж такі прадугледжвае большую сувязь, на маю думку. К



Рамунас Дагіс. “Прыбярэжныя скарбы”.

Тамара Шэлест. “Вячэра”.

Шэсць колаў Коласа

Даплачваць шафёрам звыш зарплаты па 1000 рублёў, бачыць у аўтамабілі не раскошу, а жалезнага каня, які павінен служыць і не баяцца "чорнай" работы, дарыць машыны сябрам, а не калекцыянаваць іх нібы трафеі — гэта пра народнага паэта Якуба Коласа. Новая экспазіцыя Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея "У хвалях няспыннага руху: аўтамабільнымі шляхамі Коласа", якая адкрылася для наведвальнікаў 18 мая ў гаражы пісьменніка, знаёміць з невядомымі ці малавядомымі фактамі яго жыцця праз прызму аўтамабіляў.

Цэнтральны экспанат новай выставы.

Аліна САЎЧАНКА

Да персанальнай гісторыі праз канкрэтныя аб'екты

— Мемарыяльны музей, асабліва музей адной персоны, мае сваю адметнасць: гэта звычайна невялікія плошчы будынка, адсутнасць выставачных і лекцыйных памяшканняў, — кажа дырэктар музея Зінаіда Камароўская. — Таму выкарыстанне дадатковай прасторы, асабліва калі яна мае непасрэдныя адносіны да гаспадара дома і можа сыграць эмацыйную і інфармацыйную ролю, нам падаецца апраўданым і мэтазгодным.

Гаражы Якуба Коласа, пабудаваныя ў 1946 годзе побач з домам, заўсёды выклікалі цікавасць у наведвальнікаў. Ідэя стварыць экспазіцыю з'явілася год таму. Першапачаткова планавалася паказаць толькі аўтамабілі класіка і іх выкарыстанне, расказаць пра вадзіцеляў і адносіны Коласа да іх. Але ў працэсе падрыхтоўкі экспазіцыі, збору матэрыялаў, тэма раскрывалася шырэй і глыбей. З'яўленне кожнага аўтамабіля ў жыцці Якуба Коласа звязана з пэўнымі падзеямі ў гістарычным і палітычным жыцці краіны — рэпрэсіі 1930-х, якія не абышлі родных і блізкіх песняра, Вялікая Айчынная вайна, калі пісьменнік апошні раз пабачыўся са сваім сынам Юрыем, пасляваеннае адраджэнне краіны...

Асноўны наведвальнік гэтага музея — моладзь, школьнікі. Чым не нагода для стварэння чагосьці сучаснага, цікавага для любой аўдыторыі? Над экспазіцыяй працавала навукова-вытворчае прадпрыемства "Сатмэн" на чале з дырэктарам Георгіем Захарыкам.

"Дарэчы, з аўтамабіляў Якуба Коласа захавалася адна "Победа", набытая пісьменнікам для сям'і. Цяпер яна належыць унуку Якуба Коласа — Андрэю Данілавічу Міцкевічу", — кажа Зінаіда Мікалаеўна.

Плошча гаража невялікая, 30 квадратных метраў. Цэнтрам кампазіцыі стаў макет чорнай "ГАЗ М-1", якая была падаравана народнаму паэту ўрадам у 1936 годзе да 30-годдзя яго літаратурнай дзейнасці. Лабавое шкло аўтамабіля прыстасавана для дэманстрацыі архіўных матэрыялаў.

"Я ўдзячная Нацыянальнаму архіву, Цэнтральнаму навуковаму архіву Нацыянальнай акадэміі навук, Беларускаму дзяржаўнаму архіву-музею літаратуры і мастацтва за прадастаўленне цікавых матэрыялаў, сярод якіх заява культпрапа ЦК КПБ(б) аб забароне распаўсюджвання казкі Якуба Коласа "Як пеўнік курачку ратаваў" як контррэвалюцыйнай, знакаміты ліст Панцеляймона Панамарэнкі да Сталіна "Аб беларускай мове, літаратуры і пісьменніках", загад АН БССР "Аб замацаванні легкавых аўтамабіляў", згодна з якім пісьменнік атрымаў аўтамабіль "ЗіМ", — кажа візаві.

У аснове экспазіцыі — вобраз кола, ці круга. Колас некалі напісаў: "…І яшчэ памятай: адзначана кожнаму чалавеку прайсці нейкі круг жыцця, і покі той круг не пройдзены, ніхто з яго не выйдзе".

— І атрымліваецца, што тымі коламі наша жыццё перамолваецца. Вось адзін з прыкладаў: свой першы аўтамабіль Якуб Колас атрымлівае ў дар ад урада ў часы, калі спазнае абвінавачванні і чакае арышту, як і многія калегі, сваякі. У тагачасных дзённіках Колас зазначае, што забыўся, калі спаў распрануты і ўсміхаўся, — згадвае Зінаіда Мікалаеўна працу над экспазіцыяй.

Задума з экспазіцыяй апраўдала сябе. Наведвальнікі сапраўды ўбачылі пісьменніка з іншага ракурсу, не аблашчаным уладай — маўляў, глядзі, колькі машын. У архівах ёсць дакументы, дзе Колас пісаў, што стаміўся быць парадным генералам, але быў вымушаны хадзіць на пасяджэнні, рыхтаваць выступленні. Асабліва пасля вайны. "Таму машына была яму патрэбна хутчэй па службе, і дакладна не для прадстаўнічасці", — тлумачыць суразмоўца і дадае:

— Пры стварэнні экспазіцыі мы сутыкнуліся і з некаторымі складанасцямі. Напрыклад, з сістэмай ацяплення і тэмпературна-вільготным рэжымам. Таму падтрымліваем яго ўласнымі сіламі. Ды і арыгіналы дакументаў у гаражы мы вырашылі не выстаўляць, абышліся копіямі.

■■■

Пра акупнасць праекта пакуль што рана гаварыць, але гэта адбудзецца, перакананы ў музеі. "Цану на білет праз новую выставу не ўзнімалі, ён каштуе столькі ж, колькі і ўваход у музей", — зазначае спадарыня Камароўская.

К

■■■

У 1991-м некалькі мінскіх музыкантаў — вялікіх знаўцаў духавой музыкі, — сабраўшыся, задалі самі сабе пытанне: а чаму ў Беларусі няма дзяржаўнага духавога аркестра? Ва ўсіх краінах ёсць, а ў нас… Прафесіяналамі яны былі аўтарытэтнымі, ініцыятыўнымі, ведалі, у дзверы якіх кабінетаў грукаць, і неўзабаве такі аркестр з'явіўся. "Хросныя бацькі" далі яму назву "Няміга". Іх імёны — у летапісе беларускай музыкі: народны артыст РСФСР Леў Муранаў — прафесар Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, аранжыроўшчык і дырыжор аркестра Чырвонасцяжнай Беларускай ваеннай акругі; заслужаны артыст БССР Віталь Волкаў — таксама прафесар кансерваторыі, аранжыроўшчык, сябра Сусветнай гільдыі трубачоў. (Першы рабіў для аркестра аранжыроўкі да апошніх дзён жыцця, другі быў салістам і канцэртмайстрам "Нямігі", пакуль меў сілы трымаць трубу, а пасля на яго месца прыйшоў сын, таксама трубач.) Трэцяе імя ў гэтым шэрагу — Аркадзь Берын: ён прафесар той жа ВНУ, першы мастацкі кіраўнік і дырыжор "Нямігі". І па сёння ён прыязджае з-за мяжы, каб на радзіме правесці канцэрты ў выкананні славутых артыстаў сусветнага ўзроўню.

У калектыў адразу ж пацягнуліся салісты-інструменталісты: наш піяніст Ігар Алоўнікаў, з-за межаў рэспублікі — саксафаністка Маргарыта Шапашнікава, трубач Сяргей Накаракаў. Паспяваць пад новы аркестр захацелася і вакалістам: арыі з опер і балады выконвала Марыя Гулегіна — тады салістка нашай оперы, у будучым сусветна вядомае сапрана; у канцэртнай зале "Мінск" сольны канцэрт у суправаджэнні "Нямігі" даў Іосіф Кабзон — ад яго, а не ад аўтара Аляксандра Разэнбаўма, мы ўпершыню пачулі "Вячэрнюю застольную". Тады ж праспяваўшы песню Ігара Лучанка "Памяць сэрца" на тэкст Міхаіла Ясеня, Іосіф Давыдавіч вітаў нашага земляка, паэта-франтавіка.

"Няміга" выконвала і класічныя творы, і сучасную музыку. Дзякуючы выдатным аранжыроўкам — да супрацоўніцтва з аркестрам далучыўся і Браніслаў Сармант, — для калектыва не было твораў, што "не пасавалі" б, музыкантам былі пад сілу якія заўгодна партытуры. Высокі мастацкі ўзровень калектыву неўзабаве быў адзначаны ўзнагародамі конкурсаў і фестываляў пасля выступлення "Нямігі" ў Расіі, Украіне, Літве, Польшчы, Германіі, Іспаніі... Шмат было гастроляў па Беларусі. "Няміга", здаецца, першы наш калектыў, які даў канцэрт пад адкрытым небам у дворыку Нясвіжскага палаца. І на працягу таго ж дня адбыўся другі канцэрт ля вадасховішча надвячоркам, у святле пражэктараў, з узмацняльнікамі — відовішча і "слыховічша" былі незабыўнымі! Аркестрам тады кіраваў выдатны дырыжор Генадзь Праваторaў, выконваліся "Канцэрт у стылі блюз" ("Блакітная рапсодыя") Джорджа Гершвіна з саліруючым фартэпіяна і невядомая нам

Пра "кантэнт" выставы ў дэталях

Кола першае: "ГАЗ М-1"

Восень 1936-га — верасень 1939-га

У сувязі з 30-годдзем творчай дзейнасці Якуба Коласа была прынята пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б "Аб узнагароджанні народнага паэта БССР Якуба Коласа", паводле якой пісьменніку "за выдатныя заслугі ў галіне беларускай мастацкай літаратуры" быў выдадзены аўтамабіль "М-1". Другі атрымаў Янка Купала. На пачатку Другой сусветнай аўтамабілі былі "мабілізаваныя". Вадзіцель "Эмкі" Уладзімір Краўцоў высока цаніўся пісьменнікам: на пахаванне маці кіроўцы Колас асабіста выдзеліў грошы, яго жонка, Марыя Дзмітрыеўна, прысутнічала на жалобнай цырымоніі.

Кола другое: "Шэўрале"

Канец 1939-га — 24 чэрвеня 1941-га

У канцы 1939 года Якуб Колас і Янка Купала замест "М-1", якую, як казаў Купала, "забралі служыць у войска", атрымалі трафейныя аўтамабілі маркі "Шэўрале". На гэтай машыне 24 чэрвеня 1941 года Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч з жонкай і сынамі Данілам і Міхасём, стрыечным дзядзькам пакінуў Мінск. Аўтамабіль потым адаслалі назад у сталіцу БССР. Сын Юрка, які ў гэты час апынуўся ў горадзе, знайшоў "Шэўрале" каля дома з узарваным бакам: хутчэй за ўсё машына пацярпела ў фашысцкай бамбардзіроўцы.

Колы трэцяе і чацвёртае: "Опель-Алімпія", "Опель-Адмірал"

Снежань 1944-га — 1947-ы; 17 ліпеня 1947-га — канец 1954-га

У снежні 1944 года Якуб Колас вяртаецца ў Мінск. Горад ляжаў у руінах. Не вярнуўся з вайны сын Юрый, загінулі блізкія, сябры, паплечнікі. Народнага паэта чакала яшчэ адно выпрабаванне: у ноч з 20 на 21 мая 1945 года ў маскоўскай бальніцы ў Сакольніках не стала "любай кветкі", жонкі Якуба Коласа Марыі Дзмітрыеўны Міцкевіч.

У 1944 годзе народнаму паэту Беларусі, віцэ-прэзідэнту АН БССР выдалі трафейны аўтамабіль "Опель-Алімпія". Вадзіцелем пісьменніка стаў Фёдар Хадасоўскі, які да вайны ездзіў на коласаўскім "Шэўрале". Гэта быў выдатны шафёр і майстар на ўсе рукі: рамантаваў не толькі аўтамабіль, але і гадзіннікі ды іншую дробязь. Быў звольнены ён пасля здарэння, калі машына з Якубам Коласам на пасажырскім сядзенні выляцела ў дрыгву. На яго месца запрасілі спецыяліста з гаража Акадэміі навук Сяргея Сонюшкіна, які, па сутнасці, стаў членам сям'і Міцкевічаў.

Паездкі ж па горадзе ў Коласа былі амаль штодня — сесіі, пасяджэнні, мітынгі. Як дэпутат Вярхоўнага савета БССР Якуб Колас часта выязджаў на сустрэчы з выбаршчыкамі. Асабліва запомнілася яму паездка на Палессе, "дзе зачалася яго дарога ў жыццё". Машына, на якой ехаў Якуб Колас, загрузла ў снезе, і пасажырам прыйшлося ехаць на трох санях: "Быў і надзею страціў, што вярнуся дахаты…" — згадваў пісьменнік.

У 1947 годзе Першы сакратар ЦК КПБ Панцеляймон Панамарэнка падарыў Якубу Коласу "Опель-Адмірал" чорнага колеру, які паэт, у сваю чаргу, пасля перадарыў Уладзіміру Філіповічу, сябру сям'і. Дарэчы, малалітражны "Опель-Алімпія" атрымаў у падарунак ад Коласа кіроўца Сяргей Сонюшкін.

Кола пятае: "ГАЗ М-20" ("Перамога")

1953 — 1956

У 1953 годзе для сям'і быў набыты аўтамабіль "Перамога". У Якуба Коласа не было вадзіцельскага пасведчання, таму за руль ён ніколі не садзіўся. Аўтамабілем часцей карысталася нявестка Якуба Коласа, жонка старэйшага сына Данілы Міцкевіча Зарына і сам Даніла Канстанцінавіч. Зараз аўтамабіль належыць унуку Якуба Коласа — Андрэю Данілавічу Міцкевічу.

Кола шостае: "ЗІМ"

4 красавіка 1955-га — 1956-ы

У 1955 годзе ад Акадэміі навук Якубу Коласу, быў выдадзены службовы аўтамабіль "ЗІМ", раскошны і вельмі рэдкі нават для сталіцы саюзнай рэспублікі. Дарэчы, Якуб Колас быў нязменным віцэ-прэзідэнтам гуманітарнага сектара АН БССР на працягу 28 год.

Канцэртны аркестр "Няміга" і дырыжор Максім Расоха (на пярэднім плане).

Ад эканамістаў ці палітыкаў па ўсім свеце штогод чуеш адно і тое ж: "у нашы цяжкія часы…" Але скажыце: якія часы былі лёгкімі? Хаця б тыдзень? Не, такога не было! Але тут і я пачну звышбанальна: "У наш час, як прынята казаць, нялёгкі, яшчэ 7 красавіка ў канцэртнай зале "Верхні горад" мінчане сталі сведкамі падзеі, якую можна ахарактарызаваць як —

Узноўленае гучанне срэбра

сюіта "Пініі Рыма"… Калі вандрую па Італіі, бачу гэтыя дрэвы, заўсёды згадваю "нямігаўскае" выкананне.

З "вадой" аркестр сябраваў: напрыканцы 1990-х у адзін са сталічных дзён горада аркестр на плыце перад мастом праз Свіслач выконваў сваю праграму ў святле феерверкаў і святочнага салюта. Часта па нядзелях "Няміга" грала на пляцоўцы ў парку Горкага: дзеці бегалі, церліся ля музыкантаў — тыя ў перапынках, ужо на беразе, давалі хлопчыкам "падудзець". Урэшце, ці кожны месяц, ці раз на два калектыў абавязкова даваў канцэрты ў філармоніі: афішы, аншлагі! Складвалася кола прыхільнікаў, яны ведалі: ага, "Няміга", значыць, будзе нешта новае, арыгінальнае, цікавае, — трэба схадзіць!

■ ■ ■

У 1999-м тагачасны дырэктар Яўген Піляеў запрасіў мяне напісаць сцэнарый, падабраць адпаведны рэпертуар і паставіць эстрадны спектакль "Разам з песняй Леаніда Уцёсава". Творчасць карыфея савецкай эстрады была мне вядомая па бацькоўскіх грампласцінках з дзяцінства. І выпадковае супадзенне: наша прэм'ера адбылася 9 сакавіка — дзень у дзень з першым выступленнем славутага джаза "Весёлые ребята", толькі праз 70 гадоў.

Асоба Леаніда Осіпавіча ўнікальная: ніхто не мае права, дый увогуле, ніхто не здолее паўтарыць, замяніць Уцёсава. А таму я вырашыў "разузбуйніць" яго постаць: песні з рэпертуара джаз-аркестра "Весёлые ребята" выконвалі ажно восем вакалістаў — Наталля Гайда, Алена Сало, Алег Мельнікаў, Аляксандр Краснадубскі, Валерый Анісенка, Ігар Смушкевіч, Валерый Майсеенка… Восьмым быў Віктар Вуячыч, яму выпадала спяваць "Спасибо, сердце", "Если любишь, найди", "У Чёрного моря". Ён рэпеціраваў да апошняга дня, а менавіта ў дзень прэм'еры яго прыхапіла хвароба, якая ўжо не адпусціла. Барытонавы рэпертуар падхапіў тэрмінова запрошаны з Масквы Рэнат Ібрагімаў. А пачынаючы з канцэртаў у Магілёве, да нас далучылася спявачка ўцёсаўскага джаза Капіталіна Лазарэнка.

Дырыжыраваў аркестрам у пастаноўцы Пётр Вандзілоўскі. А за раялем сядзеў былы "ўцёсавец" Аркадзь Эскін, на ўсіх мінскіх канцэртах у зале быў кампазітар Генрых Вагнер, які ў маладосці пісаў для Леаніда Осіпавіча светлыя веснавыя песні.

Ганаруся прыдуманым фіналам. Вядучы цытаваў жарт Уцёсава: "Если вам скажут, что я умер, — не верьте: пока я на сцене с оркестром, значит, живой". Далей вядучы паказвае на партрэт: "Вось, ён сёння тут, з намі, і мы чуем голас Маэстра…"

Прыгашвалася святло — і гучаў голас самога Уцёсава, фанаграма: "Что я сделал в своей жизни для людей? Я пел. Вся моя жизнь — это песни".

І пачынаў спяваць пад акампанемент свайго аркестра:

Я счастье знавал и тревогу,
Шагая с друзьями в ряду:
И с песней я начал дорогу,
И с песней по жизни иду…

Пётр Вандзілоўскі і Валерый Анісенка з аркестрам "Няміга".

Кампазітар Генрых Вагнер, які напісаў "Студэнцкі вальс" для джаза Уцёсава.

Удзельнікі эстраднага спектакля "Разам з песняй Леаніда Уцёсава".

"Уцёсавец" Аркадзь Эскін.

І тут да яго спеву далучаліся восем нашых салістаў, у лад з фанаграмай гучаў і аркестр!

Нам с песней цель ясней видна,
С ней легче спорится работа:
Ведь песня людям так нужна,
Как птице крылья для полёта!

Прэм'ера і яшчэ адзін канцэрт адбыліся на сцэне мінскага Тэатра музычнай камедыі, затым чатыры на пляцоўках Магілёва ў рамках фестывалю "Залаты шлягер" і яшчэ два выступленні — па вяртанні адтуль — у вялікай зале Белдзяржфілармоніі. Спрэс — аншлагі!

■ ■ ■

Налета свет адзначаў 100-годдзе з дня нараджэння Дзюка Элінгтана. Адгукнулася і "Няміга". У цемры, пры свечках гурт "Камерата" спяваў пахавальны спірычуэлс. Голас вядучага агалошваў некралог Прэзідэнта ЗША з нагоды скону вялікага джазмэна. Затым у начной кашулі з'яўляўся чорнаскуры хлопчык — Маціта, сынок тагачаснага супрацоўніка амбасады Францыі — і звяртаўся:

— Дарагія татачка і матуля! Я ваш сынок. А калі вырасту, стану знакамітым музыкам, і ўвесь свет будзе захапляцца маёй музыкай і клікаць мяне графам — Дзюкам.

Спачатку граў аркестр пад кіраўніцтвам Вячаслава Міхновіча: гучала папуры з трох "Духоўных канцэртаў" Дзюка. А далей дзея разгортвалася бы ў славутым "Котан-клубе": вядучыя — Зміцер Падбярэзскі і я — сядзелі за накрытым столікам і каментавалі творы, якія ў суправаджэнні аркестра выконваліся Валерыем Шчарыцам, Віталём Ямуцеевым, іншымі выдатнымі інструменталістамі Мінска. Пасля сола яны падыходзілі да нашага століка і, хто не быў за рулём, ахвотна кулялі келіх сапраўднага віна.

У тым жа 2000-м споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння Ісака Дунаеўскага. І гэта дата была адзначана "Нямігай". Актрыса Алена Адзінцова выконвала ролі жанчын у жыцці кампазітара: жонку, каханку Зою Пашкову — маці яго сына Максіма, — кінаактрысу Лідзію Смірнову, спявачку Клаўдзію Шульжэнка, шматлікіх прыхільніц — усё на падставе дакументаў: ліставання.

■ ■ ■

Але затым аркестр "Няміга" бы знік: ні прэсы, ні гучных гастроляў, ні пастановак, ні разрэкламаваных канцэртаў на сталічных пляцоўках. Жывучы ў свеце мастацтва, я за гэты час усяго тры разы бачыў і чуў "Нямігу": гадоў пяць таму на адкрыцці "Лістапада" і год таму на юбілеі Пятра Вандзілоўскага. Гралі добра, выглядалі адметна, але абодва выступленні — усяго з адным нумарам. І вось у мінулым жніўні на адкрытай пляцоўцы ў мінскім Верхнім горадзе публіка, шпацыруючы, слухала "Нямігу", яе "падаваў" абаяльны і з гумарам вядучы. Па лексіцы было зразумела, што ён не балбатун-канферансье, а дасведчаны ў музыцы чалавек. Падышоўшы бліжэй, я пазнаў Максіма Мікалаевіча.

І вось пагалоска: калектыў узначаліў новы кіраўнік. Хто? Максім Расоха. Ён мінчанін, скончыў нашу Акадэмію музыкі як габаіст і дырыжор, стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта краіны па падтрымцы таленавітай моладзі, лаўрэат міжнародных конкурсаў і фестываляў. За стварэнне ў сваім перакладзе праграм "Старадаўняя беларуская музыка XVIII — XIX стагоддзяў" і "Музыка Яўгена Глебава" атрымаў дзяржаўную стыпендыю.

Максіма Расоху, прызнацца, я ўжо ведаў як выкладчыка камернага гурта дзіцячай музычнай школы № 10 імя таго ж Глебава. А ў пазамінулым годзе Беларускае радыё зрабіла запіс перадачы, прысвечанай музыканту, які існаваў бы ў цені славутага трубача Эдзі Рознэра, — музычнаму кіраўніку Дзяржаўнага джаз-аркестра БССР Юрыю (Ежы) Бяльзацкаму. Творы амаль забытага кампазітара, напісаныя для розных складаў, Расоха вытанчана, па-мастацку пераклаў для актэта драўляных інструментаў "Рыўера", якім сам і кіраваў. Ён захоплена корпаецца ў архівах і бібліятэках у пошуку нот малавядомых ці ўвогуле забытых беларускіх музыкантаў. Высветліў я, што ў Расохі яшчэ ёсць калектыў — "Мінск-класік": 13 музыкантаў, якія гралі і Шастаковіча, і абодвух Штраўсаў, і Глебава, і Кальмана, і нешта падобнае да джазу. Карацей, не дзіва, што неўтаймаванаму, з "гарачым вокам", музычнаму лідару нехта разумны і прадбачлівы з "Мінскканцэрта" прапанаваў ачоліць "Нямігу*". Ад такіх прапаноў не адмаўляюцца.

І вось 7-га красавіка 2016-га ў канцэртнай зале "Верхні горад" мінчане ўбачылі Максіма з дырыжорскай палачкай перад вялікім — пад чатыры дзясяткі "дудак"! — аркестрам духавых інструментаў "Няміга". Срэбра загучала на прэстыжнай пляцоўцы беларускай сталіцы!

■ ■ ■

— Што ў праграмме? — запытаўся я, атрымаўшы запрашэнне.

— Лепшае, што назбіраў у рэпертуары, — пачуў у адказ. — Каб людзі не казалі скептычна: "А-а, духавы аркестр — маршы, дудкі". Каб прыгадалі, што ёсць такі калектыў, каб пасля раілі іншым: "Схадзіце абавязкова на канцэрт "Нямігі"!

Я асабіста — раю. Рэпертуар і сапраўды на які заўгодна густ: Глен Мілер, бацька і сын Штраўсы, Яўген Глебаў, Валерый Гаўрылін, Аляксандр Журбін, Ежы Бяльзацкі, а між гэтымі творамі найсучасныя фантазіі на тэмы песень Фрэнка Сінатры (аўтарства Джэры Новака), мюзікла "Вэстсайдская гісторыя" (Леанард Бэрнстайн), песень гурта "АББА" (Рон Сэбрэгт).

У аркестра бліскуча надраенныя "сярэбраныя" інструменты, элегантныя строі. Гралі адметна, асабліва ў п'есе Генадзя Пучкова "Парад салістаў", калі кожная група — трубы, валторны, саксафоны, трамбоны, драўляныя, ударныя — імкнулася перасягнуць іншую ў майстэрстве і віртуознасці. Хочацца адзначыць і дырыжора Максіма Мікалаевіча, які сам і вёў канцэрт: тактоўнасць, гумар, самаіронія, уменне размаўляць з залай і, канешне, абаяльнасць, але гэта ўжо ад прыроды.

Чамусьці не бачыў на гэтым свяце адраджэння калектыва музыказнаўцаў. Ды невялікая зала і малая сцэна, якой дастаткова для салістаў ці ансамбляў не больш чым у паўтара дзясяткі выканаўцаў, была цеснай для вялікага калектыву. Доўгія ж апладысменты, якіх "Няміга", пэўна, даўно не чула, былі ўзнагародай музыкантам за іх працу.

"Нямізе" трэба высоўвацца з ценю, "у нашы цяжкія часы" адраджаць гучанне срэбра. Лічу, што калектыву самая пара вярнуцца да вялікіх пастановачных праграм з акрэсленай тэматыкай. Ёсць бліскучыя музыканты, таленавіты кіраўнік, шмат добрай музыкі, якой прагне чулы душой слухач. Узмах Максіма Расохі дырыжорскай палачкай — і…

Уладзімір АРЛОЎ,
кінарэжысёр

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:

■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.".
(У рамках экспазіцыі дзейнічае выстава **"Вялікая Айчынная вайна ў мастацтве"**, прысвечаная 70-годдзю Вялікай Перамогі.)
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.".
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.".
■ Рээкспазіцыя залы беларускага мастацтва 1940 — 1980-х гадоў **"Вайна і Перамога ў творчасці мастакоў XX стагоддзя"**.

Выставы:

■ Выстава **"Сучасная Беларусь вачыма мастакоў"** (творы мастакоў розных пакаленняў, розных творчых памкненняў і кірункаў) — да 11 ліпеня.
■ Выстава **"Школа класікаў. Беларускае і рускае мастацтва XIX–XX стагоддзяў"** (больш за 80 твораў жывапісу і графікі) — да 7 жніўня.
■ Выстава **"Рэпліка прыгожага"** (злепкі скульптуры, створаныя ў майстэрні-атэльле Луўра) — да 1 верасня. У рамках выставы праводзіцца серыя лекцый, якія будуць чытацца на працягу ўсяго лета, кожную сераду а 17-й гадзіне.
■ Выстава Людмілы Кальмаевай **"Сфера чалавечага"** (прадстаўлены графічныя творы і жывапісныя палотны з калекцыі аўтара і Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў) — да 25 ліпеня.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".
■ "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".
■ "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".
■ Выстава **"Жыццё і творчасць Мельхіёра Ваньковіча"** — да 30 жніўня.
■ Выстава літаграфій **"Памятныя мясціны Беларусі ў творчасці Напалеона Орды"** з фондаў музея — да 30 жніўня.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Давыд-гарадоцкі роспіс"** з прыватнага збору А.М. Арлова, аднаго з першых даследчыкаў феномену "цікетак" — да 4 верасня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 226 09 22.

Экспазіцыі:

■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ "Мастацтва ў гарадской культуры. XIX — XX стст.".

Выставы:

■ Інавацыйны выставачны праект 3D карцін **"Ілюзорыум"** — да 3 ліпеня.
■ Выстава **"ЭКСПІРЫмЕНТуС"** — экспазіцыя незвычайных прыбораў і прылад — да 3 ліпеня.
■ Выстава фотамастачкі Марыны Бацюковай **"Сула. Непарыўнае"** — да 11 верасня (у дворыку музея).
■ Персанальная выстава шведскай мастачкі Людмілы Хрысцесевай **"Sustainidentity"** — да 3 ліпеня.
■ Выставачны праект **"Ад рымскага дынарыя да беларускага рубля"** (экспазіцыя пакажа, як змянялася грашовае абарачэнне ў Беларусі на працягу амаль дзвюх тысяч год) — з 29 чэрвеня.

Філіялы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

Экспазіцыі:

■ "Мінск губернскі ў канцы XIX — на пачатку XX стст.".
■ "І З'езд РСДРП у асобах".
■ "Жандарскі вышук у царскай Расіі".
■ "Гісторыя Дома-музея І З'езду РСДРП".
■ Інтэрактыўная выстава **"Вар'яцкая лабараторыя"** — да 3 ліпеня.
■ Выстава **"Свет савецкіх салдацікаў"**.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 12.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь"**.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.

Экспазіцыі:

■ "Геалогія і палеанталогія".
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
■ Выстава твораў Алісы Папунідзі **"Чароўныя сны Алісы"** — да 28 чэрвеня.

г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон"). Тэл.: +37529 123 60 53.

■ Выстава **"Лукамор'е"** — да 1 ліпеня.
■ Выстава **"Экзатычныя жывёлы свету"** — да 5 верасня.
■ Незвычайны атракцыён **"Стужкавы лабірынт"** — да 31 снежня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".
■ "Беларуская музычная культура XX ст.".
■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст."
■ Выстава аўтарскай лялькі Валерыі Гайшун **"Persona grata"** — да 29 ліпеня.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА

г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.

■ Пастаянная экспазіцыя.

Майстар-класы:

■ **Дэкупаж** для творчых дзяцей і падлеткаў ад 5 да 14 гадоў — кожную суботу аб 11-й.

Выстава:

■ Выстава **"Аўтамабіль на далоні"**.
■ Выстава **"Мастацтва папяровай выразкі"** — да 3 ліпеня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО

г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.

Экспазіцыя:

■ "Беларускі кінематограф як нацыянальная каштоўнасць".
■ Выстава **"Старыя героі — новы свет. Героі беларускіх казак, міфаў і легенд"** — з 1 ліпеня да 28 жніўня.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.
Музей працуе:
пн. — выхадны,
аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й,
сер. — ад 12-й да 20-й.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Сляды вайны..."** (збор прадметаў ваеннага абмундзіравання і амуніцыі з фондавых калекцый музея і ўзоры рарытэтнай тэхнікі з унікальнай калекцыі Аляксея Цікунова) — да 18 ліпеня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02;
+ 37529 551 80 51,
+37529 190 31 49.

Палацавы ансамбль

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Археалагічныя знаходкі палаца вялікіх князёў літоўскіх. Штодзённасць Віленскага двара"** з фондаў Музея-палаца вялікіх князёў літоўскіх (Вільня) — да 11 верасня.
■ Выстава **"Час. Рэчы. Прасы"** — да 18 верасня.

Сектар экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці

■ Выстава **"Падарожжа"** — да 4 жніўня.

Слуцкая брама

■ Інсталяцыя **"Застыўшыя хвіліны цішыні"** — да 30 верасня.

Ратуша

■ Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91,
(8–01596) 2 82 70.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Уецца веер акрылены"** — да 5 верасня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыі:

■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.
■ Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.
■ Стацыянарная выстава **"У хвалях няспыннага руху: аўтамабільнымі шляхамі Коласа"**.
■ У дні летніх канікул музей запрашае на праграму культурна-адукацыйных мерапрыемстваў **"Канікулы ў Доме Коласа"** (па папярэднім запісе).
■ Пешая экскурсія **"Мясцінамі Коласа ў Мінску"** (праводзіцца па заяўках; маршруты могуць змяняцца ў адпаведнасці з пажаданнямі экскурсантаў).

Акцыі:

■ **"Самы лепшы дзень"** (дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).
■ Музейная творчая майстэрня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыі:

■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.

Акцыі:

■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:

■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва".**
■ Выстава **"Горад, які мы не бачылі. Мінск на малюнках 1940-1950-х"** (прадстаўлена больш за 50 работ выбітных дойлідаў, якія сфармавалі вобраз сучаснага Мінска) — з 30 чэрвеня да 11 верасня.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой".** Прысвечана Герою Беларусі, народнаму мастаку СССР і Беларусі, Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
■ Рэканструкцыя інтэр'ераў былога сядзібнага дома **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт".**

Выставы:

■ Выстава **"9. Трыенале Польскай Графікі"** — да 30 чэрвеня.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**
■ **"Мінск сярод сяброў. Гарады-пабрацімы сталіцы Беларусі".**

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Нараджэнне гуказапісу"** — да 9 ліпеня.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыя:

■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.
■ Выстава **"Мастацкія палотны "Мінскае палатно-Пакроў"** (мастацкія палотны, ручнікі, швейныя машыны).

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж" (пастаянная экспазіцыя па гісторыі гужавога транспарту жыхароў Мінска XIX — пачатку XX стст.).
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

АРХЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6. Тэл.: 321 24 30.

■ Выставачна-адукацыйны праект **"Па слядах мамонтаў"** — да 30 верасня.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4.
Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Экспазіцыі:

■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
■ **"Чырвоная гасцёўня".**
■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў".**
■ **"Адкрытае захаванне археалагічнай калекцыі музея".**
■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).
■ **"Жылы інтэр'ер канца XIX — пачатку XX стст.".**
■ Адкрытае захоўванне археалагічнай калекцыі музея.
■ **"Свет прыроды"** (выставы "Загадкавыя фантазіі мора" і "Жывёльны свет Гомельшчыны") (грот палаца).

Выставы:

■ Інтэрактыўная выстава **"Усё жыццё ў адным ровары"** — да 26 чэрвеня.
■ Выстава жывапісных работ Вольгі Капачовай **"Гарадская архітэктура"** — да 7 ліпеня.
■ Выстава **"Скрыня Пандоры. Фантастычны свет Сяргея Парцянкова"** — да 17 ліпеня.
■ Выстава **"Ад класікі да фэнтазі"** — да 31 ліпеня.
■ Выстава **"Паралельны свет, або Міфы пра дамавікоў і лесавікоў"** — да 31 ліпеня.

Вежа палаца

Экспазіцыя:

■ **"Уладальнікі Гомельскага палаца Румянцавы і Паскевічы"**.

Выстава:

■ **"Родны край, навек любімы"** — мастацка-адукацыйны праект, прысвечаны творчасці гомельскіх мастакоў (з фондаў музея), — да 31 ліпеня.

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:

■ **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.

Выстава:

■ Выстава **экзатычных жывёл**.

Зімовы сад

■ **"Свет субтрапічных раслін і жывёл".**

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 57 41.

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстава тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.
■ Выстава **"Па праве Памяці"**, прысвечаная Чырвонай арміі, з фондаў музея.
■ Выстава **"Зброя для моцных духам".**

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.

■ Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.
■ **"Сучаснае мастацтва краю"** (жывапіс, графіка, скульптура, мастацкае шкло).

Выставы:

■ Выстава **"Майстэрня заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, сябра Саюза мастакоў Беларусі Уладзіміра Мурахвера".**
■ **"Вядзём пачатак мы ад Гедыміна..."**.
■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
■ Выстава з прыватнага збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
■ Выстава **"Вайны свяшчэнныя старонкі".**
■ Выстава **"Надзейны шчыт краіны".**
■ Выстава **"Падарожжа ў гарадскі і сельскі побыт"**.

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.

■ Выстава **"Беларусь вачыма рускіх мастакоў"** (работы пецярбургскіх жывапісцаў) — з 28 да 30 чэрвеня.

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс: 290 60 10.

■ Выстава інтэрактыўных сюжэтаў — **3D карцін** — да 28 чэрвеня.
■ Выстава графічнага дызайну **"Ідэя!"** (прадстаўлена плакатная акцыя "Чарнобыль — 30, Фукусіма — 5" Маскоўскай міжнароднай біенале графічнага дызайну "Залатая пчала — 12") — да 3 ліпеня.

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1.
Тэл./факс: 334 11 56.

■ **25 — "Бахчысарайскі фантан"** (балет у 2-х дзеях, прэм'ера абноўленай пастаноўкі) Б.Асаф'ева.
■ **28 — "Каханне і Смерць"** (балет у 2-х дзеях) П.Бюльбюль-аглы.
■ **28 — "Музычная мазаіка"** (Камерная зала імя Л.П. Александроўскай). Пачатак у 19.30.

Да 26 чэрвеня ў Нясвіжы — спектаклі і канцэрты ў рамках штогадовага фестывалю **"Вечары Вялікага тэатра ў замку Радзівілаў".**

■ **25 —** канцэрт **"Сэрца, табе не хочацца спакою"** з удзелам вядучых салістаў оперы і струннага квінтэта "Серэнада" (тэатральная зала ў замку Радзівілаў. Пачатак у 13.00).
■ **25 — "Іяланта"** (опера ў 2-х дзеях) П.Чайкоўскага (унутраны двор замка Радзівілаў. Пачатак у 20.00).
■ **26 —** тэатралізаваны канцэрт **"Тэнары супраць басоў"** (тэатральная зала ў замку Радзівілаў. Пачатак у 13.00).
■ **26 —** канцэрт **"Зоркі Вялікага ў Нясвіжы"** з удзелам вядучых салістаў оперы і балета (унутраны двор замка Радзівілаў. Пачатак у 19.00).

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.
Тэл./факс: 334 60 08.

■ **27 — "Тры Жызэлі"** (драма) А.Курэйчыка.
■ **28 — "Чарнобыльская малітва"** (сумесны франка-беларускі праект) С.Алексіевіч.
■ **29 — "Нязваны госць"** (сямейная меладрама) С.Бартохавай.
■ **30 — "Партрэт"** (трагіфарс) С.Навуменка. Прэм'ера.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44.
Тэл.: 200 81 26.

■ **27 — "Блакітная камея"** (мюзікл у 2-х дзеях) К.Брэйтбурга.
■ **28 — "Таемны шлюб. Граф Люксембург"** (аперэта) Ф.Легара.
■ **29 — "Вясельны базар" ("Аршын мал алан"**, камедыя ў 2-х дзеях) У.Гаджыбекава.
■ **30 — "Шклянка вады"** (мюзікл у 2-х дзеях) У.Кандрусевіча.
■ **1 ліпеня — "Сільва"** (аперэта ў 2-х дзеях) І.Кальмана.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.

■ **25 — "Брэменскія музыкі"** (спектакль для дзяцей ад 5 год) В.Ліванава і Ю.Энціна. Пачатак аб 11-й.